

# КАЛЯНДАР

## ЗНАМЯНАЛЬНЫХ
## І ПАМЯТНЫХ ДАТ
## НА 2025 ГОД

2024

ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»
Аддзел краязнаўства

# Каляндар знамянальных і памятных дат на 2025 год

Віцебск, 2024

**ББК 92.5**

**К 17**

Складальнікі: Л. І. Рагачова, В. А. Дарафеева

Рэдактар: Л. І. Рагачова

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

**Каляндар** знамянальных і памятных дат на 2025 год / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўства ; склад. Л. І. Рагачова, В. А. Дарафеева. – Віцебск, 2024. – 138 с. : іл.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2024

**КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ**
**НА 2025 ГОД**

2024 г.

Складальнікі: Рагачова Ларыса Іванаўна, Дарафеева Вольга Аляксееўна
Рэдактар Л. І. Рагачова
Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай
Дызайн вокладкі А. П. Міклушова
Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601, Віцебск, Леніна, 8–а
E–mail: kray@mail.vlib.by

## ПРАДМОВА

У «Каляндар» уключаны знамянальныя і памятныя даты, якія адлюстроўваюць важныя падзеі гісторыі, палітычнага, гаспадарчага, культурнага жыцця Віцебскай вобласці, а таксама юбілейныя даты выдатных землякоў і людзей, якія па месцы нараджэння не з'яўляюцца ўраджэнцамі вобласці, але пакінулі значны след у гісторыі і культуры нашага рэгіёна.

Дапаможнік адкрываецца храналагічным пералікам знамянальных і памятных дат, якія прадстаўлены па новым стылі.

«Каляндар» састаўлены на аснове даных з энцыклапедый, даведачных, перыядычных выданняў, якія знаходзяцца ў фондзе Віцебскай абласной бібліятэкі.

Наш «Каляндар» дапаможа краязнаўцам, бібліятэчным работнікам, выкладчыкам і іншым спецыялістам у вывучэнні і распаўсюджванні краязнаўчых ведаў.

У 2025 ГОДЗЕ СПАЎНЯЕЦЦА:

**1065 гадоў** таму (960) нарадзілася Рагнеда Рагвалодаўна (Гарыслава, духоўнае імя Анастасія; 960 ці 966?–1000), полацкая князёўна, асветніца.

**960 гадоў** таму (1065) упершыню ўзгадваецца Браслаў як горад у Полацкім княстве ў летапісе Быхаўца і хронікі Стрыйкоўскага.

**960 гадоў** таму (1065) нарадзіўся Міна Полацкі (не пазней 1065–1116), беларускі святы, полацкі епіскап, адзін з першых архіпастыраў, які спрыяў распаўсюджванню хрысціянства на Беларусі.

**915 гадоў** таму (1110) нарадзілася Звеніслава Барысаўна (у манастве Еўпраксія; пасля 1110–1202), князёўна, асветніца, першая на Беларусі жанчына-пісьменніца, стрыечная сястра і паплечніца Еўфрасінні Полацкай.

**895 гадоў** таму (1130) пабудавана царква ў гонар Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы (Дабравешчанская царква) у г. Віцебску (1120–1130-я), помнік старажытнарускай архітэктуры, у традыцыях полацкай школы дойлідства на левым беразе р. Зах. Дзвіна, на тэрыторыі Ніжняга замка. У 1961 г. – узарвана. Адноўлена ў 1998 г. у абліччы 12 ст. з захаваннем фрагментаў арыгінальнай муроўкі.

**885 гадоў** таму (1140) нарадзіўся Давыд Расціславіч (1140–1197), князь наўгародскі, таржоцкі, віцебскі, вышгарадскі, смаленскі. У Віцебску княжыў у 1165–1667 гг.

**830 гадоў** таму (1195) адбылася Віцебская бітва, бітва аб'яднаных войск полацкіх князёў і чарнігаўскага князя Алега Святаславіча са смаленскім войскам на чале з Мсціслаўскім князем Мсціславам Раманавічам у ходзе вайны за валоданне Віцебскам.

**825 гадоў** таму (1200) нарадзіўся Святаслаў Мсціслававіч (у хрышчэнні Сімяон; 1 пал. 13 ст.) князь наўгародскі (1218–1219), полацкі (1222–1232), смаленскі (1232–1339).

**805 гадоў** таму (1220) нарадзіўся Сімяон Полацкі (1220-я?–1289), царкоўны дзеяч, епіскап Полацкі і Цвярскі, святы Беларускай і Рускай Праваслаўных Цэркваў.



ураджэнцы Віцебшчыны ў далёкім і блізкім замежжы / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2012. – С. 62.

5. **Верхаловіч** Павел Міхайлавіч // Нашы землякі ў далёкім і блізкім замежжы : біяграфічны даведнік / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка. – Віцебск : Витебская областная типография, 2007. – С. 37–38.

6. **Верхаловіч** Павел Міхайлавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2003. – Т. 6. – Кн. 2 : Усвея–Яшын. – С. 355.

7. **Верхаловіч** Павел Міхайлавіч // Беларуская Энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1997. – Т. 4 : Варанецкі–Гальфстрым. – С. 108.

Пасля вайны, у 1948 годзе, ён скончыў акадэмію Генштаба, і застаўся ў ёй на выкладчыцкай рабоце.

Памёр Павел Міхайлавіч Верхаловіч 28 кастрычніка 1952 года, пахаваны на Увядзенскіх могілках у Маскве.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Багдана Хмяльніцкага I ступені, ордэнам Суворава II ступені, ордэнам Кутузава II ступені, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, а таксама балгарскім ордэнам «Святы Аляксандр» IV ступені, медалямі.

За час вайны генерал Верхаловіч быў два разы адзначаны ў Загадах (Падзяках) Вярхоўнага Галоўнакамандуючага за авалоданне гарадамі Залаэгерсег і Кестель, прарыў сумесна з войскамі балгарскай арміі абароны праціўніка на поўдзень ад возера Балатон і авалоданне горадам Надзьбай – моцным апорным пунктам абароны немцаў, і другая падзяка за авалоданне цэнтрам нафтавай прамысловасці Венгрыі горадам Надьканіжа – важным вузлом дарог і моцным апорным пунктам абароны немцаў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Верхаловіч** Павел Міхайлавіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1971. – Т. III : Веды–Графік. – С. 41–42.

2. **Верхолович** Павел Михайлович // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси / склад.: В. Ц. Осіпаў [і інш.] ; рэдкал.: А. В. Праляскоўскі, Л. У. Языковіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – С. 241–242.

3. **Верхолович** Павел Михайлович // Долготович, Б. Д. Военачальники земли белорусской : энциклопедический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск : БелЭн, 2005. – С. 123.

4. **Верхаловіч** Павел Міхайлавіч // Імёны, асобы, лёсы:



**750 гадоў** таму (1275) нарадзіўся Гедымін ( Гедзімін; каля 1275–1341), вялікі князь ВКЛ. У час яго княжання асабліва важнае значэнне ў дзяржаве зноў набыла Полацкая зямля.

**700 гадоў** таму (1325) нарадзіўся Андрэй Полацкі (Андрэй Альгердавіч; 1325–1399), князь полацкі, пскоўскі і трубчэўскі.

**655 гадоў** таму (1370) нарадзіўся Свідрыгайла (у праваслаўі Леў, у каталіцтве Баляслаў; каля 1370–1452), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ. Атрымаў ад Ягайлы ва ўдзел Віцебскае княства і да 1393 г. княжыў у Віцебску.

**645 гадоў** таму (1380) віцебскія землі ўвайшлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага.

**645 гадоў** таму (1380) нарадзіўся Корсак Васіль Дзмітрыевіч (каля 1380–1452), намеснік полацкі пры князі Свідрыгайле, затым у яго радзе, калі той быў валынскім князем.

**640 гадоў** таму (1385) узгадваецца в. Абольцы на рацэ Абалянка ў Талачынскім раёне як уладанне вялікага князя ВКЛ Ягайлы, які заснаваў у Абольцах касцёл.

**595 гадоў** таму (1430) нарадзіўся Хадкевіч Іван (Івашка; каля 1430–1484) з магнацкага роду Хадкевічаў у ВКЛ, намеснік віцебскі.

**575 гадоў** таму (1450) нарадзіўся Сапега Іван Сямёнавіч (другі сын Сямёна; каля 1450–1517), заснавальнік кодзенскай лініі найбуйнейшага магнацкага роду герба «Ліс» у ВКЛ, намеснік віцебскі, ваявода віцебскі. У 1504 г. заснаваў мястэчка Іказнь і ў ім замак.

**575 гадоў** таму (1450) нарадзіўся Сапега Багдан Сямёнавіч (старэйшы сын Сямёна; да 1450–пасля 1512), заснавальнік чарэйска-ружанскай лініі найбуйнейшага магнацкага роду герба «Ліс» у ВКЛ.

**565 гадоў** таму (1460) нарадзіўся Астрожскі Канстанцін Іванавіч (1460–1530), военачальнік, дзяржаўны дзеяч ВКЛ. У Аршанскай бітве 1514 г. кіраваў войскамі ВКЛ, якія перамаглі маскоўскія войскі.

**565 гадоў** таму (1460) у «Літоўскай метрыцы» ўпершыню ўпамінаецца паселішча Бачэйкава. Зараз – вёска ў Бешанковіцкім раёне.

**545 гадоў** таму (1480) нарадзіўся Радзівіл Юрый (мянушкі Віктар, Пераможца, Літоўскі Геркулес; каля 1480–1541), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ. У Аршанскай бітве 1514 г. камандаваў лёгкай конніцай на левым флангу.

**545 гадоў** таму (1480) нарадзіўся Сапега Іван Багданавіч (сын Багдана Сямёнавіча; каля 1480–1546), пісар панскі з найбуйнейшага магнацкага роду герба «Ліс» у ВКЛ, маршалак гаспадарскі, ваявода віцебскі і падляшскі.

**535 гадоў** таму (1490) нарадзіўся Скарына Францыск (каля 1490–каля 1551), беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, мысліцель-асветнік, гуманіст, навуковец, пісьменнік, грамадскі дзеяч, мастак-графік, медык, батанік, астраном.

**535 гадоў** таму (1490) нарадзіўся Сапега Павел Іванавіч (сын Івана Сямёнавіча; каля 1490–1579), маршалак гаспадарскі з найбуйнейшага магнацкага роду герба «Ліс» у ВКЛ, дзяржаўца браслаўскі, ваявода падляшскі і наваградскі.

**530 гадоў** таму (1495) упершыню ўзгадваецца в. Сарочына Ушацкага раёна як маёнтак у ВКЛ, уладанне княгіні Івановай-Тучынай.

**525 гадоў** таму (1500) упершыню ўзгадваецца в. Опса на ўсходнім беразе воз. Опса ў Браслаўскім раёне як уладанні смаленскага князя Глазыні ў складзе ВКЛ. Зараз –аграгарадок Опса.

**505 гадоў** таму (1520) пабудаваны касцёл бернардзінцаў у в. Астроўна Бешанковіцкага раёна, які пазней быў рэканструяваны ў праваслаўную царкву.

**505 гадоў** таму (1520) нарадзіўся Валовіч Астафій Багданавіч (каля 1520–1587), дзяржаўны дзеяч ВКЛ. Падчас Лівонскай вайны 1558–1583 гг. камандаваў харугвай пры аблозе і ўзяцці Полацка ў 1579 г., у 1580 г. са сваім атрадам узяў Усвяты.

**505 гадоў** таму (1520) нарадзіўся Корсак Баркулаб (каля 1520–1576), староста свіслацкі і дзісненскі са старажытнага беларускага роду, уладальнік маёнткаў у Аршанскім павеце, дзе заснаваў мястэчка Баркулабава. Зараз – в. Баркалабава Быхаўскага раёна.



вучылішча імя М. В. Фрунзэ), быў памочнікам камандзіра роты, камандзірам роты, памочнікам камандзіра батальёна 8-га, 47-га, 48-га стралковых палкоў 16-й стралковай дывізіі.

Са студзеня 1935 года, пасля заканчэння Ваеннай акадэміі імя М. В. Фрунзэ Павел Міхайлавіч Верхаловіч – начальнік штаба 1-га Туркестанскага горнастралковага палка, затым 29-га стралковага палка. 29 студзеня 1936 года яму было прысвоена воінскае званне «маёр». А ў чэрвені 1936 года П. М. Верхаловіч прызначаны памочнікам начальніка штаба 10-й стралковай дывізіі.

У лютым 1939 года новае назначэнне – памочнікам начальніка штаба 104-й стралковых дывізіі, а са жніўня 1939 года – начальнікам штаба 49-й стралковых дывізіі, якая складзе 13-й арміі ўдзельнічала ў савецка-фінляндскай вайне. 29 кастрычніка 1939 года яму прысвоена воінскае званне «палкоўнік». 7 красавіка 1940 года «за ўзорнае выкананне баявых заданняў Камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць» палкоўнік П. М. Верхаловіч узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З мая 1940 года ўжо як начальнік штаба 35-га стралковага корпуса ён удзельнічаў у вызваленчым паходзе ў Бесарабію. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны яго корпус у складзе 9-й асобнай арміі Паўднёвага фронту ўдзельнічаў у прыгранічных баях у Малдавіі, у абарончых баях па ўсходнім беразе рэк Прут, Днестр, Паўднёвы Буг.

Са жніўня 1941 года па красавік 1943 года П. М. Верхаловіч быў начальнікам штаба 49-й, 24-й (4-й гвардзейскай) армій. 27 студзеня 1943 года яму прысвоена воінскае званне «генерал-маёр». З сакавіка 1944 года і да канца вайны ён начальнік штаба 57-й арміі. Павел Міхайлавіч Верхаловіч удзельнічаў у абароне Масквы, у Сталінградскай бітве, Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, вызваленні Балгарыі, Югаславіі, Румыніі, Венгрыі. Ваяваў на Заходнім, Данскім, Сцяпным, Варонежскім і 2-м Украінскім франтах. 1 ліпеня 1945 года П. М. Верхаловічу прысвоена воінскае званне «генерал-лейтэнант».

# Снежань



**ВЕРХАЛОВІЧ**

**ПАВЕЛ МІХАЙЛАВІЧ**

*125 год з дня нараджэння*

*(1900)*

**Верхаловіч Павел Міхайлавіч** (1900–1952) – савецкі военачальнік, генерал-лейтэнант, кандыдат ваенных навук.

Нарадзіўся 15 (28) снежня 1900 года ў мястэчку Шаркаўшчына Дзісенскага павета Віленскай губерні (зараз г. п. Шаркаўшчына Віцебскай вобласці) у сялянскай сям'і.

Павел Міхайлавіч Верхаловіч удзельнік грамадзянскай вайны. У Рабоча-сялянскую Чырвоную армію ўступіў у 1919 годзе. З лістапада 1919 года быў перапісчыкам 2-га запаснога палка. З ліпеня 1920 года, пасля заканчэння Тамбоўскіх пяхотных камандных курсаў, прызначаны памочнікам камандзіра роты 464-го стралковага палка. З верасня 1920 года П. М. Верхаловіч – камандзір роты 15-га запаснога стралковага палка. З лістапада 1920 года – камандзір узвода 143-га стралковага палка, у далейшым – памочнік начальніка каманды. З ліпеня 1921 года камандзір узвода кадравага навучальнага палка.

З верасня 1923 года па 1935 год, пасля заканчэння Кіеўскай аб'яднанай школы камандзіраў РСЧА імя С. С. Каменева (пазней, Кіеўскае вышэйшае агульнавайсковае каманднае двойчы Чырванасцяжнае



**500 гадоў** таму (1525) нарадзіўся Сапега Мікалай Паўлавіч (сын Паўла Іванавіча; каля 1525–1599), маршалак гаспадарскі з найбуйнейшага магнацкага роду герба «Ліс» у ВКЛ, ваявода мінскі, брэсцкі і віцебскі. Удзельнічаў у пераможнай Ульскай бітве 1564 г.

**495 гадоў** таму (1530) нарадзіўся Цяпінскі Васіль Мікалаевіч (сапр. Амельяновіч-Цяпінскі; 1530-я ці пач. 1540-х–1599 ці 1600), беларускі пісьменнік, гуманіст-асветнік, кнігавыдавец, ураджэнец м. Цяпіна Полацкага ваяводства (зараз – в. Цяпіна Чашніцкага раёна).

**495 гадоў** таму (1530) нарадзіўся Кміта-Чарнабыльскі Філон Сямёнавіч (каля 1530–1587), ваенны і грамадскі дзеяч ВКЛ, аршанскі староста, аўтар эпісталярных твораў, якія з'яўляюцца помнікамі старажытнабеларускай літаратуры.

**485 гадоў** таму (1540) нарадзіўся Корсак Іосіф (каля 1540–1618), уладальнік Залесся і Лятоўшчыны, полацкі войскі і суддзя земскі са старажытнага беларускага роду, кашталян менскі, кашталян полацкі.

**480 гадоў** таму (1545) упершыню ўзгадваецца в. Сітцы Докшыцкага раёна ў складзе ВКЛ.

**475 гадоў** таму (1550) упершыню ўзгадваецца в. Камаі ў Пастаўскім раёне як мястэчка.

**465 гадоў** таму (1560) нарадзіўся Рысінскі Саламон Фёдаравіч (каля 1560–1625), філосаф, паэт, педагог, парэміёлаг, вучоны-фальклярыст, этнограф, ураджэнец м. Рысін Полацкага ваяводства (зараз – Себежскі раён Пскоўскай вобласці).

**465 гадоў** таму (1560) нарадзіўся Корсак Ян Рыгоравіч (каля 1560–1625), полацкі харужы са старажытнага беларускага роду, гараднічы полацкі, кашталян полацкі, у апошнія гады жыцця ваявода смаленскі.

**465 гадоў** таму (1560) нарадзіўся Сапега Андрэй Паўлавіч (каля 1560–1621; сын Паўла Іванавіча), падчашы з найбуйнейшага магнацкага роду герба «Ліс» у ВКЛ, каштэлян мінскі, ваявода полацкі і смаленскі.

**460 гадоў** таму (1565) нарадзіўся Сапега Андрэй Іванавіч (каля 1565–1611; малодшы брат канцлера Л. І. Сапегі), староста аршанскі з найбуйнейшага магнацкага роду герба «Ліс» у ВКЛ, кашталян віцебскі, ваявода мсціслаўскі.

**455 гадоў** таму (1570) нарадзіўся Корсак Іосіф Львовіч (каля 1570–1643), мсціслаўскі староста і ваявода са старажытнага беларускага роду, заснавальнік базыльянскага манастыра ў Беразвеччы і кармеліцкага ў Глыбокім.

**445 гадоў** таму (1580) заснаваны Полацкі езуіцкі калегіум (з 1812 г. – акадэмія).

**445 гадоў** таму (1580) нарадзіўся Кунцэвіч Іасафат (свецкае імя Іван; 1580–1623), уніяцкі царкоўны дзеяч, публіцыст, архіепіскап полацкі (1618–1623 гг.). Змушаў да ўніяцтва, за што падчас Віцебскага паўстання быў забіты.

**445 гадоў** таму (1580) створана бібліятэка Полацкага езуіцкага калегіума (з 1812 г. – акадэміі).

**440 гадоў** таму (1585) створаны Полацкі школьны тэатр у г. Полацку пры Полацкім езуіцкім калегіуме (з 1812 – акадэмія). Дзейнічаў да 1819 г.

**440 гадоў** таму (1585) нарадзіўся Сапега Аляксандр Дажбог (1585–1635; сын Рыгора), падкаморы віцебскі з найбуйнейшага магнацкага роду герба «Ліс» у ВКЛ, староста аршанскі, кашталян віцебскі, староста прапойскі і чачэрскі.

**430 гадоў** таму (1595) нарадзіўся Корсак Рафаіл (каля 1595–1640; Мікалай), мітрапаліт грэка-каталіцкай царквы Рэчы Паспалітай са старажытнага беларускага роду, архімандрыт уніяцкіх манастыроў, протаархімандрыт (генерал) Базыльянскага ордэна, епіскап галіцкі.

**425 гадоў** таму (1600) нарадзіўся Абуховіч Піліп Казімір (каля 1600–1656), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ, пісьменнік-мемуарыст. З 1653 г. з'яўляўся ваяводам віцебскім, смаленскім.

**425 гадоў** таму (1600) нарадзіўся Семяновіч Казімір (каля 1600–пасля 1651), ваенны дзеяч, інжынер і тэарэтык артылерыі, мысліцель-гуманіст. Паходзіў з роду дробных князёў Семяновічаў, якія ў 14–16 стст. валодалі землямі на Віцебшчыне.

**415 гадоў** таму (1610) адбыўся першы спектакль у Аршанскім школьным тэатры пры езуіцкім калегіуме.



им. П. Бровки, 1984. – С. 106.

9. **Высогорец** Михаил Амосович // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная типография, 2009. – С. 29.

10. **Высогорец** Михаил Амосович // Твои сыновья, Беларусь! Герои Советского Союза : биографический справочник / [ред. Ю. В. Баженов и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2015. – С. 35–36.

11. **Жур, Л.** Імёны педагогаў-герояў у памяці народнай / Л. Жур // Настаўніцкая газета. – 2010. – 2 кастр. – С. 3.

12. Крачкоўскі, А. Зямляк вярнуўся на радзіму / А. Крачкоўскі // Зара (Бешанковічы). – 2000. – 26 верас. – С. 2.

13. **Павловская, Л.** Бочейковской СШ присвоено имя Героя Советского Союза М. А. Высогорца / Л. Павловская // Зара (Бешанковічы). – 2022. – 3 чэрв. – С. 5.

14. **Павловская, Л.** Восхищение подвигом / Л. Павловская // Витебские вести. – 2022. – 7 июня. – С. 5.

пасёлку была створана Алея Герояў, на якой ёсць помнік М. А. Высогорцу. У чэрвені 2022 года імя Героя Савецкага Саюза М. А. Высогорца было прысвоена Бачэйкаўскай сярэдняй школе Бешанковіцкага раёна і адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Бясстрашны** камандзір // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Бешанковіцкага раёна / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.] ; мастак А. М. Хількевіч. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1991. – С. 224–225.

2. **Высагорац** Міхаіл Амосавіч // Беларуская ССР: кароткая энцыклапедыя : у 5 т. / редкал.: І. П. Шамякін (гл. ред.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1981. – Т. 5 : біяграфічны даведнік. – С. 132.

3. **Высагорац** Міхаіл Амосавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.:Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1997. – Т. 4 : Варанецкі–Гальфстрым. – С. 320.

4. **Высагорац** Міхаіл Амосавіч // Імёны, асобы, лёсы: ураджэнцы Віцебшчыны ў далёкім і блізкім замежжы / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2012. – С. 69–70.

5. **Высагорац** Міхаіл Амосавіч // Нашы землякі ў далёкім і блізкім замежжы : біяграфічны даведнік / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка. – Віцебск : Витебская областная типография, 2007. – С. 41–42.

6. **Высагорац** Міхаіл Амосавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Б. І. Сачанка [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1994. – Т. 2 : Беліцк–Гімн. – С. 373.

7. **Высогорец** Михаил Амосович // Белорусская ССР: краткая энциклопедия : в 5 т. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск.: БелСЭ им. П. Бровки, 1981. – Т. 5 : биографический справочник. – С. 130.

8. **Высогорец** Михаил Амосович // Навечно в сердце народном / редкол.: И. П. Шамякин [и др.]. – 3-е изд., доп. и испр. – Минск : БелСЭ




**405 гадоў** таму (1620) узведзены Смальянскі замак (Белы Ковель ці Малы Ковель) князем С. А. Сангушкам-Ковельскім, помнік палацава-паркавай архітэктуры 1-й чвэрці 17 ст. на паўн.-зах. ускраіне в. Смальяны Аршанскага раёна, на правым беразе р. Дзярноўка (правы прыток р. Адроўка).

**405 гадоў** таму (1620) нарадзіўся Корсак Ян Раманавіч (каля 1620–1697), полацкі падчашы са старажытнага беларускага роду, падкаморы, кашталян.

**395 гадоў** таму (1630) першае ўпамінанне пра в. Юнькі Пастаўскага раёна на р. Лучайка.

**395 гадоў** таму (1630) была заснавана Спірыдонам Собалем Куцеінская друкарня пры Аршанскім Куцеінскім Багаяўленскім манастыры, цэнтр беларускага кнігадрукавання ў 17 ст.

**390 гадоў** таму (1635) нарадзіўся Жахоўскі Кіпрыян (Цыпрыян; каля 1635–кастр. 1693), дзеяч уніяцкай царквы Рэчы Паспалітай, ураджэнец Полацкага ваяводства. У 1674–1693 гг. архіепіскап полацкі, мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі.

**325 гадоў** таму (1700) нарадзіўся Глаўбіц Іаган Крыштоф (Ян; 1700–1767), беларускі і літоўскі архітэктар, прадстаўнік віленскага барока і ракако, пабудаваў Глыбоцкі касцёл і кляштар кармелітаў, перабудаваў Полацкі Сафійскі сабор.

**325 гадоў** таму (1700) нарадзіўся Фантана Іосіф ІІІ (каля 1700–пасля 1755), адзін з найбуйнейшых дойлідаў Рэчы Паспалітай, аўтар шэрагу архітэктурных праектаў на Віцебшчыне, Гарадзеншчыне і Віленшчыне.

**305 гадоў** таму (1720) нарадзіўся Алендскі Стафан (каля 1720–1763), дзеяч кальвінісцкай царквы. У 1745 г. займаў пасаду старосты сітнаўскага (цяпер в. Малое Сітна Полацкага раёна).

**280 гадоў** таму (1745) нарадзіўся Корсак Самуэль (каля 1745–пасля снежня 1795), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ са старажытнага беларускага роду, пасол ад Навагрудскага ваяводства на сейм 1773 г., які зацвердзіў 1-ы падзел Рэчы Паспалітай. Уваходзіў у Найвышэйшую літоўскую раду.

**275 гадоў** таму (1750) пабудаваны Белы палац у в. Лявонпаль Мёрскага раёна.

**265 гадоў** таму (1760) нарадзіўся Цяцерскі Фаўстын Іванавіч (1760–1832), святар, беларускі, польскі, літоўскі грамадскі дзеяч, мемуарыст, доктар філасофіі і тэалогіі, першы даследчык асаблівасцей побыту эвенкаў, флоры і фаўны Забайкалля. У 1801–1816 гг. – выкладчык дамініканскай калегіі ў Забелах Полацкага павета, ВКЛ (зараз в. Валынцы Верхнядзвінскага раёна).

**265 гадоў** таму (1760) пабудавана з цэглы на правым беразе р. Заходняя Дзвіна ў г. Віцебску Пакроўская царква Маркава манастыра. З 1941 года – царква ў гонар Казанскай іконы Божай Маці.

**265 гадоў** таму (1760) пабудаваны сабор у гонар Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў г. Віцебску, помнік архітэктуры класіцызму.

**260 гадоў** таму (1765) нарадзіўся Манькоўскі Ігнат Антонавіч (каля 1765–1831), беларускі публіцыст, віцебскі губернскі пракурор, віцэ-губернатар, ураджэнец Віцебшчыны.

**260 гадоў** таму (1765) нарадзіўся Валінскі Ежы (1765–1840), танцоўшчык, вучыўся ў балетных школах А. Тызенгаўза ў Гродне і Паставах, ураджэнец г. Паставы.

**250 гадоў** таму (1775) нарадзіўся Арля-Ашмянец Фердынанд Францавіч (1775–1847), педагог, пісьменнік. Працаваў настаўнікам у Дынабургскім, Віцебскім і Аршанскім павятовых вучылішчах, у Полацкім, Рагачоўскім і Камянецкім вучылішчах.

**250 гадоў** таму (1775) пабудавана Віцебская ратуша на месцы драўлянай ратушы 16 ст. З'яўляецца помнікам архітэктуры позняга барока з элементамі класіцызму.

**245 гадоў** таму (1780) заснаваны ў Бешанковічах старэйшы на тэрыторыі Беларусі піваварны завод для забеспячэння маёнтка ўласным півам.

**245 гадоў** таму (1780) пачаў будавацца мураваны касцёл святога Юзафа Абручніка і кляштар дамініканцаў, помнік архітэктуры барока і класіцызму ў г. Оршы на месцы папярэдняга драўлянага храма дамініканцаў. У 1990-х гадах. адрэстаўрыраваны.

**245 гадоў** таму (1780) быў пабудаваны архітэктурны ансамбль у г. Паставы, помнік горадабудаўніцтва 2-й паловы 18 ст.



датэрміновае заканчэнне будаўніцтва ўсяго моста і пераправу тэхнікі. Гэта, у сваю чаргу, узмацніла абарончыя магчымасці чырвонаармейцаў на плацдарме на супрацьлеглым беразе. Гвардыі капітану Высагорцу Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 23 верасня 1944 года за «ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм», праяўленыя падчас Львоўска-Сандамірскай аперацыі, было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

У студзені-лютым 1945 года за ўзорнае выкананне заданняў па будаўніцтве наплаўных мастоў праз рэкі Пiліца, Бзура, Варта, Одэр падчас Вісла-Одэрскай аперацыі. Менавіта на Кюстрынскім плацдарме на Одэры М. А. Высагорцу быў уручаны ордэн Чырвонага Сцяга.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, у снежні 1945 г., Міхаіл Высагорац быў звольнены ў запас. Паехаў на радзіму сваёй нявесты на Кузбас, дзе працаваў у будаўнічых арганізацыях (на будаўніцтве вугальных шахт). У 1957 годзе скончыў горны тэхнікум. Быў назначаны начальнікам вытворча-тэхнічнага аддзела шахтабудаўнічага ўпраўлення № 8 трэста «Куйбышаўвугаль» у г. Навакузнецку.

З 1974 года М. А. Высагорац пражываў у пасёлку Шахоўская Маскоўскай вобласці. Працаваў начальнікам вытворча-тэхнічнага аддзела ПМК-287 трэста «Масаблсельбуд-18». З 1982 года – намеснікам галоўнага ўрача па гаспадарчай частцы цэнтральнай раённай бальніцы.

Памёр Высагорац Міхаіл Амосавіч 22 красавіка 1996 года. Пахаваны на радзіме, у в. Стрыжова Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

У цэнтры п. Шахоўская, ля будынка гісторыка-краязнаўчага музея ў 1985 годзе быў устаноўлены бюст Героя, а ў 1999 годзе на доме, дзе жыў апошнія гады М. А. Высагорац – мемарыяльная дошка. У 2005 годзе ў

У верасні-кастрычніку 1941 года ў сувязі з неспрыяльным развіццём падзей на фронце на маскоўскім напрамку і для паскарэння будаўніцтва абарончых рубяжоў на Мажайскай лініі абароны, туды былі накіраваны дадатковыя сілы, у тым ліку курсанты вучылішча. Курсант Высагорац служыў у 9 роце на калужскаім напрамку. Удзельнічаў у мініраванні пуцеправодаў на шашэйных дарогах, у падрыве мастоў, ЦЭЦ і воданапорнай вежы ў г. Калузе. Пасля вяртання ў вучылішча быў у ліку 50 чалавек уключаны ў склад аператыўна-інжынернай групы генерала І. П. Галіцкага, начальніка штаба інжынерных войск Чырвонай арміі. 20 снежня 1941 года група выбыла ў Севастопаль для стварэння інжынерных загарод вакол асаджанага горада. Пасля ўдзелу у спецзаданнях у Калужскай вобласці, абароне Севастопаля, камандаваў сапёрнай і мотаінжынернай ротамі на Калінінскім фронце, пад Курскам, ва Украіне, Польшчы, Германіі. М. А. Высагорац ваяваў у складзе Прыморскай арміі Варонежскага, 1-га Украінскага, 1-га Беларускага франтоў, удзельнічаў у Варонежска-Касторненскай аперацыі, Курскай бітве, Харкаўскай аперацыі, Праскураўска-Чарновіцкай, Львоўска-Сандамірскай, Вісла-Одэрскай аперацыях, штурме Берліна.

З лютага 1943 года старшы лейтэнант Міхаіл Высагорац камандаваў інжынернай ротай 13-га гвардзейскага асобнага мотаінжынернага батальёна 17-й мотаінжынернай брыгады 1-й гвардзейскай танкавай арміі 1-га Украінскага фронту. У сакавіку 1944 года падчас Праскураўска-Чарнавіцкай аперацыі рота Высагорца вызначылася пры будаўніцтве наплаўных мастоў праз рэкі Днестр і Прут. Камандзір роты атрымаў званне гвардыі капітана і быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Акрамя будаўніцтва паромнай пераправы для фарсіравання р. Днестр (24.03.1944) і моста праз р. Прут (29.03.1944), рота Высагорца вызначылася пры будаўніцтве пераправаў праз рэкі Заходні Буг (19.07.1944), Сан (24.07.1944) і асабліва праз р. Вісла (05.08.1944), дзе яна першая выканала заданне па пабудове свайго ўчастка, чым забяспечыла



**240 гадоў** таму (1785) пабудаваны ў Віцебску мураваная Успенская царква і будынак манастыра на месцы старога драўлянага храма, помнік архітэктуры барока. У 1799 г. царква перайменавана ва Успенскі сабор (у 1936 г. зруйнаваны). Аднаўлены як кафедральны сабор у гонар Успення Прасвятой Багародзіцы на ўзор папярэдняга храма ў 2011 г.

**240 гадоў** таму (1785) пабудаваны касцёл святой Барбары и святога Юзафа (касцёл Святой Варвары) у г. Віцебску, помнік архітэктуры эклектыкі.

**230 гадоў** таму (1795) створаны Браслаўскі павет, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Расійскай імперыі ў 1795–1836 гг. і ў 1939–1940 гг. у БССР.

**225 гадоў** таму (1800) нарадзіўся Шапялевіч Радзіслаў Іасафатавіч (Гаўдэнты, Гаўдэнцый, Гаўдэнтый Шапялевіч або Лазарэвіч-Шапялевіч; 1800–1846), паэт, ураджэнец Магілёўскай губерні. Вучыўся ў Полацкай езуіцкай акадэміі. У 1830–1834 гг. – настаўнік лацінскай мовы ў Віцебскай гімназіі.

**215 гадоў** таму (1810) заснавана метэаралагічная станцыя ў г. Віцебску.

**215 гадоў** таму (1810) нарадзіўся Грэйпель Леапольд (Грэйпаль; каля 1810–пасля 1847), беларускі архітэктар. У 1830-я гг. працаваў павятовым землямерам г. Полацка. Аўтар праекта перабудовы манастырскага корпуса бернардзінцаў (пасля закрыцця касцёла і кляштара) пад павятовую школу (1842–1847) у Віцебску.

**205 гадоў** таму (1820) у Бешанковічах жыў пісьменнік і будучы дзекабрыст Бястужаў-Марлінскі Аляксандр Аляксандравіч.

**205 гадоў** таму (1820) пабудавана сядзіба ў в. Юрцава Аршанскага раёна, помнік сядзібна-паркавай архітэктуры «гістарызму».

**205 гадоў** таму (1820) заснавана Аршанскае павятовае дамініканскае вучылішча. Праіснавала да 1917 г.

**200 гадоў** таму (1825) пабудавана царква ў імя святога прарока Іліі ў в. Шкунцікі Шаркаўшчынскага раёна, помнік архітэктуры класіцызму. Першапачаткова была пабудавана як касцёл. З 1863 – праваслаўная царква.

**200 гадоў** таму (1825) нарадзіўся Вяроўкін Міхаіл Лаўрэнцьевіч (1825–1896), архівіст, археограф. У 1847–1852 гг. выкладаў у Віцебскай духоўнай вучылішчы. У 1853–1863 гг. – століначальнік полацкай духоўнай кансісторыі, з 1864 г. – на розных пасадах у віцебскім губернскім праўленні, 1888 г. – архіварыус Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг.

**195 гадоў** таму (1830) была разбурана Свята-Троіцкая царква ў в. Белая Царква Чашніцкага раёна.

**195 гадоў** таму (1830) адкрыта Лепельскае дваранскае вучылішча. Праіснавала да 1917 г.

**195 гадоў** таму (1830) уведзена ў дзеянне дарога Віцебск–Орша.

**190 гадоў** таму (1835) адкрыўся Полацкі кадэцкі корпус, які з'яўляўся сярэдняй ваеннай навучальнай установай закрытага тыпу ў Полацку. Праіснаваў да 1918 г.

**190 гадоў** таму (1835) нарадзіўся Шрэдэр Іван Мікалаевіч (1835–1908), скульптар, акадэмік Імператарскай Акадэміі мастацтваў. Сын Віцебскага губернатара М. І. Шрэдэра (1831–1836 гг.).

**185 гадоў** таму (1840) пабудавана паштовая станцыя каля в. Паграбёнка Сенненскага раёна. Комплекс будынкаў былой паштовай станцыі ўваходзіць у дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**185 гадоў** таму (1840) пабудавана з цэглы царква ў імя прападобнай Еўфрасінні Полацкай у в. Бароўка Верхнядзвінскага раёна.

**185 гадоў** таму (1840) нарадзіўся Папоў Аляксандр Нічыпаравіч (каля 1840–1881), вучоны, педагог, кандыдат камеральных навук, доктар хімічных навук, ураджэнец Віцебшчыны.

**185 гадоў** таму (1840) пабудавана царква ў імя святога апостала Іаана Багаслова, помнік архітэктуры драўлянага дойлідства ў в. Галомысла Мёрскага раёна.

**180 гадоў** таму (1845) пабудавана царква ў гонар Праабражэння Гасподняга ў Чашніках з цэглы. У 1995 г. галоўны купал пакрыты ацынкаванай бляхай, адрэстаўрыраваны іконы. Царква – помнік архітэктуры класіцызму.



# *Лістапад*



**ВЫСАГОРАЦ**

**МІХАІЛ АМОСАВІЧ**

*105 год з дня нараджэння*

*(1920)*

**Высагорац (Высокагорац) Міхаіл Амосавіч** (1920–1996) – ваенны інжынер, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

Нарадзіўся 19 лістапада 1920 года ў в. Дукоўшчына (зараз уваходзіць у склад суседняй вёскі Стрыжава) Бешанковіцкага раёна ў сялянскай сям'і. Бацька будучага Героя Амос Высагорац у гэты час загадваў вясковай хатай-чытальняй. Скончыў дзесяць класаў школы. У 1940 годзе – Віцебскі настаўніцкі інстытут (тэхнікум) па спецыяльнасці «Геаметрыя, чарчэнне». Пачаў працаваць настаўнікам у Асвейскай школе. У лістападзе 1940 года Міхаіл Высагорац быў прызваны на службу ў Рабоча-сялянскую Чырвоную армію. У сувязі з тым, што ён ужо меў сярэднюю спецыяльную адукацыю – быў накіраваны ў Маскоўскае ваенна-інжынернае вучылішча (дыслакавалася ў Болшава-1 (цяпер мікрараён Юбілейны г. Каралёў). У далейшым, праз паўгады навучання, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, М. А. Высагорац стаў «балшэўскім Героем-курсантам».

краткий биографический словарь / А. А. Бабаков [и др.] ; ред. И. Н. Шкадов. – Москва : Военное издательство, 1988. – Т. 2 : Любов–Ящук. – С. 133.

12. **Мядзель** Михайл Маркович // Навечно в сердце народном / редкол.: И. П. Шамякин [и др.]. – 3-е изд., доп. и испр. – Минск : БелСЭ им. П. Бровки, 1984. – С. 369.

13. **Мядзель** Михаил Маркович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 153.

14. **Мядзель** Михаил Маркович // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн, 2007. – Т. 5 : Минск–Педиатрия. – С. 281.

15. **Мядзель** Михаил Маркович // Твои сыновья, Беларусь! Герои Советского Союза : биографический справочник / ред.: Ю. В. Баженов [и др.] ; худ. ред. П. В. Баранов. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2015. – С. 100.

16. **Салаўёў, М.** Парторг батальёна / М. Салаўёў // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 1981. – 16 ліп. – С. 2.



**170 гадоў** таму (1855) заснавана метэаралагічная станцыя «Полацк» у г. Полацку.

**170 гадоў** таму (1855) быў адкрыты першы ў Беларусі санаторый. Сёння – гэта «Лясныя азёры», санаторый у в. Вашкова Ушацкага раёна.

**165 гадоў** таму (1860) нарадзіўся Гласко Уладзіслаў Ксавер'евіч (1860–?), удзельнік рэвалюцыйнага руху, ураджэнец Віцебскага павета.

**155 гадоў** таму (1870) пабудавана царква ў гонар Уваскрасення Хрыстовага ў г. Дзісна Мёрскага раёна, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

**155 гадоў** таму (1870) пабудавана з цэглы на месцы папярэдняга храма царква ў імя святога прарока Іліі ў г. п. Бешанковічы (пачатак будаўніцтва – 1866 г.).

**150 гадоў** таму (1875) пабудавана царква ў імя святых апосталаў Пятра і Паўла ў в. Браздзечына Аршанскага раёна.

**150 гадоў** таму (1875) нарадзіўся Вашчанка Васіль Ільіч (1875–?), удзельнік руска-японскай вайны 1904–1905 гадоў, Першай сусветнай вайны, поўны Георгіеўскі кавалер. Ураджэнец в. Аскотава Гарадоцкага павета Віцебскай губерні (зараз – Гарадоцкі раён).

**145 гадоў** таму (1880) пераўтворана «Акруговае праўленне Таварыства аказання дапамогі пры караблекрушэннях» Віцебскай губерні ў «Таварыства выратавання на водах».

**145 гадоў** таму (1880) пабудавана царква ў імя святога прарока Іліі ў г. Оршы на месцы папярэдняга аднайменнага драўлянага храма (1460 г.), помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

**140 гадоў** таму (1885) выяўлены археалагічны помнік Галошава, курганны могільнік крывічоў на ўсходняй ускраіне в. Галошава Талачынскага раёна.

**140 гадоў** таму (1885) нарадзілася Лейланд Эмілія Карлаўна (1885–1941), грамадскі дзеяч, архівіст. З 1918 г. жыла ў г. Віцебску. У 1924–1930 гг. – загадчыца Віцебскага аддзялення ЦАУ РСФСР, архіва акрвыканкама. З 1933 г. – дырэктар Паўночна-Беларускага аддзялення Цэнтрархіва БССР. Ураджэнка Добленскага павета Курляндскай губерні (зараз тэрыторыя Латвіі).

**135 гадоў** таму (1890) заснавана друкарня Я. Падземскага ў г. Оршы.

**135 гадоў** таму (1890) нарадзіўся Гудкоў Іван Якаўлевіч (каля 1890–?), поўны Георгіеўскі кавалер, удзельнік Першай сусветнай вайны, ураджэнец в. Махалава Вышадскай воласці Гарадоцкага павета Віцебскай губерні (зараз – Гарадоцкі раён).

**135 гадоў** таму (1890) нарадзіўся Мятла Пётр Васілевіч (1890–1936), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, ураджэнец былой в. Кухцінцы Дзісенскага павета Віленскай губерні (зараз тэрыторыя Мёрскага раёна).

**135 гадоў** таму (1890) нарадзіўся Арцем`еў Лявонцій Арцёмавіч (1890–?), удзельнік Першай сусветнай вайны, поўны Георгіеўскі кавалер, ураджэнец Веліжскага павета Віцебскай губерні (зараз – Пскоўская вобласць, Расія).

**135 гадоў** таму (1890) пабудаваны сядзібны дом Маліноўскіх у в. Чарапоўшчына Ушацкага раёна.

**130 гадоў** таму (1895) нарадзіўся Хаін-Юнскі Аляксандр Зіноўевіч (Хаін Абрам Земкавіч; 1895–1945), грамадскі дзеяч, журналіст, ураджэнец г. Талачына.

**130 гадоў** таму (1895) дзейнічалі Губінскія фабрыкі (1895–1914) у маёнтку Губіна Лепельскага павета. Зараз в. Губіна ў Лепельскім раёне.

**130 гадоў** таму (1895) нарадзіўся Воласаў Марк Рыгоравіч (1895–1941), савецкі перакладчык, член Саюза пісьменнікаў СССР. Удзельнік Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войн. Двойчы ўзнагароджаны Георгіеўскім крыжам. Ураджэнец м. Глазманка (пазней Госціні) Віцебскай губерні (зараз частка г. Плявініс, Латвія).

**125 гадоў** таму (1900) пабудавана царква ў імя святога велікамучаніка Георгія Перамоганосца ў г. Лепелі, помнік архітэктуры неарускага стылю.

**125 гадоў** таму (1900) пабудавана царква ў гонар Праабражэння Гасподняга ў в. Язна Мёрскага раёна, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

**125 гадоў** таму (1900) пабудавана царква ў імя Успення Прасвятой Багародзіцы (Свята-Успенская царква) у в. Пабеда Шумілінскага раёна, помнік архітэктуры неарускага стылю.



рабочы. – 1957. – 10 ліп. – С. 3.

2. **Алея** Герояў // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2018. – 8 мая. — С. 4–5.

3. **Мядель** Михаил Маркович // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная типография, 2009. – С. 97.

4. **Мядзель** Міхаіл Маркавіч // Беларуская ССР: кароткая энцыклапедыя : у 5 т. / редкал.: І. П. Шамякін (гл. ред.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1981. – Т. 5 : біяграфічны даведнік. – С. 438.

5. **Мядзель** Міхаіл Маркавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2000. – Т. 11 : Мугір–Паліклініка. – С. 67.

6. **Мядзель** Міхаіл Маркавіч // Імёны, асобы, лёсы: ураджэнцы Віцебшчыны ў далёкім і блізкім замежжы / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2012. – С. 202.

7. **Мядзель** Міхаіл Маркавіч // Нашы землякі ў далёкім і блізкім замежжы : біяграфічны даведнік / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка. – Віцебск : Витебская областная типография, 2007. – С. 119.

8. **Мядзель** Міхаіл Маркавіч // Памяць: Верхнядзвінскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.] ; уклад. А. Ф. Бубала ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Паліграфафармленне, 2000. – Кн. 2. – С. 37–38.

9. **Мядзель** Міхайл Маркавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1999. – Т. 5 : М–Пуд. – С. 246.

10. **Мядзель** Михаил Маркович // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси / склад.: В. Ц. Осіпаў [і інш.] ; рэдкал.: А. В. Праляскоўскі, Л. У. Языковіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – С. 676.

11. **Мядзель** Михаил Маркович // Герои Советского Союза:

Старшы лейтэнант М. М. Мядзель, парторг 1031-га стралковага палка 280-й стралковай дывізіі 60-й арміі Цэнтральнага фронту, асабліва вызначыўся пры вызваленні Украіны. 25 верасня 1943 года адзін з перадавых атрадаў пад яго камандаваннем, фарсіраваў р. Днепр на паўднёвым захадзе ад с. Акунінава (Казелецкі раён, Чарнігаўская вобласць), з фланга нанес раптоўны ўдар па ворагу. Замацаваўшыся на плацдарме на заходнім беразе ракі, байцы прынялі актыўны ўдзел у баях за яго ўтрыманне да падыходу асноўных сіл на працягу трох сутак пад жорсткім агнём праціўніка. Гэта дапамагло ўсяму палку з найменшымі стратамі пераправіцца на правы бераг ракі.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 17 кастрычніка 1943 года за «ўзорнае выкананне баявых задач камандавання на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм» ст. лейтэнанту Міхаілу Мядзелю прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

У жніўні–верасні 1945 года Міхаіл Мядзель ваяваў на Далёкім Усходзе. На пасадзе намесніка камандзіра зенітна-артэлерыйскай дывізіі ў складзе Прыморскай групы войск удзельнічаў у баях з японскімі мілітарыстамі.

Пасля дэмабілізацыі ў званні капітана з радоў Чырвонай арміі ў 1946 годзе, вярнуўся на ранейшае месца работы, на Братцаўскую птушкагадоўчую фабрыку. Працаваў начальнікам аддзела кадраў, намеснікам дырэктара. У 1971 годзе выйшаў на пенсію.

Памёр Міхаіл Маркавіч Мядзель 21 лістапада 1981 года. Пахаваны ў Маскве на Галавінскіх могілках. У гонар героя на яго радзіме, у вёсцы Задзежжа, устаноўлены памятны знак-стэла.

Узнагароджаны Залатой Зоркай Героя, ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і 6 медалямі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Агурок, П.** Палітрук Міхаіл Мядзель / П. Агурок // Віцебскі



**125 гадоў** таму (1900) пачалось будаўніцтва касцёла святога апостала Андрэя з цэглы ў г. п. Лынтупы Пастаўскага раёна на месцы былога драўлянага храма. Скончана будаўніцтва ў 1908 г., помнік архітэктуры неабарока.

**125 гадоў** таму (1900) нарадзіўся Даркевіч Хрыстафор Яўгенавіч (1900–1937), беларускі мастак. З 1931 г. выкладаў у Віцебскім мастацкім тэхнікуме. Ураджэнец в. Міхалава Веліжскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Смаленскай вобл., Расія).

**125 гадоў** таму (1900) пабудавана царква ў гонар Успення Прасвятой Багародзіцы ў в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна, помнік драўлянага дойлідства.

**125 гадоў** таму (1900) была заснавана ніжэйшая сельскагаспадарчая школа 1-га разраду ў мястэчку Смальяны. З 2001 г. – УА «Смальянскі дзяржаўны аграрны каледж». З 2019 г. – УА «Аршанскі дзяржаўны аграрны каледж».

**125 гадоў** таму (1900) заснаваны механічныя майстэрні па вырабе сельскагаспадарчага інвентару, катлоў, рамонце абсталявання для млыноў і вінакурных заводаў у г. Оршы. Зараз – ААТ станказавод «Чырвоны барацьбіт». З 2012 г. уваходзіць у холдынг «Белстанкаінструмент».

**125 гадоў** таму (1900) нарадзіўся Дэйніс Іван Пятровіч (1900–1985), выкладчык, краязнаўца, ганаровы грамадзянін горада Полацка. У 1925 г. – сакратар Полацкага краязнаўчага таварыства, з 1929 г. – выкладчык Полацкагаляснога тэхнікума. Шматразова абіраўся дэпутатам Полацкага гарсавета дэпутатаў працоўных. Ураджэнец г. Невеля.

**120 гадоў** таму (1905) пабудаваны касцёл Божага Цела ў в Іказнь Браслаўскага раёна, помнік архітэктуры неараманскага стылю.

**120 гадоў** таму (1905) пабудавана царква ў імя свяціцеля Мікалая Цудатворца ў в. Іказнь Браслаўскага раёна, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

**120 гадоў** таму (1905) пачатак дзейнасці Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя з моманту стварэння прафесійнага саюза аптэчных работнікаў (фармацэўтаў) Віцебска.

**115 гадоў** таму (1910) быў адкрыты настаўніцкі інстытут у Віцебску. З 1934 г. – Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С. М. Кірава. Зараз – Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава.

**115 гадоў** таму (1910) знойдзены Полацкі манетна-рэчавы скарб на тэрыторыі Полацкага Верхняга замка.

**115 гадоў** таму (1910) тэатр у в. Празарокі Глыбоцкага раёна атрымаў статус прафесійнага і назву Першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага.

**115 гадоў** таму (1910) пабудавана з цэглы царква ў імя Успення Прасвятой Багародзіцы ў г. п. Відзы Браслаўскага раёна.

**115 гадоў** таму (1910) нарадзілася Пруская Зося Пятроўна (1910–1995), спявачка, носьбіт мастацкіх традыцый Лепельшчыны, ураджэнка в. Аношкі Лепельскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Лепельскім раёне).

**115 гадоў** таму (1910) пабудаваны касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў в. Задарожжа Глыбоцкага раёна, помнік архітэктуры неаготыкі.

**110 гадоў** таму (1915) нарадзіўся Корнеў Леанід Сямёнавіч (1915–1944), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Спас-Слабада Полацкага павета Віцебскай губерні (цяпер у межах г. Полацка).

**110 гадоў** таму (1915) нарадзіўся Плякін Іван Антонавіч (1915–1944), вызначыўся ў баях пры вызваленні Бешанковіцкага раёна ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. Ураджэнец с. Равенькі Варонежскай губерні (цяпер у Белгародскай вобласці, Расія).

**110 гадоў** таму (1915) нарадзіўся Янціміраў Булат Янбулатавіч (1915–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Верхні Інгал Табольскай губерні (цяпер у Цюменскай вобласці, Расія).

**105 гадоў** таму (1920) нарадзіўся Крыванос Павел Ананьевіч (1920–1944), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, камандзір танкавага ўзвода малодшы лейтэнант, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Альхоўка Быхаўскага павета Гомельскай губерні, РСФСР (цяпер у Клічаўскім раёне Магілёўскай вобласці). Вызначыўся ў чэрвені 1944 г. у час ліквідацыі варожай групоўкі каля Віцебска.



## *Кастрычнік*



**МЯДЗЕЛЬ**
**МІХАІЛ МАРКАВІЧ**
*115 год з дня нараджэння*
*(1910)*

**Мядзель Міхаіл Маркавіч** (1910–1981) – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

Нарадзіўся 4 (17) кастрычніка 1910 года ў в. Задзежжа Асвейскага раёна Полацкай вобласці (зараз у Верхнядзвінскім раёне) у сям'і селяніна. Скончыў 7 класаў школы. Працаваў загадчыкам гаспадаркі на Братцаўскай птушкафабрыцы ў Сонечнагорскім раёне Маскоўскай вобласці. З 1932 па 1933 гады – служыў ў Чырвонай арміі. У 1936 годзе скончыў курсы прапагандыстаў. Член КПСС з 1939 года.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны, у чэрвені 1941 года, прызваны на службу ў Рабоча-сялянскую Чырвоную армію і накіраваны на фронт. За гады вайны тры разы быў паранены. Удзельнічаў у баях пры абароне Оршы, Віцебска, Смаленска. Пад Смаленскам быў паранены першы раз, адпраўлены ў тыл, дзе прайшоў курсы палітработнікаў. Старшы лейтэнант ваяваў на Заходнім, Бранскім, Цэнтральным, 1-м Украінскім і Варонежскім франтах. Быў старшыной, намеснікам палітрука, палітруком стралковай роты, парторгам стралковага батальёна.

типография, 2009. – С. 73.

4. **Крумін** Іван Андрэевіч // Памяць: Гарадоцкі раённ: гісторыка-дакументальныяя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэд. кал. Н. А. Бурунова [і інш.] ; укл. С. І. Садоўская ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 410–411.

5. **Крумінь** Іван Андрэевіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1972. – Т. VI : Кішынёў–Манцэвічы. – С. 124.

6. **Крумінь** Іван Андрэевіч // Беларуская ССР: кароткая энцыклапедыя : у 5 т. / редкал.: І. П. Шамякін (гл. ред.) [і інш.]. – Мінск.: БелСЭ імя П. Броўкі, 1981. – Т. 5 : біяграфічны даведнік. – С. 330.

7. **Крумінь** Іван Андрэевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск, 1999. — Т. 8 : Канто–Кулі. – С. 485–486.

8. **Крумінь** Іван Андрэевіч // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси / склад.: В. Ц. Осіпаў [і інш.] ; рэдкал.: А. В. Праляскоўскі, Л. У. Языковіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – С. 539.

9. **Круминь** Иван Андреевич // Навечно в сердце народном / редкол.: И. П. Шамякин [и др.]. – 3-е изд., доп. и испр. – Минск : БелСЭ им. П. Бровки, 1984. – С. 272.

10. **Круминь** (Крумин) Иван Андреевич // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 8.

11. **Круминь** (Крумин) Иван Андреевич // Твои сыновья, Беларусь! Кавалеры ордена Славы : биографический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2014. – С. 79.

12. **Мятла, М.** Вогненны бераг / М. Мятла // Віцебскі рабочы. – 1988. – 23 лют. – С. 3.

13. **Салаўёў, М.** Гэта было на Дняпры / М. Салаўёў // Прамень камунізму (Гарадок). – 1983. – 20 кастр. – С. 2.



**105 гадоў** таму (1920) заснавана Віцебская абласная друкарня ў г. Віцебску. З 1925 г. – Друкарня імя Камінтэрна, з 2000 г. – унітарнае паліграфічнае прадпрыемства з сучаснай назвай.

**105 гадоў** таму (1920) заснаваны Віцебскі дзяржаўны станкаінструментальны каледж. У 2016 годзе далучаны да Віцебскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа.

**105 гадоў** таму (1920) выйшаў першы з трох нумароў часопіса «Голас працы» Віцебскага губернскага Савета прафсаюзаў.

**105 гадоў** таму (1920) быў створаны Талачынскі народны тэатр як аматарскі драматычны гурток пры хаце-чытальні (зараз існуе пры ДУК «Талачынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці»).

**100 гадоў** таму (1925) заснаваны Бярэзінскі біясферны запаведнік у Докшыцкім і Лепельскім раёнах Віцебскай і Барысаўскім раёне Мінскай абласцей.

**100 гадоў** таму (1925) нарадзіўся Рублеўскі Уладзімір Сцяпанавіч (1925–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец станцыі Топкі Кемераўскай вобласці.

**100 гадоў** таму (1925) пачаў выходзіць літаратурна-мастацкі часопіс «Аршанскі маладняк» (1925–1928), які выдавала Аршанская філія «Маладняка».

**95 гадоў** таму (1930) у Віцебску заснавана швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі». Зараз – ААТ «Сцяг індустрыялізацыі».

**95 гадоў** таму (1930) пабудаваны касцёл святога Станіслава, помнік архітэктуры канструктывізму ў в. Далёкія Браслаўскага раёна.

**95 гадоў** таму (1930) Віцебскі вышэйшы педагагічны інстытут адноўлены як Віцебскі індустрыяльна-педагагічны інстытут. Зараз – Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава.

**95 гадоў** таму (1930) уведзена ў дзеянне Асінаўская дзяржаўная раённая электрастанцыя ў г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна. З 1931 г. – Беларуская дзяржаўная раённая электрастанцыя (БелДРЭС).

**95 гадоў** таму (1930) заснаваны калгас імя Чырвонай арміі ў в. Альгова Віцебскага раёна. З 2003 г. – ЗАТ «Альгоўскае», з 2008 – СВК, з 2017 г. – ВК «Альгоўскае».

**95 гадоў** таму (1930) заснаваны Аршанскі мясакансервавы камбінат. З 1998 – ААТ.

**95 гадоў** таму (1930) заснавана Віцебская біяфабрыка імя Я. Р. Каваленкі , прадпрыемства па вытворчасці складаных лекава-прафілактычных і дыягнастычных прэпаратаў для патрэб ветэрынарыі ў в. Доўжа Віцебскага раёна. З 2003 – прыватнае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства, зараз – ДГУП «ГД Віцебская Біяфабрыка».

**95 гадоў** таму (1930) заснаваны СВК «Пражэктар» (1930-я гг.) у в. Слабада Лепельскага раёна як калгас. У 2005 г. дзейнасць спыненне ў выніку рэарганізацыі. Зараз – СУП «Пражэктар-агра».

**95 гадоў** таму (1930) быў выяўлены археалагічны помнік – пасяленне эпохі неаліту і бронзавага веку каля в. Старыя Лаўкі Чашніцкага раёна.

**95 гадоў** таму (1930) заснаваны калгас «Юны свет». Зараз – ААТ «Сакалоўшчына» ў Верхнядзвінскім раёне.

**95 гадоў** таму (1930) заснаваны калгас «Чырвоны барацьбіт» у Чашніцкім раёне. У 2003 г. перайменаваны ў СВК «Вядрэнскі», з 2010 г. – ААТ «Вядрэнскае-Агра».

**95 гадоў** таму (1930) пабудаваны касцёл Узвышэння Святога Крыжа ў в. Чарневічы Глыбоцкага раёна.

**95 гадоў** таму (1930) заснаваны Гарадоцкі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж як тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі. З 1974 да чэрвеня 1996 года – Гарадоцкі саўгас-тэхнікум. 29 лютага 1996 года пераатвораны ў Гарадоцкі сельскагаспадарчы тэхнікум. З 2001 года – установа адукацыі з сучаснай назвай.

**90 гадоў** таму (1935) адкрыты настаўніцкі інстытут, які рыхтаваў выкладчыкаў няпоўнай сярэдняй школы пры Віцебскім педінстытуце імя С. М. Кірава (дзейнічаў да 1955 г.).



Камітэта КП Латвіі (з 1950 года па 1952 год першым сакратаром Дабельскага райкама партыі; з 1952 па 1953 гады – загадчык аддзела Ліепайскага абкама КП Латвіі, а з 1953 па 1955 гады – сакратар Дабельскага РК КП Латвіі). З 1955 года па 1956 год ён назначаны намеснікам міністра сельскай гаспадаркі, а з чэрвеня 1956 года па красавік 1962 года – першым намеснікам міністра гандлю Латвійскай ССР. У 1962–1982 гадах І. А. Крумінь – старшыня праўлення Латвійскага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў, а з 1982 па люты 1986 гг. – адказны сакратар Латвійскай філіі Усесаюзнага НДІ эканомікі кааператыўнага гандлю Цэнтрасаюза.

Дзейнасць І. А. Круміня не абмяжоўвалася толькі ўнутранымі пытаннямі ЛатССР. У 1960-я гг. ён прымаў удзел у працы таварыства «СССР–Нарвегія». З 1963 г. з'яўляўся членам ЦК Міжнароднага Кааператыўнага Альянсу (МКА). Пачынаючы з 1951 г., ён шэсць разоў станавіўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Латвійскай ССР 3, 5–9 скліканняў. Неаднаразова выбіраўся членам ЦК Камуністычнай партыі Латвіі.

Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, ордэнам Айчыннай вайны І ступені, ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, Чырвонай Зоркі , медалямі.

Заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання Латвійскай ССР.

Памёр Іван Андрэевіч Крумінь 11 сакавіка 2003 года.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Голубев, В.** И. А. Круминь: штрихи к портрету / В. Голубев // Латыши и белорусы: вместе сквозь века : сборник научных статей / редкол.: С. П. Кулик [и др.]. – Минск : Республиканский институт высшей школы, 2019. – Вып. 8. – С. 45–48.

2. **Крумин** Иван Андреевич // Неман. – 1967. – № 4. – С. 70.

3. **Крумин** (Круминьш) Иван Андреевич // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная

у рады Чырвонай арміі (па іншых звестках прызваны ў жніўні 1941 года Віцебскім РВК). На фронце з лістапада 1942 года, пасля заканчэння паскоранага курса мінамётнага вучылішча. Удзельнічаў у баях на Цэнтральным і 1-м Беларускім франтах, у вызваленні Курска, Арла, Сеўска, Чарнігава, Правабярэжнай Украіны.

Лейтэнант І. А. Крумінь, камандзір узвода 120-мм мінамётаў 45-га Даурскага стралковага палка 106-ай Забайкальскай стралковай дывізіі, асабліва вызначыўся пры фарсіраванні ракі Днепр у раёне гарадскога пасёлка Лоеў Гомельскай вобласці. 15 кастрычніка 1943 года пад моцным агнём праціўніка байцы дэсантнай групы пад камандаваннем лейтэнанта Круміня на падручных сродках пераправіліся на правы бераг Дняпра для карэкціроўкі агню нашай артылерыі, якая абстрэльвала пераправу. Мужны афіцэр-мінамётчык быў паранены, аднак працягваў выконваць баявую задачу. Эвакуіраваўся ў медсанбат толькі калі пераправіліся другія эшалоны і да яго прыйшла змена.

У выніку гераічных дзеянняў лейтэнанта І. А. Круміня артылерыя дзейнічала выдатна, агнявыя кропкі праціўніка падаўляліся своечасова, што забяспечыла паспяховае фарсіраванне Дняпра і захоп плацдарма на правым беразе ракі.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 30 кастрычніка 1943 года за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм лейтэнанту Круміню Івану Андрэевічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». Высокую ўзнагароду воіну ў лютым 1944 года ў Крамлі ўручыў М. І. Калінін.

У 1946 годзе І. А. Крумінь у званні маёра дэмабілізаваўся з арміі. Жыў у сталіцы Латвіі горадзе Рызе. Адразу паступіў вучыцца ў Латвійскую рэспубліканскую партыйную школу (па іншых звестках у Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС). Пасля яе заканчэння быў на партыйнай і дзяржаўнай рабоце. Працаваў у апараце Цэнтральнага



**90 гадоў** таму (1935) нарадзіўся Засько Аляксандр Данілавіч (1935–?), жывапісец, майстар разьбы па дрэве, апрацоўкі рагоў і костак, роспісу па шкле, чаканкі, быў член народнага клуба «Натхненне» Сенненскага Дома рамёстваў, ураджэнец Краснадарскага краю (Расія).

**90 гадоў** таму (1935) заснаваны Аршанскі хлебазавод. З 2001 г. – філіял ААТ «Віцебскхлебпрам».

**90 гадоў** таму (1935) заснаваны «Оршабудматэрыялы» (вытворца вырабаў з ячэістага бетону) як сілікатны завод. З 1992 г. – арэнднае прадпрыемства, з 1994 г. – ААТ, з 2017 г. – філіял № 7 «Оршабудматэрыялы» ААТ «Беларускі цэментны завод».

**90 гадоў** таму (1935) заснавана Аршанская фабрыка мастацкіх вырабаў у г. Оршы як швейная арцель. З 2000 г. – РУП з сучаснай назвай. У 2021 г. увайшла ў склад Аршанскага льнокамбіната холдынгу «Беларускі лён».

**90 гадоў** таму (1935) адкрыта Віцебская абласная клінічная бальніца.

**85 гадоў** таму (1940) выяўлена радовішча пясчана-гравійнай сумесі і сілікатных пяскоў Баравое ў Глыбоцкім раёне. Дэталёва разведана ў 1969–1970 гг.

**85 гадоў** таму (1940) заснаваны Музей прыроды Бярэзінскага біясфернага запаведніка ў Лепельскім раёне.

**85 гадоў** таму (1940) утвораны Багушэўскі лясгас на тэрыторыі Сенненскага і Аршанскага раёнаў з адміністрацыйным цэнтрам у г. п. Багушэўску Сенненскага раёна.

**85 гадоў** таму (1940) заснаваны калгас імя Сталіна. Зараз – СУП «Канстанцінаў Двор».

**85 гадоў** таму (1940) заснавана КУВСГП «Гарадзец» у Шаркаўшчынскім раёне як саўгас.

**80 гадоў** таму (1945) хата-чытальня ў г. Докшыцы была перайменавана ў раённую бібліятэку.

**80 гадоў** таму (1945) нарадзіўся Жарнасек Павел Андрэевіч, мастак, ураджэнец в. Забалацце Лепельскага раёна.

**80 гадоў** таму (1945) нарадзіўся Клачкоў Валерый Паўлавіч, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, ураджэнец г. п. Ушачы.

**80 гадоў** таму (1945) нарадзілася Рабунская Ніна Фёдараўна, майстар лазапляцення, ураджэнка Краснадарскага краю (Расія). Жыве ў Віцебску.

**80 гадоў** таму (1945) заснавана «Ніць», прадпрыемства лёгкай прамысловасці. З 2004 г. – прыватнае УП грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства глухіх».

**80 гадоў** таму (1945) заснаваны Аршанскі будтрэст № 18 як будучастак № 3 Віцебскага аблбудтрэста № 18 Міністэрства жыллёвай гаспадаркі і грамадзянскага будаўніцтва БССР. З 1999 г. – ААТ з сучаснай назвай.

**80 гадоў** таму (1945) заснавана Глыбоцкая цэнтральная раённая бібліятэка ў г. Глыбокае.

**80 гадоў** таму (1945) заснаваны Млынзавод № 16 у г. Віцебску. З 2018 г. – УП «Віцебскі камбінат хлебапрадуктаў».

**80 гадоў** таму (1945) заснавана арцель «15 год БССР» у г. Полацку. З 1956 г. – Полацкая швейная фабрыка, у 1991 г. рэарганізавана ў ПГП «Мона», з1994 г.– ААТ «Мона». У 2013 г. – далучана ў якасці філіяла да ААТ «Магатэкс».

**80 гадоў** таму (1945) адкрыта Полацкая абласная бібліятэка. У 1954 г. рэарганізавана ў Полацкую цэнтральную гарадскую бібліятэку. Зараз – бібліятэка імя Алеся Савіцкага – філіял № 9 ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

**75 гадоў** таму (1950) заснавана сельскагаспадарчая арцель імя Леніна ў Дубровенскім раёне. Зараз – ААТ «Усход-Чырына».

**75 гадоў** таму (1950) нарадзіўся Скрыпнікаў Юрый Аляксандравіч, майстар разьбы па дрэве, вырабе разных абразоў, ураджэнец г. Назарава Краснаярскага краю (Расія). Жыве ў Віцебску.

**75 гадоў** таму (1950) нарадзілася Пашкевіч Валянціна Аляксандраўна, майстар лазапляцення, ураджэнка г. п. Обаль Шумілінскага раёна. Жыве ў Віцебску.

**75 гадоў** таму (1950) нарадзіўся Нікіценка Мікалай Мікалаевіч (1950–2011), мастак, ураджэнец Краснадарскага краю (Расія). Жыў у г. п. Ветрына Полацкага раёна.



https://citytlt.narod.ru/lichherojilin.htm. – Дата доступа: 30.09.2024.

4. **Мельник, С. Г.** Улицы памяти / С. Г. Мельник. – 2-е изд., перераб. и доп. – Тольятти : Фонд «Духовное наследие», 2005. – С. 50–57.

5. **Трижды** раненый остаётся в строю // Подвиг во имя Родины: очерки / редкол.: С. С. Барсуков [и др.]. – Куйбышев : Куйбышевское книжное издательство, 1965. – С. 151–152.

## Верасень



### КРУМІНЬ (КРУМІН) ІВАН АНДРЭЕВІЧ

*110 год з дня нараджэння*

*(1915)*

**Крумінь (Крумін) Іван Андрэевіч** (1915–2003) – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

Нарадзіўся 13 (26) верасня 1915 года ў г. Гарадок у сялянскай сям'і. Рана страціў бацькоў. Выхоўваўся ў дзіцячым доме. Пасля заканчэння школы сялянскай моладзі ў 1930 годзе паступіў у Віцебскі кааператыўны тэхнікум. Пасля яго заканчэння ў 1934 годзе, працаваў бухгалтарам на аптовай базе у г. Тэрмез (Узбекістан).

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, добраахвотнікам уступіў

Пасля заканчэння вайны В. І. Жылін дэмабілізаваўся па хваробе, з-за туберкулёзу, вярнуўся ў г. Стаўрапаль (цяпер г. Тальяці), куды пераехала яго маці. Працаваў у аддзеле фізкультуры і спорту райвыканкама, прымаў актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці горада. Быў членам райкама камсамола. Па ўспамінах таварышаў па службе, яму было цяжка працаваць па стане здароўя, калегі як маглі абярагалі хворага Героя вайны. У 1946 годзе В. І. Жылін праходзіў лячэнне ад туберкулёзу ў санаторыі «Лясное».

Памёр Васіль Іванавіч Жылін 24 ліпеня 1947 года ад туберкулёзу ў г. Тальяці. Быў пахаваны з вайсковымі ўшанаваннямі. Пры пашырэнні горада магіла была перанесена на Баныкінскія могілкі, дзе быў усталяваны надмагільны помнік.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, двума медалямі «За адвагу». За гераізм у баях пад Віцебскам і Шаўляем быў удастоены Падзяк Вярхоўнага галоўнакамандуючага.

У 1958 годзе, да 40-годдзя камсамола, імем Васіля Іванавіча Жыліна назвалі Клінічную вуліцу Цэнтральнага раёна Тальяці, а ў маі 1985 года быў устаноўлены памятны знак-паказальнік вуліцы ў выглядзе чырвонай зоркі. У Тальяці на плошчы Свабоды, на абеліску, знаходзіцца барэльеф Васіля Жыліна. А на радзіме В. І. Жыліна, у с. Верхнія Белазеркі, усталяваны бюст Героя.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Жилин** Василий Иванович // Герои Советского Союза: краткий биографический словарь / А. А. Бабаков [и др.] ; ред. И. Н. Шкадов. – Москва : Военное издательство, 1987. – Т. 1 : Абаев–Любичев. – С. 503–504.

2. **Жилин** Василий Иванович // Ставрополь: фронт и судьбы : сборник очерков / авт.- сост. Н. Г. Лобанова. –Тольятти : Атриум, 2000. – С. 17.

3. **Исторические** личности. Василий Жилин [Электронный ресурс] // Имена на карте города Тольятти. – Режим доступа:



**75 гадоў** таму (1950) заснаваны «Прудзінкі» як калектыўнае сельскагаспадарчае прадпрыемства «Кастрычнік» у Верхнядзвінскім раёне, з 2003 – СВК з сучаснай назвай, зараз – ААТ.

**75 гадоў** таму (1950) заснавана ААТ «За Радзіму» ў Глыбоцкім раёне як калгас. Зараз – сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства.

**75 гадоў** таму (1950) заснаваны СВК «Іванскі» ў Чашніцкім раёне як калгас імя Жданава. Зараз – ААТ «Іванскі – Агра».

**75 гадоў** таму (1950) заснаваны СВК «Хацілы» як калгас імя Мічурына ў Пастаўскім раёне. Зараз – ААТ «Хацілы–Агра».

**70 гадоў** таму (1955) выяўлена Крулеўшчынскае радовішча пясчана-жвіровага матэрыялу за 5 км да паўночнага захаду ад в. Крулеўшчына Докшыцкага раёна.

**70 гадоў** таму (1955) нарадзіўся Цімафееў Васіль Карлавіч, жывапісец, ураджэнец в. Звянячы Талачынскага раёна.

**70 гадоў** таму (1955) нарадзіўся Гаруноў Уладзімір Ігаравіч, майстар па вырабах з бяросты, ураджэнец г. Віцебска.

**70 гадоў** таму (1955) заснаваны калгас «Маяк» у Браслаўскім раёне на базе калгасаў «Чырвоная зорка» і імя Кутузава. З 2003 г. – СВК «Маяк Браслаўскі».

**70 гадоў** таму (1955) заснаваны калгас імя Дзяржынскага на базе 6 калгасаў у Талачынскім раёне. З 2003 г. – СВК «Абольцы», зараз – ААТ.

**70 гадоў** таму (1955) заснаваны Аршанскі камбінат хлебапрадуктаў. З 1996 г. – ААТ з сучаснай назвай.

**70 гадоў** таму (1955) заснаваны «Оршасырзавод» як завод плаўленых сыроў на базе Аршанскай маслабазы. З 1997 г. – ААТ, з 2018 г. – ДВУП «ОршаСырЗавод».

**70 гадоў** таму (1955) заснаваны Віцебскі дзяржаўны тэхнічны каледж, як вячэрні тэхнікум лёгкай прамысловасці на базе швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» і дыванова-плюшавага камбіната.

**70 гадоў** таму (1955) выяўлены курганны могільнік крывічоў Зашчырна, археалагічны помнік у в. Зашчырна Верхнядзвінскага раёна.

**70 гадоў** таму (1955) заснавана Докшыцкае раённае радыё ў г. Докшыцы. Зараз – установа «Рэдакцыя газеты «Родныя вытокі» і праграмы радыёвяшчання Докшыцкага раёна».

**65 гадоў** таму (1960) пачала дзейнічаць Віцебская абласная інспекцыя па ахове прыроды. З 1996 г. – Камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

**65 гадоў** таму (1960) заснавана камунальнае ўнітарнае вытворчае сельскагаспадарчае прадпрыемства «Каханавічы» ў Верхнядзвінскім раёне.

**65 гадоў** таму (1960) створаны народны жаночы хор «Беразіначка» ў в. Домжарыцы Лепельскага раёна пры сельскім Доме культуры. Зараз дзейнічае пры філіяле «Дзіцячая школа мастацтваў Домжарыцы»

**65 гадоў** таму (1960) заснаваны Віцебскі завод трактарных запасных частак. Зараз – ААТ.

**65 гадоў** таму (1960) утвораны Казьянскі дзяржаўны паляўнічы заказнік рэспубліканскага значэння. На яго базе 11.11.1999 г. створаны Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Казьянскі».

**60 гадоў** таму (1965) нарадзілася Кавальчук Святлана Аляксандраўна, мастак роспісу па дрэве, ураджэнка в. Папялевічы Полацкага раёна.

**60 гадоў** таму (1965) адкрыўся корпус завадскога прафілакторыя нафтаперапрацоўчага прадпрыемства «Нафтан» у г. Наваполацку, з 1980 г. – санаторый «Нафтан».

**60 гадоў** таму (1965) знойдзены Гараўлянскія манетна-рэчавыя скарбы каля в. Гараўляны Глыбоцкага раёна.

**60 гадоў** таму (1965) выяўлены Экімань-1, археалагічны помнік – курганны могільнік ля в. Экімань 1 Полацкага раёна.

**60 гадоў** таму (1965) заснаваны КУСП «Чашніцкае» як калгас «Чашніцкі»з цэнтрам у в. В. Альшанка. З 2010 г. у складзе ААТ «Вядрэнскае-Агра».



застаў пачатак Вялікай Айчыннай вайны. У снежні 1941 года быў прызваны ў Чырвоную армію. З 2 лютага 1942 года на фронце, служыў на батарэі 120 мм мінамётаў 872 стралковага палка 282 стралковай дывізіі. Ваяваў на Паўночна-Заходнім, Калінінскім і Прыбалтыйскім франтах. Удзельнічаў у Дзямянскай аперацыі пад Старой Русай, у напружаных баях у раёне Вялікіх Лук, Невеля. 3 верасня 1943 года быў паранены.

У 1944 годзе гвардыі старшына стралковай роты 199-га гвардзейскага палка 67-й гвардзейскай стралковай дывізіі 6-й гвардзейскай арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту Васіль Жылін са сваёй ротай пад артылерыйскім агнём праціўніка першым пераадолеў водны рубеж пры фарсіраванні Заходняй Дзвіны ў раёне вёскі Буі Бешанковіцкага раёна. Захапіў і ўтрымліваў плацдарм, адбіўшы пяць контратак праціўніка, у рукапашным баі і гранатамі знішчыў больш за тры дзясяткі гітлераўцаў. У данясенні камандзір палка гвардыі падпалкоўнік Дзегцяроў пісаў: «У гэтым баі таварыш Жылін, будучы тройчы паранены, працягваў заставацца ў страі. Пяць разоў падымаў ён байцоў у атаку, ідучы сам наперадзе з крыкамі «Ура! За Радзіму!». А калі скончыліся патроны, гранатамі і прыкладам знішчыў 30 гітлераўцаў. У момант адбіцця адной з контратак, ён злавіў на ляту кінутую немцам гранату і кінуў яе назад. Разарваўшыся, яна знішчыла 5 гітлераўцаў. Дастойны прысваення звання Герой Савецкага Саюза». Праз тры месяцы свой подпіс на дакуменце паставіў камандуючы войскамі 1-га Прыбалтыйскага фронту генерал арміі І. Баграмян. Пасля гэтага бою і лячэння ў шпіталі Васіль Жылін вярнуўся ў сваю гвардзейскую часць. У далейшых баях быў яшчэ двойчы паранены: 11 жніўня і 11 лістапада 1944 года.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 года за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і выяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм гвардыі старшыне Жыліну Васілю Іванавічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

# Жнівень



**ЖЫЛІН**

**ВАСІЛЬ ІВАНАВІЧ**

*110 год з дня нараджэння*

*(1915)*

**Жылін Васіль Іванавіч** (1915–1947) – удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза.

Нарадзіўся 7 (20) жніўня 1915 года ў с. Верхнія Белазёркі Самарскай губерні (зараз Стаўрапольскі раён Самарскай вобласці, Расія) у сялянскай сям'і.

Рана застаўся без бацькі, браты і сёстры памерлі падчас голаду 1921–1922 гадоў. Жыў з маці Марфай Васілеўнай вельмі бедна. У 1921 годзе быў адпраўлены ў дзіцячы дом у валасное сяло. А з 14 гадоў ён разам з маці пачаў працаваць у калгасе імя Калініна. Актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці. Быў памочнікам сакратара мясцовай камсамольскай ячэйкі. Па пуцёўцы камсамола ў 1933 годзе Васіль Жылін накіраваны ў г. Яраслаўль на будаўніцтва каўчукавага камбіната. У 1937 годзе быў прызваны ў Чырвоную армію. Скончыў палкавую школу малодшага камандзірскага саставу ў званні старшыны. У 1939 годзе ўдзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі, а затым – у савецка-фінляндскай вайне 1939–1940 гадоў.

Дэмабілізаваўшыся, працаваў на Омскім шынным заводзе, дзе яго



**60 гадоў** таму (1965) заснаваны Чашніцкі дарожна-эксплуатацыйны ўчастак № 183. Зараз – КУП «Чашніцкае дарожнае рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 183».

**60 гадоў** таму (1965) заснавана Докшыцкае дарожнае рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 180 як дарожна-эксплуатацыйны ўчастак № 180. Зараз – філіял КУП «Віцебскаблдарбуд».

**55 гадоў** таму (1970) заснавана «Лявонішына», сельскагаспадарчае прадпрыемства ў Верхнядзвінскім раёне. З 2002 г. КУВСГП з сучаснай назвай.

**55 гадоў** таму (1970) адкрылася «Янова», база адпачынку ААТ «Будаўніча-мантажны трэст № 16» у Полацкім раёне. Зараз – структурнае падраздзяленне Наваполацкага КУП «Жыллёва-рамонтная эксплуатацыйная арганізацыя».

**55 гадоў** таму (1970) створаны «Камарыкі», узорны вакальна-харэаграфічны ансамбль у г. Наваполацку пры Палацы культуры ААТ «Нафтан». У 1972 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў», у 2017 г. – званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

**55 гадоў** таму (1970) заснаваны саўгас «Машканы», з 1981 г. – саўгас імя П. М. Машэрава, у 2001 г. пераўтвораны ў РУСП, з 2013 г. – КУСП «Саўгас імя Машэрава» адкрытага акцыянернага таварыства «Віцебскі мясакамбінат», з 2018 г. – дзяржаўнае прадпрыемства КСУП «Саўгас імя Машэрава».

**55 гадоў** таму (1970) быў адкрыты Расонскі раённы дом культуры. Зараз – Расонскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці.

**55 гадоў** таму (1970) была адкрыта база адпачынку «Суя» РУП ВА «Палімір» у Полацкім раёне.

**55 гадоў** таму (1970) створаны ўзорны хор хлопчыкаў «Віцьбічы» ў г. Віцебску пры абласным Палацы піянераў і школьнікаў. З 1974 г. дзейнічае пры СШ № 33 г. Віцебска імя І. Д. Чарняхоўскага.

**50 гадоў** таму (1975) створана Віцебская абласная школа вышэйшага спартыўнага майстэрства, вучэбна-спартыўная ўстанова. У 2014 г. перайменавана ў спецыялізаваную ВСУ «Віцебскі абласны комплексны цэнтр алімпійскага рэзерву».

**50 гадоў** таму (1975) Бешанковіцкая цэнтральная раённая бібліятэка набыла статус раённай.

**50 гадоў** таму (1975) бібліятэка імя М. Горкага ў Віцебску атрымала статус цэнтральнай бібліятэкі. Зараз – Віцебская цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага.

**50 гадоў** таму (1975) заснаваны завод «Этон» у г. Новалукомлі Чашніцкага раёна як філіял Віцебскага завода тэхналагічнага абсталявання для вытворчасці камплектуючых і гатовых вырабаў для патрэбаў ваенна-прамысловага комплексу. З 1997 – ААТ «Завод «Этон», прадпрыемства па вытворчасці энергазберагальнага абсталявання і сантэхнікі.

**50 гадоў** таму (1975) створаны народны клуб народных майстроў пры аддзеле гарвыканкама г. Оршы. Зараз працуе ў складзе гарадскога Дома рамёстваў.

**50 гадоў** таму (1975) быў адкрыты санаторый-прафілакторый «Жалязнякі» ААТ «Даламіт», з 2015 г. – рэабілітацыйны цэнтр (філіял) Віцебскага абласнога клінічнага кардыялагічнага цэнтра.

**50 гадоў** таму (1975) створана Глыбоцкая ПМК-46 у в. Шунеўцы Глыбоцкага раёна. Зараз – КДУМП «Глыбоцкая ПМК меліявадгас».

**50 гадоў** таму (1975) заснаваны калгас «XXV партз'езд» у Пастаўскім раёне. Зараз – КУСП «Дуніловічы-Агра».

**45 гадоў** таму (1980) заснавана меліярацыйнае ўпраўленне арашальных і асушальных сістэм у г. Чашнікі. Зараз –КДУП меліярацыйных сістэм «Чашніцкае ПМС».

**45 гадоў** таму (1980) створаны народны вакальна-інструментальны ансамбль «Мара» ў в. Ноўка Віцебскага раёна пры раённым Доме культуры.

**45 гадоў** таму (1980) створаны народны аркестр народных інструментаў у г. п. Бешанковічы пры раённым Доме культуры.

**45 гадоў** таму (1980) заснаваны Дом-музей Петруся Броўкі ў в. Пуцілкавічы Ушацкага раёна, філіял Літаратурнага музея Петруся Броўкі.

**45 гадоў** таму (1980) заснаваны завод па вытворчасці камплектаў вучэбнага абсталявання па чарчэнні і маляванні ў г. Паставы. Зараз – ААТ «Паставымэбля».



Т. 6. – Кн. 1 : Пузэлі–Усая. – С. 109.

5. **Королев** Павел Михайлович // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси / склад.: В. Ц. Осіпаў [і інш.] ; рэдкал.: А. В. Праляскоўскі, Л. У. Языковіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – С. 496**.**

6. **Королев** Павел Михайлович // Городокский край = Гарадоцкі край = Gorodok district : фотоальбом / сост.: С. В. Мозжарова, Н. В. Малеша ; авторы текста: А. И. Григорьева [и др.] ; фото: Ю. В. Рудякова, А. П. Дрибас. – Минск : Беларусь, 2023. – С. 47.

7. **Королев** Павел Михайлович // Навечно в сердце народном / редкол.: И. П. Шамякин [и др.]. – 3-е изд., доп. и испр. – Минск : БелСЭ им. П. Бровки, 1984. – С. 257–258.

8. **Королев** Павел Михайлович // Неман. – 1967. – № 3. – С. 22.

9. **Королёв** Павел Михайлович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 516.

10. **Королёв** Павел Михайлович // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2007. – Т. 4 : Картография–Миноговые. – С. 225.

11. **Королев** Павел Михайлович // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная типография, 2009. – С. 70.

12. **Королёв** Павел Михайлович // Твои сыновья, Беларусь! Кавалеры ордена Славы : биографический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2014. – С. 76.

13. **Кравцова, Е.** Мы гордимся героями-земляками! / Е. Кравцова // Гарадоцкі веснік. – 2020. – 19 чэрв. – С. 4, 6.

14. **Мешков, О**. Подвиг совершённый на чужбине / О. Мешков // Гарадоцкі веснік. – 2004. – 27 лістап. – С. 2.

акружыў назіральны пункт. Капітан Каралёў арганізаваў яго абарону і выклікаў агонь сваёй артылерыі на сябе. У гэты дзень разлікі гармат адбілі 14 варожых атак і адстаялі плацдарм.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 27 чэрвеня 1945 года за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм капітану Каралёву Паўлу Міхайлавічу было прысвоена званне Герой Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

Пасля вайны П. М. Каралёў працягваў ваенную службу. У 1947 годзе ён скончыў Вышэйшую афіцэрскую артылерыйскую школу ў Ленінградзе. З 1957 года маёр Каралёў быў звольнены ў запас. Жыў у г. Вінніца. Працаваў старшым інструктарам Вінніцкага абласнога камітэта ДТСААФ.

Памёр Павел Міхайлавіч Каралёў 1 сакавіка 1998 года. Пахаваны на Цэнтральных могілках у Вінніцы.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны І, ІІ ступеняў, Чырвонай Зоркі (двойчы), медалямі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Каралёў** Павел Міхайлавіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1972. – Т. V : Зуйкі–Кішы. – С. 428.

2. **Каралёў** Павел Міхайлавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 8 : Канто–Кулі. – С. 51.

3. **Каралёў** Павел Міхайлавіч // Памяць: Гарадоцкі раённ: гісторыка-дакументальныяя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэд. кал. Н. А. Бурунова [і інш.] ; укл. С. І. Садоўская ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Беларусь, 2004. – С. 410.

4. **Каралёў** Павел Міхайлавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2001. –



**45 гадоў** таму (1980) быў адкрыты раённы Дом культуры ў г. Полацку як Палац культуры будаўнікоў аб'яднання «Полацксельбуд». Зараз – ДУК «Полацкі раённы Цэнтр культуры».

**45 гадоў** таму (1980) была адкрыта база адпачынку «Суя» Наваполацкага РУП па транспарце нафты «Дружба» ў Полацкім раёне (з 2019 г. – філіяла ААТ «Гомельтранснафта Дружба»). У 2021 г. перададзена ў бязвыплатнае карыстанне Спаса-Еўфрасіннеўскаму жаночаму манастыру ў г. Полацку.

**45 гадоў** таму (1980) створаны ўзорны духавы аркестр пры СШ № 33 г. Віцебска імя І. Д. Чарняхоўскага.

**45 гадоў** таму (1980) створаны Віцебскі ўзорны хор дзяўчынак «Вяснянка» пры СШ № 33 г. Віцебска імя І. Д. Чарняхоўскага.

**40 гадоў** таму (1985) створана лялечная трупа пры Беларускім тэатры імя Я. Коласа ў г. Віцебску. Зараз – Беларускі тэатр «Лялька».

**40 гадоў** таму (1985) заснаваны народны фальклорны калектыў «Крыніца» Чурылаўскага сельскага дома культуры, зараз дзейнічае пры Бачэйкаўскім СДК Бешанковіцкага раёна.

**40 гадоў** таму (1985) створаны народны клуб народных майстроў і аматарскіх мастакоў «Вытокі» пры Гарадоцкім раённым краязнаўчым музеі.

**40 гадоў** таму (1985) створаны народны аркестр народных інструментаў пры Верхнядзвінскай дзіцячай школе мастацтваў.

**40 гадоў** таму (1985) створаны народны клуб «Ветэран» пры Верхнядзвінскім раённым доме культуры.

**40 гадоў** таму (1985) створаны народны клуб «Ветэран» пры Бешанковіцкім раённым цэнтры культуры.

**40 гадоў** таму (1985) створаны народны хор ветэранаў вайны і працы ў г. Оршы пры гарадскім Доме культуры. Зараз дзейнічае пры гарадскім Палацы культуры «Орша» ці пры Аршанскім гарадскім цэнтры культуры «Перамога».

**40 гадоў** таму (1985) створаны ўзорны аркестр баяністаў у г. Оршы пры Дзіцячай школе мастацтваў № 1.

**40 гадоў** таму (1985) створаны народны клуб ветэранаў вайны і працы «Маналіт» у г. Глыбокае пры раённым Доме культуры.

**40 гадоў** таму (1985) заснавана Віцебская абласная спартыўная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву прафсаюзаў па веласпорце «Вікторыя».

**40 гадоў** таму (1985) быў заснаваны Талачынскі гісторыка-краязнаўчы музей.

**40 гадоў** таму (1985) створаны народны кінаклуб «Дыялог» у г. Віцебску пры кінатэатры «Спартак» (з 2007 г. – пры музеі «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва»).

**35 гадоў** таму (1990) заснавана навукова-вытворчая фірма «Дыполь» у г. Віцебску, займаецца вытворчасцю прыбораў начнога бачання.

**35 гадоў** таму (1990) да Віцебскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансера быў далучаны Віцебскі абласны наркалагічны дыспансер.

**35 гадоў** таму (1990) лялечная трупа пры Беларускім тэатры імя Я. Коласа стала самастойным калектывам. Зараз – Беларускі тэатр «Лялька».

**35 гадоў** таму (1990) створаны Цэнтр алімпійскага рэзерву па конным спорце і конегадоўлі ў г. Барані Аршанскага раёна на базе конна-спартыўнай школы РУП «Лёс». З 2006 г. – ДСВСУ «Віцебскі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па конным спорце і конегадоўлі»/

**35 гадоў** таму (1990) уведзены ў эксплуатацыю Наваполацкі хлебазавод, філіял ААТ «Віцебскхлебпрам».

**35 гадоў** таму (1990) заснаваны народны фальклорны калектыў «Прасніца» Іванскага дома фальклору – філіяла цэнтралізаванай клубнай сістэмы Чашніцкага раёна.

**35 гадоў** таму (1990) створаны народны ансамбль народнай песні «Раніца» ў в. Ноўка пры Віцебскім раённым доме культуры.

**35 гадоў** таму (1990) створаны народны гурт «Тэатр» у в. Ноўка пры Віцебскім раённым доме культуры.



# *Ліпень*



**КАРАЛЁЎ**

**ПАВЕЛ МІХАЙЛАВІЧ**

*110 год з дня нараджэння*

*(1915)*

**Каралёў Павел Міхайлавіч** (1915–1998) – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

Нарадзіўся 16 (29) ліпеня 1915 года ў в. Крыцкія Полацкага павета Віцебскай губерні (цяпер у Гарадоцкім раёне) у сялянскай сям'і. Пасля заканчэння 7 класаў, працаваў у калгасе, потым на Ленінградскім паравозабудаўнічым заводзе.

У 1936–1939 гадах служыў у Чырвонай арміі. Удзельнічаў у вызваленчым паходзе савецкіх войск у Заходнюю Беларусь у 1939 годзе. У гады Вялікай Айчыннай вайны з лістапада 1941 года ваяваў на Заходнім, Бранскім, 1-м Украінскім франтах. У 1942 годзе скончыў армейскія курсы малодшых лейтэнантаў.

Камандзір батарэі 528-га гарматнага артылерыйскага палка капітан Каралёў асабліва вызначыўся ў баях па ўтрыманні і пашырэнні плацдарма на левым беразе р. Одэр у раёне г. Олау (Польша). З 27 студзеня па 4 лютага воіны-артылерысты адбілі 11 контратак праціўніка і нанеслі яму значны ўрон у баявой тэхніцы і жывой сіле. 5 лютага вораг падцягнуў рэзервы, пацясніў стралковыя падраздзяленні і

удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза. Таксама пасмяротна быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

У горадзе Рубцоўску (Кемераўская вобласць, Расія) у гонар У. С. Рублеўскага названа вуліца (зав. Кароткі ў 1967 г. перайменаваны ў зав. Рублеўскага). На будынку лакаматыўнага дэпо ў 1961 г. змешчана мемарыяльная дошка з надпісам «Тут працаваў у 1942 г. Герой Савецкага Саюза Рублеўскі У. С.», а ў 1974 г. у скверы Камсамольскай славы ўсталяваны бюст героя. У г. п. Ветрына Полацкага раёна Віцебскай вобласці на брацкай магіле ўсталяваны памятны знак з яго імем.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Рублевский** Владимир Степанович // Боевая слава Алтая : очерки / сост.: М. Т. Карначев, Ф. П. Ельков. – 3-е изд., испр. и доп. – Барнаул : Алт. кн. изд-во, 1978. – С. 214. – (Герои Советского Союза – наши земляки).

2. **Рублевский** Владимир Степанович // Герои Советского Союза: краткий биографический словарь / А. А. Бабаков [и др.] ; ред. И. Н. Шкадов. – Москва : Военное издательство, 1988. – Т. 2 : Любов–Ящук. – С. 376.

3. **Рублевский** Владимир Степанович // Навечно в сердце народном / редкол.: И. П. Шамякин [и др.]. – 3-е изд., доп. и испр. – Минск : БелСЭ им. П. Бровки, 1984. – С. 444.

4. **Рублевский** Владимир Степанович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 421.

5. **Рублеўскі** Уладзімір Сцяпанавіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1973. – Т. IX : Рабкор–Сочы. – С. 162.

6. **Сопікава, В.** У баях за Траецкае / В. Сопікава // Новая газета (Наваполацк). – 2010. – 27 сак. – С. 3.

7. **Трапезникова, Е.** За будущий Новополоцк / Е. Трапезникова // Витьбичи. – 2014. – 24 мая. – С. 11.



**35 гадоў** таму (1990) створаны народны ансамбль народнай песні «Весялуха» ў г. п. Бешанковічы пры раённым Доме культуры.

**35 гадоў** таму (1990) заснаваны народны фальклорны ансамбль «Вясёлыя музыкі» пры Сенненскім раённым доме культуры.

**35 гадоў** таму (1990) заснаваны завод «Белэкс» у г. п. Коханава Талачынскага раёна. З 1997 г. – ААТ «Коханаўскі экскаватарны завод», з 2014 г. – «Амкадор-КЭЗ».

**35 гадоў** таму (1990) быў адкрыты гасцінічны комплекс «Ветразь» турысцка-экскурсійнага даччынага прадпрыемства УП «Віцебсктурыст» у г. Віцебску.

**35 гадоў** таму (1990) створаны тэатр-студыя «Спонайд» у Полацкім гарадскім доме культуры. Зараз – тэатр танца «Прэм'ер-Спонайд».

**35 гадоў** таму (1990) заснаваны Полацкі раённы метадычны цэнтр народнай творчасці і культпрасветработы.

**35 гадоў** таму (1990) створана мастацкае аб'яднанне «Аршыца» ў г. Оршы.

**35 гадоў** таму (1990) створаны ўзорны тэатр пластычнай мініяцюры «Эстрадная мазаіка» ў г. Віцебску пры СШ № 39 (з 2010 г. – Гімназія № 7) як харэаграфічы калектыў.

**35 гадоў** таму (1990) створаны народны тэатр моды «Стыль» у г. Віцебску пры ПТВ № 19 бытавога абслугоўвання насельніцтва. (зараз – пры Віцебскім дзяржаўным індустрыяльна-тэхналагічным каледжы).

**35 гадоў** таму (1990) створаны Абласны савет на базе прафсаюзнага камітэта РУП «Віцебскэнерга» ў г. Віцебску. Зараз – Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў энергетыкі, электратэхнічнай і паліўнай прамысловасці.

**30 гадоў** таму (1995) Шабашоў Сяргей Міхайлавіч (1923–2007), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, грамадскі дзеяч, атрымаў званне «Ганаровы грамадзянін г. Віцебска».

**30 гадоў** таму (1995) заснаваны Бешанковіцкі раённы дом рамёстваў.

**30 гадоў** таму (1995) пачаў выдавацца ў г. Віцебску навукова-тэарэтычны часопіс «Вестник Витебского государственного технологического университета».

**30 гадоў** таму (1995) адкрыўся раённы Дом рамёстваў у г. п. Лёзна.

**30 гадоў** таму (1995) пачаў выдавацца навукова-практычны часопіс «Новости хирургии» ў г. Віцебску.

**30 гадоў** таму (1995) пачала праводзіцца штогадовая дзіцячая выстава-конкурс «Перспектыва» ў г. Віцебску. З 1997 г. з'яўляецца міжнароднай.

**30 гадоў** таму (1995) заснавана ЗАТ «Пажтэхніка» ў г. Віцебску як прадпрыемства па вытворчасці супрацьпажарнага абсталявання.

**30 гадоў** таму (1995) створана «Віцебская акварэль», творчае аб'яднанне беларускіх мастакоў, якія працуюць у розных накірунках у тэхніцы акварэлі.

**30 гадоў** таму (1995) заснаваны народны фальклорны гурт «Кудзеліца» Дубровенскага раённага цэнтра народнай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці.

**30 гадоў** таму (1995) створаны народны клуб народных майстроў «Скарбонка» ў г. п. Бешанковічы пры раённым Доме рамёстваў.

**30 гадоў** таму (1995) заснаваны народны фальклорны ансамбль «Вечарынка» арганізацыйна-метадычнага цэнтра аддзела культуры Сенненскага райвыканкама. Зараз дзейнічае пры Сенненскім раённым цэнтры культуры і народнай творчасці.

**30 гадоў** таму (1995) створаны народны клуб сельскай інтэлігенцыі «Натхненне» ў в. Дабрамыслі Лёзненскага раёна, зараз дзейнічае пры філіяле «Дом культуры аграгарадка Дабрамыслі».

**30 гадоў** таму (1995) заснаваны Чашніцкі раённы дом рамёстваў.

**30 гадоў** таму (1995) было заснавана КУП «Паўночны» ў в. Пальмінка Гарадоцкага раёна.

**30 гадоў** таму (1995) створаны ўзорны харэаграфічны калектыў «Крынічка» ў г. п. Руба Віцебскага раёна пры Палацы культуры і тэхнікі ВА «Даламіт». З 2003 г. дзейнічае пры Палацы культуры «Руба».



транспарту, па ўласным жаданні прызваны на службу ў Чырвоную армію. З красавіка таго ж года – на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Летам 1944 года гвардыі старшы сяржант Уладзімір Рублеўскі камандаваў кулямётным разлікам 201-га гвардзейскага стралковага палка 67-й гвардзейскай стралковай дывізіі 6-й гвардзейскай арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту. Вызначыўся ў Беларускай наступальнай аперацыі «Багратыён» пры вызваленні Віцебскай вобласці.

22 чэрвеня пры прарыве абароны праціўніка ў раёне населеных пунктаў Рацькава – Арэхі Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці, знаходзячыся са сваім станковым кулямётам у баявых парадках стралковага падраздзялення, гвардыі сяржант У. С. Рублеўскі кулямётным агнём расчышчаў шляхі для пяхоты. У гэтым баі ён знішчыў 9 гітлераўцаў. Далейшаму руху наперад замінала мінамётная батарэя праціўніка. Для яе знішчэння група байцоў пад камандаваннем У. С. Рублеўскага непрыкметна падышла да батарэі і раптоўна агнём з аўтаматаў знішчыла 13 гітлераўцаў. Шлях для далейшага наступу нашай пяхоты быў расчышчаны.

24 чэрвеня 1944 года разлік Рублеўскага ў складзе штурмавога атрада ў ліку першых пераправіўся праз Заходнюю Дзвіну ў раёне вёскі Узрэчча Бешанковіцкага раёна, і прыняў актыўны ўдзел у баях за захоп, утрыманне і пашырэнне плацдарма на яе заходнім беразе. Але 3 ліпеня 1944 года ў раёне вёскі Траецкае Ветрынскага раёна (цяпер Полацкі раён) праціўнік перайшоў у контратаку. Гвардыі сяржант У. С. Рублеўскі, заняўшы выгодную пазіцыю, са свайго кулямёта вёў агонь па контратакуючай пяхоце праціўніка. Працягваў весці бой, і калі застаўся адзін. Знішчыў 19 гітлераўцаў і сам быў смяротна паранены.

Першапачаткова яго пахавалі ў брацкай магіле ў в. Траецкае. Потым перапахавалі ў брацкай магіле ў г. п. Ветрына Полацкага раёна.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 года гвардыі старшы сяржант Уладзімір Сцяпанавіч Рублеўскі за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і праяўленую пры гэтым адвагу пасмяротна быў

11. **Янушкоўскі Іван Іванавіч** // Імёны, асобы, лёсы: ураджэнцы Віцебшчыны ў далёкім і блізкім замежжы / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2012. – С. 323.

12. **Янушкоўскі Іван Іванавіч** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2003. – Т. 6. – Кн. 2 : Усвея–Яшын. – С. 300.

## *Чэрвень*



### РУБЛЕЎСКІ УЛАДЗІМІР СЦЯПАНАВІЧ

*100 год з дня нараджэння*

*(1925)*

**Рублеўскі Уладзімір Сцяпанавіч** (1925–1944) – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

Нарадзіўся ў 1925 годзе на станцыі Топкі (цяпер – горад у Кемераўскай вобласці, Расія) у сям'і рабочага-чыгуначніка. Хутка сям'я Рублеўскіх пераехала на станцыю Інскую, затым у горад Рубцоўск Алтайскага краю. У 1939 годзе пасля заканчэння шасці класаў Рубцоўскай школы № 112 для дзяцей чыгуначнікаў Уладзімір Рублеўскі паступіў у Барнавульскае чыгуначнае вучылішча. З 1942 года працаваў памочнікам машыніста паравоза ў г. Рубцоўску. У студзені 1943 года ён, нягледзячы на тое, што меў браню ад прызыву ў войска як работнік чыгуначнага



**30 гадоў** таму (1995) створаны ўзорны тэатр «Вясёлка» ў г. Віцебску пры Палацы культуры чыгуначнікаў.

**25 гадоў** таму (2000) створаны народны ансамбль гарманістаў «Гарадоцкія музыкі» ў г. Гарадку, зараз дзейнічае пры Цэнтры традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна.

**25 гадоў** таму (2000) аэрапорт «Віцебск» увайшоў у склад дзяржаўнага прадпрыемства па аэранавігацыйным абслугоўванні паветранага руху «Белаэранавігацыя».

**25 гадоў** таму (2000) створана народнае аматарскае аб'яднанне «Надзея» ў г. п. Руба пры Палацы культуры.

**25 гадоў** таму (2000) пачаў выдавацца царкоўна-рэлігійны часопіс «Віцебскія епархіяльныя ведамасці».

**25 гадоў** таму (2000) быў адкрыты раённы Цэнтр рамёстваў у г. Полацку. Зараз – Полацкі раённы цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур.

**5 гадоў** таму (2000) створаны народны ансамбль народнай песні «Заманіха» ў г. Полацку. Зараз дзейнічае пры Полацкім раённым цэнтры культуры.

**25 гадоў** таму (2000) створаны ўзорны фальклорны калектыў «Папараць-кветка» ў г. Віцебску пры СШ № 25.

**25 гадоў** таму (2000) створаны ўзорны фальклорны гурт «Вытокі» ў г. Віцебску пры СШ № 10.

**25 гадоў** таму (2000) утвораны хор «Ave Maria» касцёла Святой Тройцы г. Глыбокае.

**20 гадоў** таму (2005) заснавана ТАА «Пансіянат «Лодэ» ў Лепельскім раёне.

**20 гадоў** таму (2005) быў адкрыты Расонскі раённы дом рамёстваў.

**20 гадоў** таму (2005) народнаму літаратурнаму аб'яднанню «Полоцкая ветвь» прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

# Студзень

**1 студзеня** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Хоміч-Мірзаян Леанід Сяргеевіч, беларускі мастак, ураджэнец г. Нова-Барысаў Мінскай вобласці. Жыве ў Віцебску.

**1 студзеня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Андарала Аляксандр Іванавіч, беларускі вучоны-педагог, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. З 1983 г. працуе ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка. Ураджэнец в. Валасатка Докшыцкага раёна.

**3 студзеня** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Дашкевіч Віктар Мікалаевіч (1945–2020), вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства культуры «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», медалём Францыска Скарыны. Ураджэнец в. Вяцічераўка Чашніцкага раёна.

**3 студзеня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Шыёнак Аляксандр Сяргеевіч, мастак-акварэліст, член Беларускага саюза мастакоў, ураджэнец в. Каўлякі Бешанковіцкага раёна.

**3 студзеня** – 25 гадоў таму (2000) заснаваны ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Асвейскі» ў Верхнядзвінскім раёне.

**5 студзеня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Жлоба Мікалай Фёдаравіч (1935–2022), беларускі архітэктар, працаваў над паркамі імя Фрунзе і імя Леніна ў г. Віцебску і над комплексам паркаў у г. Оршы.



Леніна, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонага Сцяга, медалямі.

У Віцебску 17 чэрвеня 1964 года шостая Суражская вуліца была перайменавана ў вуліцу Івана Янушкоўскага. На Алеі Славы ў г. п. Лёзна знаходзіцца стэла ў гонар І. І. Янушкоўскага.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Героев** знать поименно // Народнае слова. – 2013. – 22 студз. – С. 7.
2. **Курбацкі, Ф.** Сімвал неўміручасці / Ф. Курбацкі // Віцебскі рабочы.– 1980. – 16 кастр. – С. 2.
3. **Подлипский, А.** На старом погосте / А. Подлипский // Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2008. – 24 снеж. – С. 7.
4. **Самущенко, О**. Предположение не подтверждается / О. Самущенко // Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2009. – 6 студз. – С. 3.
5. **Шахавенка, С.** Герой сталінградскай загартоўкі / С. Шахавенка, Е. Скажонак, І. Марчанка // Віцебскі рабочы.– 1968. – 9 мая. – С. 2.
6. **Янушковский** Иван Иванович // Герои Советского Союза: краткий биографический словарь / А. А. Бабаков [и др.] ; ред. И. Н. Шкадов. – Москва : Военное издательство, 1988. – Т. 2 : Любов–Ящук. – С. 836.
7. **Янушковский** Иван Иванович // Неман. – 1968. – № 5. – С. 56.
8. **Янушковский** Иван Иванович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 633.
9. **Янушковский** Иван Иванович // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная типография, 2009. – С. 154.
10. **Янушковский** Иван Иванович // Твои сыновья, Беларусь! Герои Советского Союза : биографический справочник / ред.: Ю. В. Баженов [и др.] ; худ. ред. П. В. Баранов. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2015. – С. 154.

бацька. А праз некаторы час пайшла з жыцця маці. Дзеці засталіся сіротамі на апецы старэйшага брата Канстанціна. У 1928 годзе Іван, скончыўшы 5 класаў Стасеўскай школы, каб дапамагчы сям'і, пайшоў працаваць падсобным рабочым на мэблевую фабрыку ў Віцебску. Завочна вучыўся на рабфаку. У 1932 годзе Іван Янушкоўскі добраахвотнікам уступіў у рады Чырвонай арміі. Па іншай версіі паступіў у Адэскае ваеннае вучылішча і пасля яго заканчэння, у 1935 годзе камандзірам паехаў служыць на Камчатку.

У 1938–1939 гадах І. І. Янушкоўскі – курсант 2-га Кіеўскага артылерыйскага вучылішча (па іншых звестках 2-га Кіеўскага ваеннага вучылішча). Вялікая Айчынная вайна застала яго на новым месцы службы ў г. Чыта. Са жніўня 1941 года Іван Янушкоўскі – у перадавых часцях Заходняга, Ленінградскага, 2-га Украінскага франтоў. Удзельнічаў у абарончых баях пад Смаленскам. Асабіста падпаліў некалькі нямецкіх танкаў, якія ўварваліся ў размяшчэнне штаба іх вайсковай часці. За гэты гераічны ўчынак афіцэр быў удастоены медаля «За баявыя заслугі». У баях пад Сталінградам ён тройчы вадзіў у атаку стралковы батальён, знішчыў 38 фашыстаў і 12 узяў у палон. І. І. Янушкоўскі быў удастоены ордэна Чырвонага Сцяга.

Камандзір мінамётнага палка гвардыі маёр І. І. Янушкоўскі асабліва вызначыўся ў баях на тэрыторыі Румыніі. 18 верасня 1944 года ў раёне горада Арад, пры перамяшчэнні калоны артпалка на пазіцыі, штаб палка быў атакаваны групай варожых аўтаматчыкаў колькасцю да ўзмоцненай роты. Янушкоўскі ўзначаліў групу байцоў і работнікаў штаба, якая адсякала нападаючых ад калоны, і абараніла штаб і сцяг палка. У гэтым баі ім асабіста было знішчана каля 20 гітлераўцаў, але і сам Іван Іванавіч Янушкоўскі быў смяротна паранены. Першапачаткова яго пахавалі на месцы гібелі, а затым урна з прахам была перавезена ў г. Віцебск на воінскі мемарыяльны комплекс на Успенскай горцы.

Званне Героя Савецкага Саюза І. І. Янушкоўскаму было прысвоена 24 сакавіка 1945 года пасмяротна. Узнагароджаны ордэнамі



**5 студзеня** – 80 гадоў таму (1945) нарадзілася Загурская Галіна Пятроўна, педагог, пісьменніца. Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама (2015), «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама (2020). Ураджэнка в. Лявонпаль Мёрскага раёна.

**6 студзеня** – 105 гадоў таму (1920) нарадзілася Маслоўская Ганна Іванаўна (1920–1980), Герой Савецкага Саюза, ураджэнка в. Курсевічы Вілейскага павета Віленскай акругі, Польшча (цяпер у Пастаўскім раёне).

**6 студзеня** – 60 гадоў таму (1965) вёска Дабрынь Аршанскага раёна ўвайшла ў склад Дубровенскага раёна.

**7 студзеня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч (1910–1942), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. Ураджэнец г. Асташкаў Цвярской губерні, Расія.

**7 студзеня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Кандрацьеў Рыгор Пятровіч, беларускі спартсмен і трэнер па футболе, ураджэнец в. Любанічы Талачынскага раёна.

**8 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) створаны Віцебскі абласны выканаўчы камітэт у складзе 15 чалавек.

**10 студзеня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Галубовіч Васіль Васілевіч (1910–1991), беларускі тэатральны мастак, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, ураджэнец г. п. Коханава Талачынскага раёна.

**11 студзеня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Кавальчук Валерый Віктаравіч (1955–2009), беларускі мастак дэкаратыўнапрыкладнога мастацтва, член Беларускага саюза мастакоў, ураджэнец г. Гомеля. У Віцебску з 1977 г.

**12 студзеня** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Эйтынген Рыгор Раманавіч (1889–1959), савецкі вучоны-лесавод, дэндролаг, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар Маскоўскіх інстытутаў лесатэхнічнага і сельскагаспадарчага, член Міжнароднага Саюза лясных вопытных станцый у Стакгольме, папулярызатар лесаводчых ведаў. Ураджэнец г. Віцебска.

**12 студзеня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Зяньковіч Васіль Аляксандравіч, беларускі спецыяліст у вобласці дакладнага электроннага машынабудавання, ганаровы радыст СССР, вынаходнік СССР, ураджэнец г. Віцебска.

**14 студзеня** – 140 гадоў таму (1885) нарадзіўся Тарыч Юрый Віктаравіч (1885–1967), беларускі і расійскі кінарэжысёр, сцэнарыст, заснавальнік беларускага кіно, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі, ураджэнец г. Полацка.

**14 студзеня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Забагонскі Сямён Аляксандравіч (1910–1955), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Залучча Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Верхнядзвінскім раёне).

**15 студзеня** – 175 гадоў таму (1850) нарадзілася Кавалеўская Соф'я Васілеўна (КорвінКрукоўская; 1850–1891), матэматык, пісьменніца, публіцыст, ураджэнка г. Масквы. Дзяцінства і юнацкія гады правяла ў маёнтку Палібіна Віцебскай губерні.

**15 студзеня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Ратнікаў Генадзь Васілевіч (1935–2021), беларускі кіназнаўца, педагог, кандыдат мастацтвазнаўства, ураджэнец г. п. Шуміліна.

**15 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) увайшла ў склад Пастаўскага раёна в. Навасёлкі.

**15 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) утвораны Мёрскі раён у складзе Вілейскай вобласці.

**15 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) утварыўся Відзаўскі раён (1940–1960), адміністрацыйнатэрытарыяльная адзінка ў БССР у Вілейскай вобласці з цэнтрам у г. п. Відзы. 20.01.1960 далучаны да Браслаўскага раёна.

**15 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) утвораны Глыбоцкі раён у складзе Вілейскай вобласці.



Мінск : Беларусь, 2004. – С. 407.

11. **Ананьеў** Марцін Аляксеевіч // Энцыклапедыя гісторы Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2003. – Т. 6. – Кн. 2 : Усвея–Яшын. – С. 317.

12. **Кравцова, Е.** Мы гордимся героями-земляками! / Елена Кравцова // Гарадоцкі веснік. – 2020. – 19 чэрв. – С. 4, 6.

13. **Салаўёў, Н.** За мужнасць і адвагу / Н. Салаўёў // Прамень камунізму (Гарадок). – 1973. – 9 мая. – С. 1.

## Май



### ЯНУШКОЎСКІ ІВАН ІВАНАВІЧ

*110 год з дня нараджэння*

*(1915)*

**Янушкоўскі Іван Іванавіч** (1915–1944) – ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

Нарадзіўся 2 (15) мая 1915 (у копіі ўзнагароднага ліста год нараджэння – 1913) у ф. Пыжы Каралёўскай воласці Віцебскага павета (зараз в. Пыжы Лёзненскага раёна) у сялянскай шматдзетнай сям'і Івана Сямёнавіча і Ганны Фамінічны Янушкоўскіх. У сям'і, акрамя Івана, было чацвёра дзяцей. Калі хлопчыку споўнілася шэсць гадоў, раптоўна памёр

Москва : Военное издательство, 1987. – Т. 1 : Абаев–Любичев. – С. 53.

2. **Ананьев** Мартин Алексеевич // Навечно в сердце народном / редкол.: И. П. Шамякин [и др.]. – 3-е изд., доп. и испр. – Минск : БелСЭ им. П. Бровки, 1984. – С. 19–20.

3. **Ананьев** Мартин Алексеевич // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 17.

4. **Ананьев** Мартин Алексеевич // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2006. – Т. 2 : А–Герань. – С. 97.

5. **Ананьев** Мартин Алексеевич // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная типография, 2009. – С. 13.

6. **Ананьев** Мартин Алексеевич // Твои сыновья, Беларусь! Кавалеры ордена Славы : биографический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2014. – С. 18.

7. **Ананьеў** Марцін Аляксеевіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1969. – Т. I : А–Афіна. – С. 317.

8. **Ананьеў** Марцін Аляксеевіч // Беларуская ССР: кароткая энцыклапедыя : у 5 т. / редкал.: І. П. Шамякін (гл. ред.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1981. – Т. 5 : біяграфічны даведнік. – С. 27.

9. **Ананьеў** Марцін Аляксеевіч // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси / склад.: В. Ц. Осіпаў [і інш.] ; рэдкал.: А. В. Праляскоўскі, Л. У. Языковіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – С. 45–46.

10. **Ананьеў** Марцін Аляксеевіч // Памяць: Гарадоцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Н. А. Бурунова [і інш.] ; уклад. С. І. Садоўская ; мастак Э. Э. Жакевіч. –



**15 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) утвораны Докшыцкі раён у складзе Вілейскай вобласці.

**15 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) утвораны Пастаўскі раён у складзе Вілейскай вобласці.

**15 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) утвораны Браслаўскі раён у складзе Вілейскай вобласці.

**15 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) быў утвораны Дзісенскі раён у Вілейскай вобласці. У 1959 г. яго тэрыторыя была падзелена між Мёрскім і Плiскім раёнамі.

**15 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) утвораны Дунілавіцкі раён, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў БССР. У 1960 г. тэрыторыя далучана да Глыбоцкага раёна.

**15 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) утвораны Шаркаўшчынскі раён у складзе Вілейскай вобласці.

**15 студзеня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Калтуноў Васіль Васільевіч, пісьменнік. Ураджэнец г. Горкі Магілёўскай вобласці, жыве ў г. Віцебску.

**16 студзеня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Бышнёў Сяргей Іванавіч, мастак манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», ураджэнец г. Віцебска.

**18 студзеня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзілася Скрыпчанка Таццяна Сяргееўна, беларускі гісторык, археолаг, кандыдат гістарычных навук, ураджэнка г. Мінска. Даследавала помнікі археалогіі на тэрыторыі Віцебскай вобласці.

**20 студзеня** – 80 гадоў таму (1945) нарадзілася Бальчэўская Галіна Францаўна (1945–2005), беларуская актрыса, ураджэнка в. Палессе Мядзельскага раёна. Працавала ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

**21 студзеня** – 75 гадоў таму (1950) заснавана ААТ «Кераміка» ў г. Віцебску, як Віцебскі камбінат будаўнічых матэрыялаў. З 1980 г. – Віцебскае вытворчае аб'яднанне «Кераміка», з 1995 г. – сучасная назва.

**22 студзеня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Лісіца Іван Ігнатавіч (1950–2022), беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў, выкладаў у Віцебскім педагагічным інстытуце, Віцебскім тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці, Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава. Ураджэнец в. Блістава Чарнігаўскай вобласці (Украіна).

**23 студзеня** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Гайко Андрэй Самуілавіч (1920–1943), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, камандзір стралковага ўзвода, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Карасай Аранбургскай вобласці (Расія).

**23 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Кудзіенка Анатоль Дзмітрыевіч (1940–2010), беларускі архітэктар, педагог, кандыдат архітэктуры, ураджэнец с. Ленінскае Хабараўскага краю (Расія). Да асноўных яго работ адносяць праекты жылых дамоў у г. Шклове, г. п. Барань Аршанскага раёна і інш.

**23 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Ізобаў Мікалай Аляксеевіч, беларускі матэматык, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі, член-карэспандэнт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалер ордэна Ф. Скарыны, ураджэнец в. Красыні Лёзненскага раёна.

**24 студзеня** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Мазаль Рувім (Ілля) Майсеевіч (1890–1967), савецкі жывапісец, графік, ілюстратар, афарміцель. Пачатковую мастацкую адукацыю атрымаў у школе Ю. Пэна. Ураджэнец г. Віцебска.



Казялец (Чарнігаўская вобласць), замяніў выбыўшага са строю камандзіра роты і ўмела кіраваў падраздзяленнем. Галоўны ўдар пяхота ворага, падтрыманая чатырма танкамі і двума самаходнымі гарматамі «Фердынанд», накіравала на ўчастак 4-й роты, якой камандаваў старшы сяржант Ананьеў. Батальён не толькі адбіў атаку, але і першым увайшоў у г. Казялец.

Пры фарсіраванні Дняпра 27 верасня 1943 года камандзір кулямётнага разліку Мартын Ананьеў з групай байцоў у ліку першых пераправіўся на правы бераг ракі. Байцы роты занялі першую траншэю ворага. Супраць іх праціўнік кінуў пяхотны батальён. Усю ноч ішоў няроўны бой. Пехацінцы адбівалі атакі ворага, не прапусцілі яны і варожыя танкі, тым самым садзейнічалі пашырэнню захопленага плацдарма. Кулямётчык Ананьеў асабіста знішчыў каля 70 гітлераўцаў.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 3 чэрвеня 1944 года за ўзорнае выкананне баявых заданняў і праяўленыя пры гэтым гераізм і адвагу старшаму сяржанту Ананьеву Мартыну Аляксеевічу было прысвоена званне Герой Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны працягваў службу ў Чырвонай арміі. Дэмабілізаваўся старшы лейтэнант М. А. Ананьеў у 1946 годзе. Жыў і працаваў у г. Таганрогу Растоўскай вобласці (Расія). Быў на адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце. З 1946 па 1961 год працаваў дырэктарам швейнай фабрыкі.

Памёр Мартын Аляксеевіч Ананьеў 11 красавіка 1982 года. Пахаваны на новых могілках у г. Таганрогу. У 1983 г. на будынку дома, дзе ён жыў усталявана мемарыяльная дошка.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Славы III ступені, медалямі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Ананьев** Мартин Алексеевич // Герои Советского Союза: краткий биографический словарь / А. А. Бабаков [и др.] ; ред. И. Н. Шкадов. –

# Красавік



**АНАНЬЕЎ**
**МАРТЫН АЛЯКСЕЕВІЧ**
*125 год з дня нараджэння*
*(1900)*

**Ананьеў Мартын Аляксеевіч** (1900–1982), удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, Герой Савецкага Саюза.

Нарадзіўся 14 (27) красавіка 1900 года ў в. Ісайкі Балецкай воласці Гарадоцкага павета Віцебскай губерні (зараз Гарадоцкі раён Віцебскай вобласці, вёска не захавалася) у сялянскай сям'і. Атрымаў пачатковую адукацыю.

Прымаў удзел у грамадзянскай вайне: у 1919 годзе пайшоў з роднай вёскі з чырвонаармейскім атрадам і чатыры гады правёў на франтах. У 1923 годзе быў дэмабілізаваны.

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны працаваў забойшчыкам у шахтах на Данбасе, дырэктарам прамкамбіната ў г. Таганрогу. Паўторна прызваны ў Чырвоную армію Таганрогскім ГВК у жніўні 1941 года. На франтах Вялікай Айчыннай вайны – з лютага 1942 года. Удзельнічаў у Курскай бітве, вызваленні Украіны, Польшчы, у штурме Берліна.

Парторг 4-й роты 635-га стралковага палка (43-й стралковая дывізія, 60-я армія, Цэнтральны фронт) старшы сяржант М. А. Ананьеў асабліва вызначыўся 18–20 верасня 1943 года ў баі за раённы цэнтр



**24 студзеня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Цітоў Міхаіл Севасцьянавіч (1925–2008), удзельнік партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны работнік прамысловасці БССР, ураджэнец в. Вялікае Лосвіда Гарадоцкага раёна.

**24 студзеня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Лойка Георгій Мікалаевіч, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, узнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Ураджэнец г. Баранавічы Брэсцкай вобласці.

**25 студзеня** – 105 гадоў таму (1920) нарадзілася Марыненка Таццяна Савельеўна (1920–1942), Герой Савецкага Саюза, ураджэнка в. Сухі Бор Полацкага раёна.

**27 студзеня** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Ахола-Вало Александэры (Аляксандр Пятровіч; 1900–1997), мастак, ураджэнец Імпілахці Выбаргскай губерні, у 1920–1925 жыў у Віцебску. Вучыўся ў Віцебскай мастацкай школе (1920–1921), наведваў майстэрні С. Юдовіна, Ю. Пэна, слухаў лекцыі В. Ермалаевай. Выкладаў у школе рабочай моладзі, супрацоўнічаў з Віцебскім аддзяленнем літаратурнага аб'яднання «Маладняк», Віцебскім акруговым таварыствам краязнаўства. У Віцебску сустрэў сваю будучую жонку Алену Ніканович-Яцэвіч.

**27 студзеня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзілася Букаціна Галіна Мікалаеўна, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Узнагароджана медалём Францыска Скарыны і прызам Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная зорка». Ураджэнка г. Маладзечна Мінскай вобласці.

**28 студзеня** – 140 гадоў таму (1885) нарадзіўся Дубіна Антон Васілевіч (1885–1937), дзяржаўны дзеяч Беларусі, ураджэнец г. Веліж Віцебскай губерні (зараз Смаленская вобласць, Расія).

**28 студзеня** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Герасімаў Рыгор Пятровіч (1905–1961), адзін з кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Ураджэнец г. Невель Віцебскай губерні (зараз у Пскоўскай вобласці, Расія).

**28 студзеня** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Баталаў Рыгор Міхайлавіч (1915–1988), генерал-лейтэнант, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Віцебска.

**28 студзеня** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Дайнека Леанід Мартынавіч (1940–2019), беларускі пісьменнік, у канцы 1960-х гадоў працаваў старшым рэдактарам на Віцебскай абласной студыі тэлебачання.

**29 студзеня** – 305 гадоў таму (1720) нарадзіўся Багамолец Францішак (1720–1784), польскі драматург, публіцыст, выдавец, член ордэна езуітаў. Ураджэнец Віцебскага ваяводства ВКЛ. Паходзіў з віцебскай шляхты.

**29 студзеня** – 165 гадоў таму (1860) нарадзіўся Грынеўскі Фёдар Аляксандравіч (1860–1932) рускі і польскі ўрач, грамадскі дзеяч. У 1881 г. скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію. З 1929 г. жыў у радавым маёнтку Якубенкі Дзісненскага павета (зараз Глыбоцкі раён). Працаваў урачом у в. Пліса, займаўся навуковай і грамадскай дзейнасцю. Ураджэнец г. Себежа Віцебскай губерні (зараз у Пскоўскай вобл., Расія).

**29 студзеня** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Ярмоленка Мікалай Фёдаравіч (1900–1972), беларускі хімік, прафесар, доктар хімічных навук, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, ураджэнец в. Клюкаўка Аршанскага раёна.

**29 студзеня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Кузняцоў Міхаіл Ціханавіч (1925–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец ураджэнец в. Вялікае Грыдзіна Разанскай губерні (Расія).



энцыклапедыя : у 5 т. / редкал.: І. П. Шамякін (гл. ред.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1981. – Т. 5 : біяграфічны даведнік. – С. 294.

3. **Касабуцкі** Іван Сцяпанавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 8 : Канто–Кулі. – С. 138.

4. **Касабуцкі** Іван Сцяпанавіч // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси / склад.: В. Ц. Осіпаў [і інш.] ; рэдкал.: А. В. Праляскоўскі, Л. У. Языковіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – С. 503.

5. **Касабуцкі** Іван Сцяпанавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1997. – Т. 4 : Кадэты–Ляшчэня. – С. 135.

6. **Кособуцкий** Иван Степанович // Долготович, Б. Д. Военачальники земли белорусской : энцикл. справочник / Б. Д. Долготович. – Минск : БелЭн, 2005. – С. 129.

7. **Кособуцкий** Иван Степанович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 521.

8. **Кособуцкий** Иван Степанович // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн, 2007. – Т. 4 : Картография–Миноговые. – С. 236.

9. **Яны** нарадзіліся на Сенненшчыне : біяграфічны даведнік / склад. А. В. Бараноўскі. – Віцебск : ВДУ імя Машэрава, 2016. – С. 68–70.

Ваеннай калегіяй Вярхоўнага Суда СССР ад 30 кастрычніка 1943 года з І. С. Касабуцкага была знятая судзімасць як з адкупіўшага віну перад Радзімай, ён быў адноўлены ў воінскім званні «генерал-маёр».

У кастрычніку 1943 года быў прызначаны на пасаду камандзіра 34-га стралковага корпуса, які прымаў удзел у ходзе бітвы за Днепр, а таксама ў Нікопальска-Крыварожскай, Беразнегавата-Снігіроўскай, Адэскай, Яска-Кішынёўскай аперацыях. З кастрычніка 1944 г. корпус у далейшых баявых дзеяннях удзел не прымаў, дыслацыраваўся ў г. Сафія. За ўмелае камандаванне корпусам падчас наступальных аперацый І. С. Касабуцкі быў узнагароджаны ордэнамі Суворава ІІ ступені і Кутузава ІІ ступені.

У жніўні 1945 года генерал-лейтэнант І. С. Касабуцкі быў прызначаны на пасаду начальніка Упраўлення баявой і фізічнай падрыхтоўкі штаба Паўднёвай групы войск, у студзені 1946 года – на пасаду старшага выкладчыка кафедры тактыкі вышэйшых злучэнняў Вышэйшай ваеннай акадэміі імя К. Я. Варашылава, а ў красавіку 1949 года – на пасаду начальніка гэтай кафедры.

Генерал-лейтэнант Іван Сцяпанавіч Касабуцкі ў чэрвені 1953 года выйшаў у запас.

Памёр Іван Сцяпанавіч Касабуцкі 15 лістапада 1974 г. у Маскве. Урна з прахам пахаваная ў калумбарыі Новых Данскіх могілак.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава ІІ ступені, ордэнам Кутузава ІІ ступені, медалямі.

***Біяграфія прадстаўлена краязнаўцам Канстанцінам Гайдуковым.***

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Камбрыг** з Сенненшчыны / падрыхт. В. Бандарэвіч // Голас Сенненшчыны. – 2018. – 13 лют. – С. 5.

2. **Касабуцкі** Іван Сцяпанавіч // Беларуская ССР: кароткая



# Люты

190 гадоў таму (1835) нарадзіўся Лявіцкі Казімір Васілевіч (1835–1891), расійскі ваенны дзеяч, прафесар, генерал-лейтэнант, удзельнік руска-турэцкай вайны 1877–1878 гг., ураджэнец Віцебскай губерні.

15 гадоў таму (2010) заснавана праграма раённага радыё «Дубровенскае радыёвяшчанне» ў г. Дуброўна.

**1 лютага** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Лузгін Аляксей Андрэевіч (1920–1977), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Загараддзе Талачынскага раёна.

**2 лютага** – 85 гадоў таму (1940) нарадзілася Салдатава (у дзявоцтве Баранава) Святлана Іосіфаўна, беларуская спартсменка (фехтаванне на рапірах), майстар спорту міжнароднага класа, ураджэнка г. Віцебска.

**4 лютага** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Багданаў Рыгор Багданавіч (1910–1943), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Марцюшы Гарадоцкага павета Віцебскай губерні (цяпер у Гарадоцкім раёне).

**5 лютага** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Бабашынскі Аляксандр Іосіфавіч (1905–1970), вучоны ў галіне ветэрынарыі, доктар ветэрынарных навук, прафесар, ураджэнец г. Віцебска. У 1949–1950 гг., 1962–1969 гг. загадчык кафедры заагігіены ў Віцебскім ветэрынарным інстытуце.

**7 лютага** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Мядзведзеў Аляксандр Міхайлавіч, беларускі археолаг, ураджэнец г. Мінска. Праводзіў археалагічныя даследаванні на гарадзішчах Глыбокае і Запруддзе Глыбоцкага, Рацюнкі Браслаўскага раёнаў.

**8 лютага** – 215 гадоў таму (1810) нарадзіўся Хруцкі Іван Фаміч (1810–1885), беларускі жывапісец, акадэмік жывапісу, ураджэнец м. Ула Лепельскага павета Віцебскай губерні (цяпер аг. Ула Бешанковіцкага раёна).

**8 лютага** – 170 гадоў таму (1855) нарадзіўся Гласко Іван Антонавіч (1855–1881; псеўданім Рапацкі), дзеяч рэвалюцыйнага руху, публіцыст, ураджэнец Полацкага павета.

**8 лютага** – 60 гадоў таму (1965) нарадзілася Баранкоўская Святлана Аляксандраўна, беларускі мастак, член Беларускага саюза дызайнераў, член Беларускага саюза мастакоў, ураджэнка г. Людзінава Калужскай вобласці (Расія). Жыве ў Віцебску.

**10 лютага** – 90 гадоў таму (1935) нарадзілася Сайфугаліева Маргарыта Шахіеўна (1935–2019), самадзейны мастак, яркі прадстаўнік інсітнага мастацтва Беларусі. Ураджэнка в. Кільдуразы Татарскай АССР. З 1972 года жыла ў Віцебску.

**10 лютага** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Кузьмін Андрэй Канстанцінавіч, беларускі трэнер (веласіпедны спорт, шасэйныя гонкі), заслужаны трэнер Беларусі, ураджэнец в. Загараддзе Талачынскага раёна.

**12 лютага** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Чуйкоў Васіль Іванавіч (1900–1982), Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза, ураджэнец п. Сярэбраныя Пруды, Тульскай губерні (цяпер у Маскоўскай вобласці, Расія). За баі каля г. Лепель узнагароджаны 2-м ордэнам Чырвонага Сцяга.

**12 лютага** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Агейчанка Фёдар Яфімавіч (1905–1954), беларускі і расійскі вучоны ў галіне паталагічнай анатоміі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Ураджэнец д. Выдрэя Аршанскага павета Магілёўскай губерні (цяпер п. Выдрэя Лёзненскага раёна).



служыць на розных пасадах: начальнік штаба Наваград-Валынскага ўмацаванага раёна, 8-га стралковага корпуса, камандзір 15 стралковага корпуса, вайсковы інспектар Кіеўскай ваеннай акругі, намеснік начальніка штаба гэтай жа акругі, начальнік Упраўлення будаўніцтва № 180 у горадзе Шапятоўка, старшы выкладчык кафедры тактыкі вышэйшых злучэнняў Акадэміі Генштаба РСЧА.

Са студзеня па жнівень 1940 года знаходзіўся ў службовай камандзіроўцы па загадзе намесніка наркама абароны СССР Я. А. Шчадзенкі, пасля вяртання з якой у сакавіку 1941 года быў прызначаны на пасаду камандзіра 41-га стралковага корпуса (Маскоўская ваенная акруга).

З самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны корпус пад камандаваннем генерал-маёра Івана Сцяпанавіча Касабуцкага быў уключаны ў склад Паўночна-Заходняга фронту і вёў цяжкія абарончыя баі, забяспечваючы адвод войскаў фронту ад ракі Заходняя Дзвіна да Пскоўска-Астроўскаму ўмацаванаму раёну. З-за адсутнасці ўзаемадзеяння сярод часцей Чырвонай арміі нямецкім войскам удалося з ходу захапіць Пскоў і непашкоджаныя стратэгічна важныя масты праз раку Вялікая. Гэта вельмі адмоўна адбілася на далейшым ходзе баявых дзеянняў. І. С. Касабуцкі быў абвінавачаны ў здачы Пскова праціўніку без сур'ёзнага супраціўлення, у самавольным адыходзе з пазіцый і 16 ліпеня арыштаваны. За дапушчаныя пралікі ў кіраванні корпусам рашэннем выязной Ваеннай калегіі Вярхоўнага Суда СССР ад 26 ліпеня 1941 года Іван Сцяпанавіч Касабуцкі быў асуджаны на 10 гадоў гадоў папраўча-працоўных работ з пазбаўленнем воінскага звання «генерал-маёр».

Але ўжо 21 кастрычніка 1942 гады па пастанове Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР І. С. Касабуцкі быў датэрмінова вызвалены са зняволення і накіраваны ў дзеячае войска. У снежні таго ж года ён быў прызначаны на пасаду памочніка камандуючага войскамі Паўночна-Заходняга фронту па фармаванні рэзерваў. У канцы жніўня 1943 года быў цяжка паранены і накіраваны ў шпіталь.

стралковай дывізіі Заходняй (з сакавіка 1919 – Літоўска-Беларускай, а з ліпеня таго ж года – 116-й) арміі на пасадах камандзіра 147-га і 152-га стралковых палкоў, з лютага 1920 года – на пасадзе камандзіра 23-й стралковай брыгады ў складзе 8-й стралковай дывізіі гэтай жа арміі. У ліпені таго ж года быў пераведзены зноў у 17-ю стралковую дывізію, пасля чаго служыў на пасадах камандзіра 153-га стралковага палка і 49-й стралковай брыгады. Дывізія прымала ўдзел у баявых дзеяннях супраць белапалякаў і ўзброеных злучэнняў пад камандаваннем С. Пятлюры. Летам 1920 года дывізія падчас савецка-польскай вайны ўдельнічала ў наступальных аперацыях на гарады Радзівілаў, Мазыр і Барысаў, а затым у жнівеньскай наступальнай аперацыі на Мінск, Слонім, Ваўкавыск, Сядлец і Варшаву. З лістапада 1920 па май 1921 года дывізія прымала ўдзел у баявых дзеяннях супраць узброеных фарміраванняў пад камандаваннем генерала С. Н. Булак-Балаховіча.

Пасля заканчэння вайны з чэрвеня 1922 года І. С. Касабуцкі служыў у складзе 17 стралковай дывізіі, дыслацыраванай ва Уладзіміры на пасадах камандзіра 51 стралковага палка, памочніка камандзіра дывізіі і зноў камандзіра 51 стралковага палка.

У 1924 годзе Іван Сцяпанавіч Касабуцкі скончыў Вышэйшую тактычна-стралковую школу камсаставу Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і ў красавіку 1926 года быў прызначаны на пасаду памочніка начальніка 11 Ніжагародскай пяхотнай школы па вучэбна-страявой частцы, а ў лістападзе – на пасаду ваеннага кіраўніка Ніжагародскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У верасні 1927 года быў накіраваны на вучобу ў Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзэ. Пасля заканчэння акадэміі, у лютым 1930 года, служыў памочнікам начальніка штаба 9 стралковага корпуса Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі, начальнікам штаба 44 стралковай дывізіі Украінскай ваеннай акругі, працаваў выкладчыкам тактыкі Ваеннай акадэміі імя М. В. Фрунзэ.

Са студзеня 1935 года па снежань 1939 года І. С. Касабуцкі



**12 лютага** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Кляшчоў Аляксей Яўхімавіч (1905–1968), дзяржаўны і партыйны дзеяч БССР, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр. У 1946–1948 гг. – першы сакратар Полацкага абкама КПБ, ураджэнец в. Міхнавічы Магілёўскай губерні (зараз Гомельская вобласць).

**12 лютага** – 90 гадоў таму (1935) адноўлены Ветрынскі раён у складзе Полацкай акругі, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў БССР (1924–1931, 1935–1960 гг.). З 1960 г. яго тэрыторыя перададзена ў склад Ушацкага і Полацкага раёнаў.

**12 лютага** – 90 гадоў таму (1935) утвораны Мехаўскі раён, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, якая ўключала 15 сельсаветаў, выдзеленых з Гарадоцкага раёна. 18.03.1958 – перайменаваны ў Езярышчанскі раён.

**14 лютага** – 105 гадоў таму (1920) у Віцебскай мастацкай школе пад кіраўніцтвам К. Малевіча і Л. Лісіцкага створана суполка мастакоў-наватараў «УНОВИС» («Утвердители нового искусства»).

**15 лютага** – 95 гадоў таму (1930) нарадзілася Сянчыла Надзея Іванаўна (1930–2021), заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР, поўны кавалер ордэна Працоўнай Славы, ураджэнка в. Івашня Аршанскага раёна.

**15 лютага** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Асвяцінскі Вадзім Геральдавіч, артыст Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Ураджэнец в. Макуты Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці.

**16 лютага** – 260 гадоў таму (1765) нарадзіўся Мусніцкі Нікодым (1765–1805), польскі паэт, драматург, гісторык, педагог, ураджэнец Літвы. Выкладаў рыторыку, французскую мову і філасофію ў Мсціславе і Віцебску. З 1800 працаваў выкладчыкам тэалогіі ў Полацкім езуіцкім калегіуме.

**16 лютага** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Арлоў Цімафей Мікалаевіч (1915–1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Вялікае Чавусава Табольскай губерні (цяпер у Курганскай вобласці, Расія). Вызначыўся пры вызваленні Беларусі. Пахаваны ў в. Стасева Лёзненскага раёна.

**19 лютага** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Сваяк Казімір (сапраўднае Стаповіч Канстанцін Мацвеевіч; 1890–1926), пісьменнік, рэлігійны і грамадскі дзеяч, ураджэнец Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці. Служыў ксяндзом у в. Камаі Пастаўскага раёна.

**19 лютага** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Нікалаеў Віктар Мікалаевіч, беларускі мастак, член Беларускага саюза дызайнераў, Беларускага саюза мастакоў, ураджэнец г. Мінска. Сярод твораў якога маюцца і прысвечаныя Віцебшчыне: «Віцебская львіца» (1989) і «Абуджэнне Дзвіны» (1997). Жыве і працуе ў Мінску і Віцебску.

**20 лютага** – 175 гадоў таму (1850) нарадзіўся Чыр'еў Сяргей Іванавіч (1850–1915), фізіёлаг, доктар медыцыны, педагог, ураджэнец г. Віцебска.

**20 лютага** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Ілазараў Ісай Ілазаравіч (1920–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Нальчык (Кабардзіна-Балкарская Рэспубліка, Расія).

**20 лютага** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Глазуноў Петр Аляксеевіч (1920–1992), лётчык, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Петрачкі Віцебскага раёна.

**24 лютага** – 430 гадоў таму (1595) нарадзіўся Сарбеўскі Мацей Казімір (1595–1640), лацінамоўны паэт Польшчы, Беларусі і Літвы, тэарэтык літаратуры, філосаф, тэолаг, ураджэнец Мазавецкага ваяводства (Польшча). Працаваў у Полацкім і Нясвіжскім езуіцкім калегіумах, Віленскай акадэміі.



# *Сакавік*



**КАСАБУЦКІ**

**ІВАН СЦЯПАНАВІЧ**

*130 год з дня нараджэння (1895)*

**Касабуцкі Іван Сцяпанавіч** (1895–1974) – ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, кавалер ордэна Леніна.

Нарадзіўся 7 (19) сакавіка 1895 года ў г. Сянно (па іншых звестках у населеным пункце Тураўская Слабада Сенненскага павета Ульянавіцкай воласці, цяпер у межах г. Сянно) па адных звестках у яўрэйскай сям'і, па іншых дадзеных яго бацька быў палякам, а маці беларускай.

У маі 1915 года Іван Касабуцкі быў прызваны ў рады Рускай імператарскай арміі і накіраваны на вучобу ў 7-ю Маскоўскую школу прапаршчыкаў, пасля заканчэння якой у тым жа годзе быў адпраўлены на Заходні фронт, дзе быў прызначаны на пасаду памочніка камандзіра роты. Потым быў камандзірам роты, камандзірам батальёна. У 1917 годзе ў чыне штабс-капітана быў дэмабілізаваны.

А ў жніўні 1918 года быў прызваны ў рады Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і прызначаны на пасаду памочніка камандзіра Сенненскага пяхотнага народнага палка. З кастрычніка таго ж года ўдзельнічаў у баявых дзеяннях на Заходнім фронце ў складзе 17-й

2009. – С. 34.

6. **Глазуноў** Пётр Аляксеевіч // Беларуская Энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1997. – Т. 5 : Гальцы–Дагон – С. 285.

7. **Глазуноў** Пётр Аляксеевіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: А. Я. Андрэеў [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1990. – С. 168.

8. **Глазуноў Пётр Аляксеевіч** // Імёны, асобы, лёсы: ураджэнцы Віцебшчыны ў далёкім і блізкім замежжы / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2012. – С. 88–89.

9. **Глазуноў** Пётр Аляксеевіч // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2002. – Кн. 1. – С. 624.

10. **Глазуноў** Пётр Аляксеевіч // Памяць: Віцебскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: А. П. Красоўскі [і інш.] ; уклад. У. І. Мезенцаў ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. – С. 334–335.

11. **Глазуноў** Пётр Аляксеевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1996. – Т. 3 : Гімназіі–Кадэнцыя. – С. 42.

12. **Летчик**-штурмовик Глазунов Петр Алексеев // Неман. – 1966. – 10. – С. 48.

13. **Мезенцев, В.** Ас воздушного боя / В. Мезенцев // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 1999. – 2 лістап. – С. 3.

14. **Мезенцев, В.** Храбрый летчик – Герой / В. Мезенцев // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2010. – 16 лют. – С. 2.



| | |
|---|---|
| **24 лютага** – 90 гадоў | таму (1935) нарадзіўся Барадулін Рыгор Іванавіч (1935–2014), народны паэт Беларусі, перакладчык, ураджэнец хутара Верасоўка (зараз в. Гарадок) Ушацкага раёна. |
| **27 лютага** – 95 гадоў | таму (1930) нарадзіўся Бараноўскі Альгерд Антонавіч (1930–2008), партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, генерал-маёр міліцыі, начальнік Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама (1976–1985 гг.), ураджэнец г. Магілёва. |
| **27 лютага** – 85 гадоў | таму (1940) нарадзіўся Лук'янаў Віктар Міхайлавіч, беларускі акварэліст, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец в. Уласава Віцебскага раёна. Ганаровы грамадзянін г. Наваполацка |
| **27 лютага** – 60 гадоў | таму (1965) нарадзіўся Азаронак Юрый Уладзіміравіч, беларускі рэжысёр дакументальнага кіно, журналіст, грамадскі дзеяч. Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь. Ураджэнец в. Рудня Гарадоцкага раёна. |
| **28 лютага** – 100 гадоў | таму (1925) нарадзіўся Бабаедаў Іван Цімафеевіч (1925–2002), беларускі мастак, член Саюза мастакоў СССР. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны двума баявымі ордэнамі і медалём «За адвагу». Ураджэнец в. Бобіна Бешанковіцкага раёна. |

# Сакавік

**1 сакавіка** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Вялікі Зіновій Сямёнавіч (1900–1983), беларускі акцёр, рэжысёр, ураджэнец Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

**1 сакавіка** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Яцкевіч Уладзімір Уладзіміравіч, беларускі навуковец у галіне трактарнага і дарожнага машынабудаўніцтва, доктар тэхнічных навук, прафесар, ураджэнец в. Пліскі Полацкага раёна.

**2 сакавіка** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Юсікаў Васіль Раманавіч, прафсаюзны дзеяч, з 2000 г. намеснік генеральнага дырэктара трэста № 9 г. Віцебска, ураджэнец в. Замошша Віцебскага раёна. З верасня 2002 г. старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў.

**3 сакавіка** – 310 гадоў таму (1715) нарадзіўся Смагаржэўскі Ясон (1715–1788), уніяцкі царкоўны дзеяч, архіепіскап полацкі, віцебскі, мсціслаўскі, аршанскі і магілёўскі, ураджэнец Ваўкавыскага павета Вялікага Княства Літоўскага. З 1746 г. адміністратар Полацкай архіепархіі.

**3 сакавіка** – 85 гадоў таму (1940) створаны Віцебскі абласны партыйны архіў у адпаведнасці з прынятай ЦК КП(б)Б пастановай «Аб арганізацыі абласных партыйных архіваў».

**3 сакавіка** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Ладысеў Уладзімір Фёдаравіч (1940–2017), беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, ураджэнец в. Вялікая Дзяцель Дубровенскага раёна.



Пасля вайны П. А. Глазуноў працягваў службу ў ваенна-паветраных сілах Савецкай арміі. У 1947 годзе скончыў Вышэйшыя лётна-тактычныя курсы, а ў 1955 годзе – Цэнтральныя лётна-тактычныя курсы ўдасканалення афіцэрскага саставу.

У 1975 годзе ў званні палкоўніка П. А. Глазуноў быў звольнены ў запас. Жыў у г. Харкаве. Працаваў у абласной арганізацыі ДТСААФ.

Памёр Пётр Аляксеевіч Глазуноў 8 сакавіка 1992 года, пахаваны на харкаўскіх могілках № 6.

Палкоўнік П. А. Глазуноў узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Аляксандра Неўскага, ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

***Біяграфія прадстаўлена краязнаўцам***
***Канстанцінам Гайдуковым.***

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Галдзілаў, У.** Калыска герояў / У. Галдзілаў // Віцебскі рабочы. – 1993. – 19 чэрв. – С. 5.
2. **Глазунов** Пётр Алексеевич // Белорусская ССР: краткая энциклопедия : в 5 т. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелСЭ им. П. Бровки, 1981. – Т. 5 : биографический справочник. – С. 148.
3. **Глазунов** Пётр Алексеевич // Герои Советского Союза: краткий биографический словарь / А. А. Бабаков [и др.] ; ред. И. Н. Шкадов. – Москва : Военное издательство, 1987. – Т. 1 : Абаев–Любичев. – С. 327.
4. **Глазунов** Пётр Алексеевич // Навечно в сердце народном / редкол.: И. П. Шамякин [и др.]. – 3-е изд., доп. и испр. – Минск : БелСЭ им. П. Бровки, 1984. – С. 117.
5. **Глазунов** Пётр Алексеевич // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная типография,

(Харкаўская вобласць), а таксама падаўлены агонь 8 артылерыйскіх і 6 мінамётных батарэй, знішчана 14 танкаў, 2 паравозы, да 40 вагонаў. Па ўсёй сукупнасці баявых вылетаў П. А. Глазуноў быў прадстаўлены да звання Герой Савецкага Саюза. Але званне яму не было прысвоена. 8 красавіка 1944 года ён быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

23 жніўня 1944 года дванаццаць Іл-2 пад камандаваннем капітана П. А. Глазунова нанеслі штурмавы ўдар па танках і жывой сіле праціўніка на паўночны захад ад эстонскага горада Тарту. На другім заходзе П. А. Глазуноў выявіў 18 бамбардзіроўшчыкаў Ju-87, якія атакавалі савецкія войскі. Капітан павёў групу на «юнкерсы» і збіў адзін з іх. Праціўнік не прыняў бою і пачаў адыходзіць.

Да верасня 1944 г. капітан П. А. Глазуноў здзейсніў ужо 115 баявых вылетаў на разведку і штурмавыя ўдары. Сярод іх: 88 – на штурмоўку жывой сілы і тэхнікі, аэрадромаў і апорных пунктаў, 27 – на разведку войскаў праціўніка. Асабіста ім знішчаны паравоз і 15 вагонаў, 2 батарэі палявой артылерыі, некалькі гармат зенітнай артылерыі, 13 танкаў, 6 самалётаў на аэрадромах, 63 аўтамашыны з грузамі і боепрыпасамі, 20 фурманак з ваеннай маёмасцю, узарвана 2 пераправы, 4 склады з боепрыпасамі і 2 склады з гаручым, рассеяна і часткова знішчана да 2 рот пяхоты праціўніка. Па сукупнасці баявых вылетаў П. А. Глазуноў быў паўторна прадстаўлены да звання Герой Савецкага Саюза.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 23 лютага 1945 года за «ўзорнае выкананне заданняў камандавання і выяўленыя мужнасць і гераізм у баях з нямецкімі захопнікамі» гвардыі капітан Пётр Глазуноў быў удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

Вайну Пётр Аляксеевіч Глазуноў скончыў намеснікам камандзіра штурмавога авіяпалка. Усяго за час вайны ім было здзейснена 138 баявых вылетаў на штурмавіку «Іл-2», збіта 3 самалёты, знішчана 18 танкаў, 68 аўтамашын і шмат іншай тэхнікі праціўніка.



**5 сакавіка** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Каваленя Аляксандр Дзмітрыевіч (1895–1937), беларускі археолаг, ураджэнец в. Кашніцы Гродзенскага павета. Праводзіў даследаванні помнікаў жалезнага веку ў басейне рэк Днепр, Заходняя Дзвіна (Віцебскі, Гарадоцкі, Аршанскі раёны) і Сож. У 1926–1928 гг. арганізаваў археалагічныя экспедыцыі ў Дубровенскі і Ушацкі раёны.

**7 сакавіка** – 60 гадоў таму (1965) нарадзілася Снарская Іна Станіславаўна (1965) інжынер-будаўнік, журналіст, паэтэса. Дзеяч беларускай дыяспары ва Украіне, ураджэнка г. Полацка Віцебскай вобласці.

**8 сакавіка** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Логінаў Уладзімір Фёдаравіч, беларускі і расійскі навуковец у галіне кліматалогіі і геаэкалогіі, акадэмік НАН Беларусі, доктар геаграфічных навук, прафесар, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Ураджэнец в. Зялёнаўка Гарадоцкага раёна.

**9 сакавіка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Ляўковіч Міхаіл Васілевіч, беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў. У 1995–2011 гг. быў старшынёй аб’яднання мастакоў-акварэлістаў «Віцебская акварэль». У 1976–2015 гг. выкладаў у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава. Ураджэнец в. Язна Мёрскага раёна.

**10 сакавіка** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Дубровіч Алесь (Рэдзька Аляксей Рыгоравіч; 1910–1942), беларускі паэт, удзельнік вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, удзельнік антыфашысцкага падполля на Глыбоччыне ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Галубічы Дзісенскага павета Віленскай губерні, цяпер в. Каралевічы Глыбоцкага раёна.

**10 сакавіка** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Майсеенка Сяргей Цімафеевіч (1920–2005), дзяржаўны дзеяч БССР, заслужаны лесавод Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчынай вайны. Ураджэнец в. Чубакова Дубровенскага раёна.

**12 сакавіка** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Гаравец Аляксандр Канстанцінавіч (1915–1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, намеснік камандзіра эскадрыллі знішчальнага авіяпалка, старшы лейтэнант. Ураджэнец в. Машканы Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Сенненскім раёне).

**12 сакавіка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Шафранскі Якаў Міхайлавіч, беларускі навуковец у галіне матэматычнай кібернетыкі і інфарматыкі, кандыдат фізіка-матэматычных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.

**12 сакавіка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзілася Кавалёва Тамара Іванаўна, педагог, пісьменніца. Ураджэнка в. Папоўка Пскоўскай вобласці, жыве ў г. Наваполацку.

**12 сакавіка** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Чарняўскі Ігар Мяфодзевіч, беларускі археолаг, гісторык архітэктуры, ураджэнец г. Чачэрска Гомельскай вобласці. Вёў раскопкі мураваных пабудоў 12–18 стст. грамадзянскага характару ў г. Віцебску.

**14 сакавіка** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Сюбараў Аляксей Яфімавіч (1890–1978), беларускі навуковец у галіне пладаводства і селекцыі, ураджэнец в. Белікі Віцебскага раёна.

**15 сакавіка** – 175 гадоў таму (1850) нарадзіўся Савіч-Заблоцкі Войслаў (1850– пасля 1893), паэт, празаік, публіцыст, ураджэнец маёнтка Панчаны Дзісенскага павета Віленскай губерні (цяпер Мёрскі раён).

**15 сакавіка** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Семянкоў Аляксей Іванавіч (1915–2000), генерал-лейтэнант авіяцыі, заслужаны пілот СССР, Герой Расійскай Федэрацыі. У 1970–1975 – першы намеснік міністра грамадзянскай авіяцыі, затым першы намеснік старшыні Дзяржкамітэта авіянагляду пры Савеце Міністраў СССР. Ураджэнец в. Цесалы Гарадоцкага раёна.



Мазалаўскага сельсавета Віцебскага раёна ў сялянскай шматдзетнай сям'і, акрамя Пятра ў сям'і было чацвёра дзяцей. Пётр Глазуноў скончыў няпоўную сярэднюю школу, медыцынскі тэхнікум. Некаторы час працаваў у Віцебскім дзяржаўным абласным архіве. 24 лістапада 1938 года, пасля заканчэння Віцебскага аэраклуба Асаавіяхіма, добраахвотна ўступіў у Чырвоную армію. У 1940 годзе П. А. Глазуноў скончыў Адэскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў імя Паліны Асіпенка.

На франтах Вялікай Айчыннай вайны з сакавіка 1943 года – на Паўднёва-Заходнім, 3-м Украінскім, 3-м і 2-м Прыбалтыйскім, Ленінградскім франтах. Удзельнічаў у вызваленні Украінскай ССР, Пскова, Прыбалтыкі. Увесь баявы шлях прайшоў у радах 955-га штурмавога авіяцыйнага палка 305-й штурмавой авіяцыйнай дывізіі. У званні П. А. Глазуноў вырас ад малодшага лейтэнанта да маёра. Паслядоўна займаў пасады камандзіра звяна, намесніка камандзіра (штурмана) і камандзіра эскадрыллі, намесніка камандзіра палка.

Па стане на 20 студзеня 1944 года Пётр Аляксеевіч Глазуноў зрабіў 82 баявыя вылеты, у тым ліку: 39 – на знішчэнне жывой сілы і тэхнікі праціўніка, 35 – на бамбардзіроўку аўтамабільнага транспарту і чыгуначных эшалонаў, 8 – на штурмоўку аэрадромаў. Знішчыў ці пашкодзіў 11 гармат зенітнай і палявой артылерыі, 12 цыстэрн з гаручым, 36 аўтамашын з грузамі і боепрыпасамі, да 60 фурманак, 6 самалётаў, рассеяў і часткова знішчыў да роты пяхоты праціўніка. Збіў асабіста 2 самалёты. У баявым вылеце 6 ліпеня 1943 года вытрымаў лабавую атаку нямецкага знішчальніка ФВ-190, збіў яго агнём бартавой зброі, але сам быў цяжка паранены. Нягледзячы на гэта, лётчык здолеў прывесці самалёт на свой аэрадром.

Падчас баявога вылета па штурмоўцы аэрадрома Старыя Блізняты 7 верасня 1943 года група самалётаў пад камандаваннем ст. лейтэнанта П. А. Глазунова знішчыла і пашкодзіла на варожым аэрадроме 14 самалётаў, падавіла агонь зенітнай батарэі. 8 верасня 1943 года быў знішчаны буйны склад боепрыпасаў на чыгуначнай станцыі Барвенкава

боевых действиях на фронтах Великой Отечественной войны и партизанском движении / С. Л. Орлова // Женский подвиг в истории Беларуси. 1917–2017 : материалы Международной научно-практической конференции (26 октября 2017 г., Витебск) / редкол.: Т. Н.Адамян (отв. ред.) и др. – Минск : УП «Энциклопедикс». 2018. – С. 114–120.

15. **Сенюков, Г.** Полоцкий василек / Г. Сенюков // Рэспубліка. – 2007. – 5 мая. – С. 5.

16. **Трапезникова, Л.** Собрала всех Память / Л. Трапезникова // Полацкі веснік. – 2020. – 31 студз. – С. 6.

17. **Щербаков, А. Д.** …И осталась учительницей / А. Д. Щербаков // Они не вернулись из боя... / А. Д. Щербаков. – Минск : Полымя, 1987. – С. 71–79.

## *Люты*



### ГЛАЗУНОЎ ПЁТР АЛЯКСЕЕВІЧ

*105 год з дня нараджэння*

*(1920)*

**Глазуноў Пётр Аляксеевіч** (1920–1992) – ваенны лётчык, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

Нарадзіўся 20 лютага 1920 года ў в. Петрачкі (зараз не існуе)



**15 сакавіка** – 95 гадоў таму (1930) нарадзіўся Алфёраў Жарэс Іванавіч (1930–2019), расійскі фізік, заснавальнік фізікі і электронікі паўправадніковых гетэраструктур. Акадэмік Расійскай АН, лаўрэат Нобелеўскай прэміі, ураджэнец г. Віцебска.

**16 сакавіка** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Міхоэлс Саламон Міхайлавіч (сапр. Воўсі; 1890–1948), акцёр, рэжысёр, педагог, народны артыст СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, ураджэнец г. Дзінабурга (Віцебская губерня, зараз – Даўгаўпілс, Латвія).

**16 сакавіка** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Сямёнаў Уладзімір Іванавіч (1905–1996) у г. Віцебску, інжынер, краязнаўца, ганаровы грамадзянін г. Петрапаўлаўска-Камчацкага, майстар спорту СССР па турызме, сапраўдны член Камчацкага аддзялення Рускага Геаграфічнага таварыства, знаўца і папулярызатар Камчаткі, заснавальнік спартыўнага турызму на Камчатцы.

**16 сакавіка** – 110 гадоў таму (1915) нарадзілася Вігдарава Фрыда Абрамаўна (1915–1965), расійская савецкая пісьменніца, журналістка і праваабаронца. Ураджэнка г. Оршы.

**18 сакавіка** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Грывусевіч Пётр Браніслававіч (1935–2020), беларускі мастак, ураджэнец Мядзельскага раёна Мінскай вобласці. Жыў у Наваполацку.

**19 сакавіка** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Грыб Тамаш Тамашавіч (1895–1938), дзеяч беларускага нацыянальна-дэмакратычнага адраджэння, ураджэнец в. Паляны Дзісенскага павета (зараз Мёрскі раён).

**19 сакавіка** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Касабуцкі Іван Сцяпанавіч (1895–1974), генерал-лейтэнант, удзельнік грамадзянскай вайны, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец г. Сянно.

**21 сакавіка** – 110 гадоў таму (1915) нарадзілася Курдзянок Зінаіда Валянцінаўна (1915–1985), беларуская актрыса, заслужаная артыстка Беларусі, ураджэнка г. Віцебска.

**21 сакавіка** – 95 гадоў таму (1930) нарадзілася Бабарыка Маіна Максімаўна (1930–2021), пісьменніца, паэтэса, журналіст, лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама (2015, 2020), ураджэнка г. Віцебска.

**23 сакавіка** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Базылевіч Аляксандр Мікіціч (1905–1987), адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, партыйны дзеяч Беларусі, ураджэнец в. Гарадзец Бешанковіцкага раёна.

**24 сакавіка** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Флёраў Іван Андрэевіч (1905–1941), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Расійскай Федэрацыі, ураджэнец с. Двурэчкі Тамбоўскай губерні (цяпер у Ліпецкай вобласці, Расія).

**24 сакавіка** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Пахомчык Ігар Сцяпанавіч (1960–2017), майстар разьбы па дрэве, ураджэнец г. Барань Аршанскага раёна.

**25 сакавіка** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Папковіч Уладзімір Антонавіч (1935–2021), педагог, паэт, перакладчык. Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама (2004). Ураджэнец в. Дварэц Вілейскага павета, Польшча (цяпер у Вілейскім раёне Мінскай вобласці), жыў у Віцебску.

**26 сакавіка** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Лізюкоў Аляксандр Ільіч (1900–1942), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза. Вызначыўся ў абарончых баях пад Барысавам і Оршай. Ураджэнец г. Гомеля.

**26 сакавіка** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Мацюшонак Міхаіл Міхайлавіч (1915–1978), Герой Сацыялістычнай Працы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец хут. Пятроўшчына Дзісенскага павета Віленскай губерні (цяпер у Глыбоцкім раёне).



5. **Коршунаў, А.** Імя Тані Марыненка / А. Коршунаў // Сцяг камунізму (Полацк). – 1972. – 9 мая. – С. 3.

6. **Малашеня, Л.** Навечно в памяти земляков : 100-летие Героя Советского Союза Татьяны Мариненко отмечают в эти дни на ее родине в Полоцком районе / Л. Малашеня // Витебские вести. – 2020. – 23 янв. – С. 6.

7. **Мариненко** Татьяна Савельевна // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 105.

8. **Мариненко** Татьяна Савельевна // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная типография, 2009. – С. 88.

9. **Мариненко** Татьяна Савельевна // Твои сыновья, Беларусь! Герои Советского Союза : биографический справочник / ред.: Ю. В. Баженов [и др.] ; худ. ред. П. В. Баранов. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2015. – С. 91–92.

10. **Марыненка Таццяна Савельеўна** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2000. – Т. 10 : Малайзія–Мугаджары. – С. 158.

11. **Марыненка** Таццяна Савельеўна // Памяць: Полацкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: І. Б. Каросцік, Р. І. Маслоўскі, А. Л. Петрашкевіч ; уклад. С. С. Чарняўская ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Вышэйшая школа, 1999. – С. 200–201.

12. **Нарейко, К**. Её звали Василёк / К. Нарейко // Полацкі веснік.– 2022. – 25 лістап. – С. 22.

13. **Новікаў. Ю. М.** Разведчыца «Няўлоўных» / Ю. М. Новікаў // Самы галоўны ўрок : настаўнікі Беларусі – героі Вялікай Айчыннай / склад. А. Л. Уліцёнак. – Мінск : Народная асвета, 1994. – С. 136–161.

14. **Орлова, С. Л.** Участие белорусских женщин-учителей в

захопнікамі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 8 мая 1965 года Марыненка Таццяне Савельеўне пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пахавана Т. С. Марыненка на вясковых могілках у в. Жарцы Зялёнкаўскага сельскага савета Полацкага раёна. На магіле ў 1965 годзе ўстаноўлены абеліск. Гэта ваеннае пахаванне лічыцца помнікам гісторыі, матэрыяльнай нерухомай каштоўнасцю рэгіянальнага значэння.

У Полацку ёй усталяваны бюсты – каля Полацкага каледжа УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», сярэдняй школы № 8 (бюст зроблены настаўнікам школы І. Р. Званковым у 1980 г.), у аграгарадку Зялёнка Полацкага раёна каля базавай школы, а на будынку каледжа – мемарыяльная дошка. Яе імем у 1974 годзе названа Зялёнкаўская сярэдняя школа, рашэннем ад 19 жніўня 1970 года – вуліца і пазней мікрараён ў Полацку.

З 1972 года ў Зялёнкаўскім сярэдняй школе (зараз Зялёнкаўская базавая школа імя Т. С. Марыненкі) працуе музей Баявой Славы, адзін з раздзелаў музейнай экспазіцыі прысвечаны Таццяне Савельеўне Марыненка.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Бегунова, Е.** Жарцы убивали дважды / Е. Бегунова // Рэспубліка. – 2024. – 18 студз. – С. 13.

2. **Дробышевский, В. П.** Звали ее васильком... / В. П. Дробышевский // Полацкі веснік. – 2015. – 30 студз. – С. 3.

3. **Жур, Л.** Імёны педагогаў-герояў у памяці народнай / Л. Жур // Настаўніцкая газета. – 2010. – 2 кастр. – С. 3.

4. **Кірэйшын, М. В.** Магіла Марыненка Таццяны Савельеўны / М. В. Кірэйшын // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш.]. – Мінск : БелСЭімя П. Броўкі, 1985. – С. 367–368.



**28 сакавіка** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Платонаў Канстанцін Міхайлавіч, грамадскі дзеяч Беларусі, генерал-маёр міліцыі, кандыдат эканамічных навук, ураджэнец г. Віцебска.

**29 сакавіка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзілася Дудзюк Зінаіда Іосіфаўна, пісьменніца, паэтэса, драматург, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Калесніка, Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Ураджэнка в. Слабодка Браслаўскага раёна.

## Красавік

65 гадоў таму (1960) заснавана «Тэлерадыёкампанія «Віцебск».

**1 красавіка** – 65 гадоў таму (1960) нарадзілася Вількіна Святлана Барысаўна, беларуская спартсменка і трэнер (шатакан каратэ-до), заслужаны майстар спорту Беларусі па каратэ-до, майстар спорту СССР па акрабатыцы, ураджэнка г. Віцебска.

**4 красавіка** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Шацько Вячаслаў Іванавіч, гісторык, палкоўнік у адстаўцы, кандыдат ваенных навук, прафесар кафедры ваеннай стратэгіі факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл Ваеннай Акадэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат ганаровага звання «Заслужаны спецыяліст Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь». Ураджэнец в. Замасточча Чашніцкага раёна.

**5 красавіка** – 70 гадоў таму (1955) нарадзілася Сухадольская Вера Пятроўна, мастак, займаецца аднаўленнем традыцый маляванак, ураджэнка г. Віцебска.

**5 красавіка** – 60 гадоў таму (1965) нарадзілася Парамыгіна Святлана Вячаславаўна, беларуская спартсменка (біятлон), выхаванка Віцебскай абласной СДЮШАР прафсаюзаў па зімовых відах спорту «Алімпіец», заслужаны майстар спорту Беларусі, срэбны прызёр XVII зімовых Алімпійскіх гульняў, чэмпіёнка Еўропы і свету. Ураджэнка г. Свярдлоўск, Расія.

**6 красавіка** – 155 гадоў таму (1870) нарадзіўся Абух Уладзімір Аляксандравіч (1870–1934), буйны дзеяч аховы здароўя ў савецкі час, вядомы рэвалюцыянер. Ураджэнец г. Віцебска.

**6 красавіка** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Шапіра Фёдар Львовіч (1915–1973), член-карэспандэнт АН СССР, прафесар, фізік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, ураджэнец г. Віцебска.

**7 красавіка** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Тараткевіч Міхаіл Васілевіч, беларускі філосаф, сацыёлаг, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі, доктар філасофскіх навук, ураджэнец в. Чарсцвяды Ушацкага раёна. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнік партызанскага руху.

**9 красавіка** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Нікалаеў Аляксандр Аляксандравіч (1925–2006), беларускі навуковец у галіне паталагічнай анатоміі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, працаваў у Віцебскім медыцынскім універсітэце (1956–2001), ураджэнец г. Віцебска.

**11 красавіка** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Глебаў Аляксандр Міхайлавіч (1955–2008), беларускі фотамастак, жыў у г. Віцебску.

**12 красавіка** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Судакоў Міхаіл Паўлавіч (1920–1943), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Глазуны Цвярской губерні (Расія).



партызанскім руху на тэрыторыі Полацкага раёна. Спачатку была сувязной падпольнай групы П. Я. Гукава. З вясны 1942 года, калі на часова акупаванай тэрыторыі БССР пачала дзейнічаць партызанская брыгада «Няўлоўныя» НКУС СССР – яна разведчыца і сувязная гэтай брыгады.

Т. С. Мартыненка прымала і распаўсюджвала зводкі Савінфармбюро, агітацыйную літаратуру, здабывала інфармацыю аб месцы знаходжання варожых гарнізонаў, перамяшчэнні воінскіх часцей праціўніка. З улікам яе звестак партызаны планавалі баявыя аперацыі, а таксама перадавалі інфармацыю камандаванню Чырвонай арміі.

Па ўспамінах паплечнікаў, Таццяну Марыненка адрознівала незвычайная вытрымка ў складаных абставінах, яна была надзейнай, адважнай, адказнай. Па сведчанні былога камандзіра аднаго з партызанскіх атрадаў брыгады «Няўлоўныя» П. Цішчанкі «Таня добра ведала мясцовасць. Рызыкуючы жыццём, пранікала на чыгуначную станцыю, у раён варожага аэрадрома, у камендатуру. Па яе дадзеных аб канцэнтрацыі войска камандаванне «Няўлоўных» выклікала савецкую авіяцыю, якая бамбіла фашыстаў на станцыях Полацак і Грамы… Апошняе яе важнае данясенне партызанам – аб падрыхтоўцы гітлераўцамі буйной карнай аперацыі».

28 ліпеня 1942 года па даносе правакатара ў в. Зялёнка прыбыў атрад карнікаў. Разам з Таццянай Марыненка былі арыштаваны 14-гадовы брат Лаўрэн і 28 аднавяскоўцаў, якія, пасля допытаў, 30 ліпеня былі расстраляныя. А Таццяну і яе брата вывезлі ў в. Жарцы, дзе ў памяшканні мясцовага аддзялення паліцыі працягнулі допыт. Трое сутак іх па-зверску катавалі. Знявечаная страшнымі мучэннямі, Таццяна ўсё ж змагла напісаць дзве запіскі, у якіх паведаміла імя здрадніка і папярэдзіла аб небяспецы партызанскім сувязным у горадзе. Не дамогшыся патрэбных звестак аб партызанах, 2 жніўня 1942 гады Таццяну і яе брата расстралялі на мясцовых могілках.

За праяўлены гераізм у барацьбе з нямецка-фашысцкімі

## Студзень



### МАРЫНЕНКА ТАЦЦЯНА САВЕЛЬЕЎНА

*105 год з дня нараджэння*

*(1920)*

**Марыненка Таццяна Савельеўна** (1920–1942) – удзельніца партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

Нарадзілася 25 студзеня 1920 года ў в. Сухі Бор (па іншых звестках на хутары каля в. Сухі Бор) Полацкага раёна ў сялянскай шматдзетнай сям'і Савелія Кузьміча і Ірыны Іванаўны, у якіх акрамя Таццяны было яшчэ пяцёра дзяцей. У перадваенныя гады сям'я перасялілася ў в. Зялёнка. Пасля заканчэння сямі класаў школы, Таццяна працягнула вучобу ў Полацкім педагагічным вучылішчы (зараз Полацкі каледж УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава») на аддзяленні «Пачатковая адукацыя». З 1939 года пачала працавала настаўніцай у сярэдняй школе ў в. Зялёнка Полацкага раёна (па іншых звестках настаўніцай пачатковых класаў у в. Лютаўка Зялёнкаўскага сельскага савета).

У гады Вялікай Айчыннай вайны Т. С. Мартыненка (партызанскі псеўданім «Васілёк») прыняла актыўны ўдзел у падпольным і



**13 красавіка** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Мацур Генадзь Іванавіч, графік, каліграф, лаўрэат рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў мастацтва кнігі, ураджэнец г. Чашнікі. Працаваў мастацкім рэдактарам, галоўным мастаком выдавецтва «Беларусь», выкладаў у Беларускай акадэміі мастацтваў.

**14 красавіка** – 110 гадоў таму (1915) нарадзілася Дубкова Марыя Лукінічна (1915–1989), прафсаюзны дзеяч, ураджэнка г. Полацка.

**14 красавіка** – 85 гадоў таму (1940) нарадзілася Астаповіч Наталля Іванаўна (1940–2005), беларускі вучоны ў галіне фізіялогіі і біяхіміі мікраарганізмаў, ураджэнка г. Оршы.

**16 красавіка** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Дзіклоў Уладзімір Уладзіміравіч, кандыдат навук у галіне інфармацыйных тэхналогій, з чэрвеня 2010 г. старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў энергетыкі, электратэхнічнай і паліўнай прамысловасці, ураджэнец г. Віцебска.

**16 красавіка** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Чэпік Мікалай Пятровіч (1960–1980), Герой Савецкага Саюза, воін-інтэрнацыяналіст, удзельнік баявых дзеянняў у Афганістане, ураджэнец в. Май Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. У Віцебску на тэрыторыі 103-й гвардзейскай асобнай мабільнай брыгады ўсталяваны помнік-бюст і адкрыты куток памяці М. П. Чэпіка.

**16 красавіка** – 60 гадоў таму (1965) нарадзіўся Жукаў Віктар Віктаравіч, мастак-аматар, ураджэнец г. Кіева. Захапляецца фатаграфіяй, скульптурай, кінамастацтвам, малюнкам і жывапісам. Жыве ў в. Новыя Гараны Полацкага раёна.

**18 красавіка** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Мілавідаў Ігар Мікалаевіч (1910–1984), генерал-лейтэнант артылерыі ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Падгароддзе Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Верхнядзвінскім раёне).

**20 красавіка** – 30 гадоў таму (1995) Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці пераўтвораны ў Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт.

**21 красавіка** – 190 гадоў таму (1835) нарадзіўся Вуль Ялегі Пранціш (сапраўднае імя Карафа-Корбут Элігій Францішак Маўрыкіевіч; 1835–1880-я гг.), беларускі паэт, ураджэнец г. Віцебска. У 1856–1862 гг. працаваў пісарам у Віцебскай палаце дзяржаўных маёмасцей.

**23 красавіка** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Егарэйчанка Аляксандр Андрэевіч (1955–2021), беларускі археолаг, доктар гістарычных навук, прафесар, ураджэнец г. Канатоп (Украіна). Праводзіў археалагічныя раскопкі на гарадзішчах Зазоны, Рацюнкі, Тарклова ў Браслаўскім Паазер'і.

**25 красавіка** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Савуцін Пётр Мацвеевіч (1925–1995), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец в. Вялікае Сяло Лёзненскага раёна.

**26 красавіка** – 65 гадоў таму (1960) нарадзілася Гінько Вольга Дзмітрыеўна, педагог, краязнаўца. Неаднаразова выбірался дэпутатам Віцебскага абласнога Савета, была дэлегатам IV, V і VI Усебеларускага народнага сходу. Лаўрэат ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2011». У 2022 г. узнагароджана ордэнам Францыска Скарыны. Ураджэнка в. Галінова Глыбоцкага раёна.

**27 красавіка** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Ананьеў Марцін Аляксеевіч (1900–1982), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Ісайкі Гарадоцкага павета (цяпер у Гарадоцкім раёне).

**27 красавіка** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Звераў Анатоль Міхайлавіч (1925–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Бахцямір Астраханскай губерні.



**20 снежня** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Марыкс Аскар Пятровіч (1890–1976), мастак тэатра, графік, педагог, адзін з заснавальнікаў беларускага прафесійнага дэкарацыйнага мастацтва, ураджэнец г. Львова (Украіна). Працаваў мастаком у Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

**20 снежня** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Гутковіч Аляксандр Захаравіч (Аляксандр Залманавіч; 1920–1989), беларускі рэжысёр тэлебачання, драматург, акцёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа і Беларускім тэатры юнага гледача, ураджэнец в. Вярхоўе Бешанковіцкага раёна.

**21 снежня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Ціханенкаў Іван Міхайлавіч (1935–2002), беларускі археолаг, ураджэнец в. Барсукі Калужскай вобласці (Расія). Даследаваў каменны век Падняпроўя і Падзвіння.

**22 снежня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзілася Мазала Ганна Васілеўна (1925–2013), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнка в. Закаліўе Лепельскага раёна.

**22 снежня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Рыбчынскі Віктар Антонавіч, беларускі акцёр, ураджэнец г. Полацка.

**28 снежня** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Верхаловіч Павел Міхайлавіч (1900–1952), савецкі военачальнік, генерал-лейтэнант, ураджэнец г. п. Шаркаўшчына.

**30 снежня** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Калінін Анатоль Сямёнавіч (1905–1965), беларускі вучоны ў галіне паталагічнай анатоміі і гісталогіі, доктар ветэрынарных навук, прафесар. У 1957–1965 гг. загадчык кафедры патанатоміі і гісталогіі Віцебскага ветэрынарнага інстытута.

**30 снежня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Ільіноў Анатоль Уладзіміравіч (1935–2020), беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец в. Царкаўшчына Віцебскага раёна (увайшла ў склад Віцебска).

**8 снежня** – 90 гадоў тату (1935) нарадзіўся Базыльчык Валянцін Вячаслававіч (1935–1993), вучоны ў галіне арганічнай хіміі, доктар хімічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Чувашыі. Ураджэнец г. Полацка.

**9 снежня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзілася Зінкевіч Ганна Браніславаўна, педагог, пісьменніца. Ураджэнка в. Рагачы Шчучынскага Гродзенскай вобласці, жыве ў в. Мярэцкія Глыбоцкага раёна.

**9 снежня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Пракаповіч Ігар Міхайлавіч, беларускі пісьменнік, краязнаўца, педагог. Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Лаўрэат ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2009». Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама, Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Ураджэнец г. Паставы.

**11 снежня** – 300 гадоў таму (1725) нарадзіўся Лускіна Стафан (1725–1793), журналіст, публіцыст, астраном, матэматык. Ураджэнец Віцебскага ваяводства ВКЛ.

**11 снежня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Зюбін Павел Пятровіч (1910–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Белгарада (Расія).

**12 снежня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Антусенка Фёдар Нічыпаравіч (1925–2012), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Мехавое Гарадоцкага раёна. Працаваў настаўнікам працоўнага навучання, вырабляў мэблю як сталярную, так і з рознай аздобай.

**12 снежня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзілася Дучыц Людміла Уладзіміраўна, беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук, ураджэнка г. Мінска. Даследуе гісторыю паўночна-заходніх зямель Полацкага княства, культавыя камяні, крыжы, археалагічную мікратапаніміку, этнічную сітуацыю на тэрыторыі Беларусі.



**27 красавіка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Козіч Пётр Серафімавіч, беларускі карыкатурыст, член Беларускага саюза мастакоў. У 1991–2010 гг. – мастацкі рэдактар гарадской газеты «Віцьбічы». Ураджэнец в. Юнькі Пастаўскага раёна.

**28 красавіка** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Казіміроўскі Саламон Савельевіч (1915–2011), беларускі рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ураджэнец г. Бабруйска. У 1940–1941 і 1967–1975 працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

**28 красавіка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Суханаў Аляксандр Сяргеевіч, прафсаюзны дзеяч, з 1987 г. намеснік старшыні Кастрычніцкага райвыканкама г. Віцебска, з 1997 намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама. З верасня 1999 г. старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

**28 красавіка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзілась Сулецкая Ніна Андрэеўна, музейны работнік, дырэктар Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (1979–1989), спецыяліст па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, краязнаўца, ураджэнка г. Віцебска.

**29 красавіка** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Чарвякоў Яўген Трафімавіч (1925–2016), машыніст, ганаровы чыгуначнік, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец г. п. Шуміліна. У 1976–1991 гг. машыніст-інструктар лакаматыўнага дэпо станцыі Віцебск Беларускай чыгункі.

# Май

55 гадоў таму (1970) адкрыты Бягомльскі музей народнай славы.

**1 мая** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Талмачоў Аляксей Емяльянавіч (1925–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Нова-Свініно Краснаярскага краю (Расія).

**1 мая** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Амбросенка Аляксей Пятровіч (1925–1991), аўтамеханік, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Марчанкі Гарадоцкага раёна.

**1 мая** – 95 гадоў таму (1930) нарадзіўся Даўгяла Алег Георгіевіч (1930–1986), беларускі вучоны ў галіне тэрапіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ураджэнец г. Полацка. З 1971 г. працаваў у Віцебскім медыцынскім інстытуце.

**1 мая** – 95 гадоў таму (1930) нарадзіўся Петрашкевіч Алесь (Аляксандр Лявонавіч; 1930–2012), беларускі пісьменнік, драматург, кандыдат гістарычных навук, заслужаны работнік культуры Беларусі, ураджэнец в. Пярэвалачня Талачынскага раёна.

**1 мая** – 80 гадоў таму (1945) нарадзілася Пячонкіна Ганна Сцяпанаўна, харавы дырыжор, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ураджэнка г. Віцебска.

**3 мая** – 80 гадоў таму (1945) нарадзілася Ляховіч Валянціна Антонаўна, беларускі мастак, член Саюза мастакоў СССР, Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнка ст. Дзівенская Гатчынскага раёна Ленінградскай вобл. (Расія). У 1974–2000 гг. выкладала ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце.



**3 снежня** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Губарэвіч Якаў Рыгоравіч (1905–1971), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, доктар ветэрынарных навук, прафесар. З 1959 г. загадчык кафедры акушэрства, гінекалогіі і штучнага абнасеньвання Віцебскага ветэрынарнага інстытута.

**4 снежня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Масцінскі Леанід Маркавіч, самадзейны мастак, ураджэнец в. Масцішча Лепельскага раёна. Да 1992 г. працаваў мастаком-афарміцелем у ЖЭК Будтрэста № 9 Віцебска, з 1994 г. жыве ў г. Лепелі.

**4 снежня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзілася Трафімава Галіна Уладзіміраўна, пісьменніца. Лаўрэат ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2014». Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама (2012, 2018, 2021). Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама (2020). Ураджэнка г. Оршы.

**5 снежня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Скапа Уладзімір Рыгоравіч (1935–1999), журналіст, галоўны рэдактар газеты «Віцебскі рабочы» (1983–1995), ураджэнец в. Сукрэмна Сенненскага раёна.

**6 снежня** – 225 гадоў таму (1800) нарадзіўся Пагарэльскі Платон Мікалаевіч (1800–1852), матэматык, педагог, ураджэнец Віцебскай губерні.

**6 снежня** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Шміт Яўген Альфрэдавіч (1920–2019), расійскі гісторык, археолаг, доктар гістарычных навук, заслужаны дзеяч навукі РФ, ураджэнец г. Рудня Смаленскай вобласці (Расія). Даследчык праблем этнагенезу, гаспадаркі і культуры развіцця плямёнаў верхняга Падняпроўя і Падзвіння.

**30 лістапада** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Вангін (Блажэвіч) Андрэй Аляксандравіч (1895–1977), беларускі акцёр, ураджэнец г. Відзы Ковенскай губерні (цяпер г. п. Відзы Браслаўскага раёна).

## Снежань

95 гадоў таму (1930) заснавана льночасальная фабрыка ў г. Оршы. З 2002 г. – рэспубліканскае ўнітарнае вытворча-гандлёвае прадпрыемства ў складзе канцэрна «Беллегпрам» Аршанскі льнокамбінат, буйнейшы ў Еўропе вытворца льняных тканін.

80 гадоў таму (1945) заснаваны завод ацяпляльных катлоў у г. Оршы, на базе якога ў 1952 г. арганізавана прадпрыемства па выпуску бытавых швейных машын і перайменавана ў завод лёгкага машынабудавання ў 1968 г. Зараз – завод «Легмаш», ААТ, у складзе холдынга «Беларуская металургічная кампанія».

**1 снежня** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Макараў Мікалай Акімавіч (1905–1975), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец г. Віцебска, двойчы ганаровы чыгуначнік, ганаровы гармадзянін г. Віцебска.

**2 снежня** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Гаўрыс Іван Трафімавіч (1890–1937), беларускі жывапісец, графік, педагог, уваходзіў у групу УНОВІС. У 1920–1930-я гады выкладаў у Віцебску. У 1922–1923 гг. – у Віцебскім народным мастацкім вучылішчы. Ураджэнец в. Кухчыцы Слуцкага павета Мінскай губерні (цяпер у Слуцкім раёне Мінскай вобласці).

**2 снежня** – 20 гадоў таму (2005) створана Віцебскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі ў г. Віцебску.



**3 мая** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Грушоў Вячаслаў Георгіевіч, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі». Ураджэнец г. Лагойск Мінскай вобласці.

**3 мая** – 35 гадоў таму (1990) утворана Упраўленне справамі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта рашэннем Віцебскага абласнога Савета народных дэпутатаў.

**4 мая** – 190 гадоў таму (1835) утвораны Віцебскі губернскі статыстычны камітэт, афіцыйная ўстанова ў Віцебску ў 1835–1836, 1853–1917, якая займалася зборам статыстычных звестак пра губерню, яе паветы, гарады, насельніцтва, прамысловасць, колькасць зямель і інш.

**5 мая** – 200 гадоў таму (1825) нарадзіўся Гарэцкі Фадзей (Тадэвуш) Антонавіч (1825–1868), жывапісец, ураджэнец в. Дусняты Віленскага павета (Літва). У 1848–1849 гг. жыў на Віцебшчыне.

**6 мая** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Рыжанкоў Мікалай Андрэевіч (1925–1944), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Кашына Уладзімірскай вобласці (Расія). Вызначыўся ў баях пры фарсіраванні р. Заходняя Дзвіна ў раёне в. Буй, в. Дварышча Бешанковіцкага раёна.

**7 мая** – 165 гадоў таму (1860) нарадзіўся Гарбачэўскі Іван Данілавіч (1860–1914), беларускі настаўнік, краязнаўца, гісторык, этнограф, пісьменнік, фалькларыст. У 1894–1898 гг. супрацоўнічаў з газетай «Витебские губернские ведомости».

**7 мая** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Рыжоў Іван Паўлавіч (1890–1938), партыйны і прафсаюзны дзеяч Беларусі. З 1923 г. сакратар Полацкага, Віцебскага павятовых камітэтаў партыі, з 1925 г. – Віцебскага акруговага камітэта КП(б)Б.

**7 мая** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Далжонак Арэст Васілевіч (1935–2016), беларускі дзеяч аматарскага мастацтва, харавы дырыжор, заслужаны работнік культуры Беларусі, ураджэнец в. Падомхі Дзісенскага павета, Польшча (цяпер у Докшыцкім раёне).

**7 мая** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Ліпчык Міхаіл Яўстаф'евіч, беларускі баяніст, заслужаны артыст Беларусі, ураджэнец г. Глыбокае.

**8 мая** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Жураў Віталь Мікалаевіч (1920–2010), дарожны майстар, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Іванаўка Гарадоцкага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

**10 мая** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Яронька Віктар Іванавіч (1920–1991), удзельнік Вялікай Айчынай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Полацка.

**10 мая** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Пярэднеў Уладзімір Пятровіч (1935–2000), навукоўца ў галіне агароднiцтва і аграхіміі, беларускі вучоны ў галіне агародніцтва і аграхіміі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій. Ураджэнец в. Пугачова Докшыцкага раёна.

**13 мая** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Манковіч Сцяпан Сцяпанавіч (1905–1978), прафсаюзны дзеяч, Герой Савецкага Саюза, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху. Ураджэнец в. Беразіно Барысаўскага павета Мінскай губерні (цяпер у Докшыцкім раёне).

**13 мая** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Падалінскі Аляксандр Мікалаевіч, беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец в. Старая Беліца Сенненскага раёна.



**25 лістапада** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Квіцінскі Вячаслаў Антонавіч (1920–1995), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Антавільна (цяпер уваходзіць у склад в. Зялёны востраў Лепельскага раёна).

**26 лістапада** – 185 гадоў таму (1840) нарадзіўся Кайгародаў Нестар Нічыпаравіч (1840–1916), ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант, вучоны, публіцыст, ураджэнец г. Полацка.

**26 лістапада** – 95 гадоў таму (1930) нарадзіўся Караткевіч Уладзімір Сяменавіч (1930–1984), класік беларускай літаратуры, паэт, празаік, драматург, кінасцэнарыст, публіцыст, перакладчык. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа. Ураджэнец г. Оршы.

**26 лістапада** – 25 гадоў таму (2000) адкрыты Аршанскі музей У. С. Караткевіча да 70-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры.

**28 лістапада** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Сіманаў Канстанцін (Кірыла) Міхайлавіч (1915–1979), рускі пісьменнік, ваенны карэспандэнт, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец Санкт-Пецярбурга. У Вялікую Айчынную вайну быў карэспандэнтам газеты «Красная звезда». Першыя рэпартажы з фронту зрабіў каля Барысава, Талачына і Оршы.

**28 лістапада** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Кузьміч Мікалай Пятровіч, беларускі мастак-ювелір, які аднавіў страчаны Крыж Еўфрасінні Полацкай. Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь. Ураджэнец в. Патрыкі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

**29 лістапада** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Амусін Іосіф Давыдавіч (1910–1984), расійскі савецкі гісторык, доктар гістарычных навук, усходазнаўца-гебраіст, даследчык Кумранскіх рукапісаў (скруткаў Мёртвага мора), заснавальнік кумраністыкі ў Расіі, папіролаг, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ураджэнец г. Віцебска.

**22 лістапада** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Бабіч Віктар Канстанцінавіч (1935–1997), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Зальхаўе Докшыцкага раёна.

**23 лістапада** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Хараборкін Рыгор Філімонавіч (1905–1941), Герой Савецкага Саюза (1940), камандзір танкавага батальёна, загінуў у танкавым баі на паўднёвы захад ад Віцебска на р. Чарнагосніца. Ураджэнец с. Алёшынка Арлоўскай губерні (цяпер у Бранскай вобласці, Расія). Пахаваны ў г. п. Бешанковічы.

**23 лістапада** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Міронаў Аляксандр Яўгенавіч (1910–1992), беларускі пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

**23 лістапада** – 105 гадоў таму (1920) нарадзілася Тусналобава-Марчанка Зінаіда Міхайлаўна (1920–1980), медык, удзельніца Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнка былога хутара Шаўцова Полацкага павета Віцебскай губерні (цяпер у Расонскім раёне). Ганаровы грамадзянін г. Полацка.

**24 лістапада** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Хваткоў Міхаіл Пятровіч (1925–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Лугавое (цяпер у межах г. Ульянаўска, Расія).

**25 лістапада** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Бескін Ізраіль Саламонавіч (1895–1964), савецкі военачальнік, генерал-лейтэнант артылерыі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Віцебска.

**25 лістапада** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Даўгаплоск Барыс Аляксандравіч (1905–1994), расійскі хімік-арганік, спецыяліст у галіне хіміі высокамалекулярных злучэнняў, акадэмік АН СССР, член-карэспандэнт, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Лукомль Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер аграгарадок у Чашніцкім раёне).



**14 мая** – 105 гадоў таму (1920) пачалася Майская аперацыя (14 мая – 8 чэрвеня 1920) – наступальная аперацыя савецкіх войск Заходняга фронту ў польска-савецкую вайну 1919–1920 гг.

**14 мая** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Данілаў Аляксандр Мікалаевіч, беларускі сацыёлаг, доктар сацыялагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, былы сакратар камітэта камсамола Віцебскага ветэрынарнага інстытута, загадчык аддзела Віцебскага абласнога камітэта ЛКСМ Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.

**15 мая** – 180 гадоў таму (1845) нарадзіўся Чэрскі Іван Дзяменцьевіч (1845–1892), геолаг, географ, удзельнік паўстання 1863–1864 гг., даследчык Сібіры. Ураджэнец ф. Свольна Дрысенскага павета (цяпер Верхнядзвінскі раён).

**15 мая** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Янушкоўскі Іван Іванавіч (1915–1944), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Пыжы Віцебскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Лёзненскім раёне).

**16 мая** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Ісачанка Уладзімір Рыгоравіч (1925–2011), заслужаны архітэктар Беларусі, ураджэнец г. Гомеля. Сярод яго работ (у калектыве аўтараў) – прафілакторый у г. Наваполацку.

**17 мая** – 180 гадоў таму (1845) нарадзіўся Нікіфароўскі Мікалай Якаўлевіч (1845–1910), беларускі этнограф-фалькларыст, асветнік, ураджэнец в. Вымна Суражскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Віцебскім раёне). Працаваў настаўнікам у народных вучылішчах і гімназіях Віцебска і Віцебскай губерні.

**17 мая** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Наталевіч Нікіфар (Нічыпар) Якаўлевіч (1900–1964), дзяржаўны дзеяч Беларусі, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР (1938–1948). Ураджэнец г. Оршы.

**17 мая** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Кузьмянкоў Аляксандр Яўсеевіч, прафсаюзны дзеяч, з 1979 г. дырэктар саўгаса «Ветрынскі» Полацкага раёна, ураджэнец в. Кроцікі Дубровенскага раёна. З 2005 г. старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу.

**18 мая** – 100 гадоў таму (1925) нарадзілася Юргель Соф`я Марцінаўна (1925–2007), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнка в. Казюкі Дзісенскага павета, Польшча (цяпер у Глыбоцкім раёне).

**19 мая** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Барадаўка Іван Міхайлавіч (1925–1996), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Зялёная Талачынскага раёна.

**21 мая** – 110 гадоў таму (1915) нарадзілася Фраленка Алена Уладзіміраўна (1915–1999), беларускі вучоны ў галіне ўнутранай медыцыны, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ураджэнка г. Дрыса (Верхнядзвінск).

**22 мая** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Каспяровіч Мікалай Іванавіч (1900–1937), беларускі этнограф, мовазнаўца, краязнаўца, літаратуразнаўца, гісторык культуры, мастацтвазнаўца, ураджэнец в. Ізабалёва Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер у Пухавіцкім раёне). У 1924–1926 гг. – інспектар Віцебскага аддзела народнай асветы, адзін са стваральнікаў і старшыня Віцебскага абласнога таварыства краязнаўства.

**24 мая** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Заслаўскі Яўген Львовіч (1920–2007), беларускі архітэктар, ураджэнец г. Александрыя Кіраваградскай вобласці (Украіна). Заслужаны архітэктар Беларусі, кандыдат архітэктуры. Сярод асноўных работ (суаўтарскія) – мост цераз р. Заходняя Дзвіна ў г. Віцебску.

**24 мая** – 70 гадоў таму (1955) нарадзілася Арлова Ганна Пятроўна (1955–2020), беларускі навуковец у галіне педагогікі, доктар педагагічных навук, прафесар, ураджэнка г. Віцебска.



**19 лістапада** – 185 гадоў таму (1840) нарадзіўся Кавалеўскі Аляксандр Ануфрыевіч (1840–1901), біёлаг, адзін з заснавальнікаў параўнальнай эмбрыялогіі і фізіялогіі безпазваночных жывёл, ураджэнец с. Шусцянцы Дынабургскага павета Віцебскай губерні.

**19 лістапада** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Дарашэвіч Міхаіл Васілевіч (1900–1968), дзяржаўны дзеяч, вучоны-геадэзіст, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

**19 лістапада** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Высагорац Міхаіл Амосавіч (1920–1996), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Стрыжава Бешанковіцкага раёна.

**20 лістапада** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Апіёк Мікалай Апанасавіч, беларускі тэатральны мастак, жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ганаровы акадэмік Расійскай акадэміі мастацтваў. Ураджэнец в. Макараўка Дубровенскага раёна.

**20 лістапада** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Ткачонак Аляксандр Леанідавіч, акцёр тэатра і кіно, народны артыст Беларусі, ураджэнец г. Чашнікі.

**21 лістапада** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Суднік Міхаіл Раманавіч (1910–1995), беларускі мовазнаўца, член-карэспандэнт НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Ураджэнец в. Пецюлёва Лепельскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Полацкім раёне).

**22 лістапада** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Лісіцкі Лазар Маркавіч (Лейзер Мардухавіч, Эль Лісіцкі; 1890–1941), мастак-канструктар, графік, архітэктар, прафесар, ураджэнец с. Пачынок Смаленскай вобласці. У 1919–1921 гг. выкладаў у Віцебскім народным мастацкім вучылішчы. Сумесна з Казімірам Малевічам распрацоўваў асновы супрэматызму.

**14 лістапада** – 175 гадоў таму (1850) нарадзіўся Кірпічоў Ніл Львовіч (1850–1927), ваенны вучоны, інжынер-генерал, прафесар, ураджэнец г. Полацка. Скончыў Полацкі кадэцкі корпус.

**14 лістапада** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Анісімаў Іван Ерамеевіч (1920–1986), Герой Сацыялістычнай Працы, з 1970 г. старшыня калгаса імя Цітова Мёрскага раёна Віцебскай вобласці. Ураджэнец в. Балонаў Сялец Магілёўскай вобласці.

**14 лістапада** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Шкуратаў Ігар Мікалаевіч, беларускі акварэліст, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец г. Ашмяны Гродзенскай вобласці. У 1993–2008 гг. выкладаў у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава.

**14 лістапада** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Шалыга Мікалай Уладзіміравіч, вучоны ў галіне малекулярнай біяфізікі і біяхіміі, доктар біялагічных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі, ураджэнец в. Краснае Ушацкага раёна.

**15 лістапада** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Кісялёў Георгій Пятровіч (1935–2017), беларускі мастак, ураджэнец г. Антрацыт Луганскай вобласці. З 1967 г. галоўны мастак г. Віцебска, у 1973–1992 гг. – галоўны мастак віцебскіх вытворча-мастацкіх майстэрняў, камбіната «Мастацтва».

**15 лістапада** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Чылінгаран Хачык Арташавіч, мастак-разьбяр; ураджэнец г. Еравана (Арменія). Зараз жыве ў г. п. Ветрына Полацкага раёна.

**17 лістапада** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Бахцін Міхаіл Міхайлавіч (1895–1975), рускі філосаф, культуролаг, літаратуразнаўца, лінгвіст. У 1920–1924 гг. жыў у Віцебску, выкладаў у педінстытуце і кансерваторыі, выступаў з публічнымі лекцыямі. Ураджэнец г. Арол (Расія).



**25 мая** – 95 гадоў таму (1930) нарадзіўся Дземянцей Мікалай Іванавіч (1930–2018), дзяржаўны дзеяч Беларусі, старшыня Вярхоўнага Савета БССР (1990–1991). Ураджэнец в. Хотліна Чашніцкага раёна.

**25 мая** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Штукін Сяргей Сяргеевіч, навукоўца ў галіне лесаводства, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. Ураджэнец в. Казьяны Шумілінскага раёна.

**27 мая** – 60 гадоў таму (1965) нарадзіўся Рыктар Юрый Фёдаравіч, беларускі спартсмен (воднальжны спорт), заслужаны майстар спорту Беларусі, чэмпіён Еўропы, чэмпіён свету, ураджэнец г. Наваполацка. З 2005 г. трэнер-выкладчык спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву па воднальжным спорце імя Н. Л. Генова.

**30 мая** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Трус Анатоль Міхайлавіч (1910–1989), акцёр Беларускага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, ураджэнец в. Нізок Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер у Уздзенскім раёне Мінскай вобласці).

**31 мая** – 175 гадоў таму (1850) нарадзіўся Мяніцкі Вінцэнт (1850–1916), гісторык, археограф, ураджэнец фальварка Селігоры Лепельскага павета.

## Чэрвень

**3 чэрвеня** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Шафранскі Канстанцін Іванавіч (1895–1941), адзін з кіраўнікоў проціпаветранай абароны (ППА) Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, палкоўнік, ураджэнец в. Кісялёва Талачынскага раёна.

**3 чэрвеня** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Гугель Адольф Самойлавіч (1915–1999), беларускі мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча (1936–1940). Ураджэнец г. Вена.

**5 чэрвеня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзілася Герасімовіч Эльвіра Пятроўна (1925–2015), беларускі тэатральны дзеяч, прафесар, кандыдат мастацтвазнаўства, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Даследавала творчасць Беларускага тэатра імя Я. Коласа ў 1926–1941 гг.

**6 чэрвеня** – 120 гадоў таму (1905) была прынята пастанова аб заснаванні ў Лепелі Марыінскага жаночага чатырохкласнага вучылішча. Адкрылася ў другой палове 1906 года. Існавала да 1917 г.

**6 чэрвеня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Дудараў Аляксей Ануфрыевіч (1950–2023), драматург, сцэнарыст, перакладчык, тэатральны дзеяч, акцёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ураджэнец в. Кляны Дубровенскага раёна.

**7 чэрвеня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Чуяшоў Віктар Іванавіч, беларускі філосаф, доктар філасофскіх навук, прафесар, ураджэнец г. Полацка.

**10 чэрвеня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Цароў Уладзімір Пятровіч, беларускі вучоны ў галіне ўнутраных хвароб, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ураджэнец Гарадоцкага раёна.

**12 чэрвеня** – 150 гадоў таму (1875) нарадзіўся Адамаў Уладзімір Уладзіміравіч (1875–1937), батанік, адзін з першых даследчыкаў расліннасці Беларусі, ураджэнец Санкт-Пецярбурга. Заснаваў Вялікалятчанскі батанічны сад у в. Вялікія Лётцы Віцебскага раёна і батанічны сад БДУ.

**12 чэрвеня** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Родзевіч Леапольд Іванавіч (1895 – пасля 1938), пісьменнік, выдавец, грамадскі дзеяч, ураджэнец фальварка Кур'янаўшчына (цяпер Лагойскі раён). Удзельнічаў у Першай беларускай трупе Ігната Буйніцкага.



**7 лістапада** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Чкалаў Валерый Барысавіч (1945–2015), краязнаўца, саветнік па лініі МУС падчас вайны ў Афганістане, першы навуковы супрацоўнік і аўтар навуковай канцэпцыі Віцебскага гарадскога музея воінаў-інтэрнацыяналістаў, прымаў актыўны ўдзел у стварэнні экспазіцый музеяў РУП «Віцебскэнерга», музея гісторыі камсамола ў г. Наваполацку і інш. Ураджэнец г. Ульянаўск (Расія).

**8 лістапада** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Пачопка Янка (Пачопка Янка; 1890–1977), беларускі пісьменнік, фалькларыст, ураджэнец в. Летнікі Дзісенскага павета Віленскай губерні (цяпер у Глыбоцкім раёне).

**9 лістапада** – 95 гадоў таму (1930) нарадзіўся Шпіт Юрый Васілевіч (1930–2008), заслужаны архітэктар Беларусі, ураджэнец г. Запарожжа (Украіна). Сярод яго работ – мемарыяльны комплекс у гонар воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў Віцебшчыны і кінатэатр «Беларусь» у г. Віцебску, а таксама шэраг праектаў планіроўкі і забудовы асобных раёнаў у Наваполацку.

**10 лістапада** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Каржанеўскі Антон Станіслававіч (1910–1991), беларускі мастак, ураджэнец в. Валынцы Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Верхнядзвінскім раёне).

**11 лістапада** – 70 гадоў таму (1955) нарадзілася Тычко Галіна Казіміраўна, беларускі літаратуразнаўца, крытык, доктар філалагічных навук, прафесар, ураджэнка в. Сташулі Мёрскага раёна.

**12 лістапада** – 80 гадоў таму (1945) таму заснаваны Беларускі электратэхнікум сувязі ў г. Пінску. У 1957 г. пераведзены ў г. Віцебск. З 1991 г. перайменаваны ў Віцебскі тэхнікум сувязі, з 1993 г. – Віцебскі філіял Вышэйшага каледжа сувязі, з 2015 г. –Віцебскі філіял Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі.

**2 лістапада** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Каробкін Уладзімір Андрэевіч, беларускі канструктар і вучоны ў галіне машынабудавання, доктар тэхнічных навук, лаўрэат Ленінскай прэміі, заслужаны работнік прамысловасці Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

**2 лістапада** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Кузьміч Міхаіл Пятровіч (1950–2021), беларускі публіцыст, літаратурны крытык, кандыдат філасофскіх навук, выдатнік друку Беларусі, ураджэнец в. Пагост Гомельскай вобласці. З'яўляецца аўтарам літаратурна-крытычных артыкулаў пра пісьменнікаў Віцебшчыны.

**3 лістапада** – 95 гадоў таму (1930) нарадзіўся Геноў Мікалай Леанідавіч (1930–2002), беларускі трэнер па воднальіжным спорце, заслужаны трэнер БССР, ганаровы грамадзянін г. Наваполацка, ураджэнец г. Полацка.

**4 лістапада** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Крайзер Якаў Рыгоравіч (1905–1969), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, генерал арміі, ураджэнец г. Варонеж (Расія). У ліпені 1941 г. удзельнічаў у абарончых баях за Барысаў і Оршу.

**5 лістапада** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Немянёнак Баляслаў Мячыслававіч, беларускі навуковец у галіне металургіі і ліцейнай вытворчасці, доктар тэхнічных навук, прафесар, ураджэнец в. Павяцце Мёрскага раёна.

**6 лістапада** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Фядосаў Уладзімір Васілевіч (1950–2011), ваенны дзеяч, вучоны-эканаміст, кандыдат эканамічных навук, ганаровы архівіст Беларусі, ураджэнец в. Вялікая Выдрэя Лёзненскага раёна.

**7 лістапада** – 95 гадоў таму (1930) выйшаў першы нумар газеты «Прымежны калгаснік» (Ушацкі раён). У 1945–1962 – «Сацыялістычны шлях», з 1967 – «Патрыёт».



**12 чэрвеня** – 95 гадоў таму (1930) нарадзіўся Янкоўскі Антон Антонавіч (1930–2002), беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, ураджэнец г. Полацка.

**13 чэрвеня** – 55 гадоў таму (1970) нарадзіўся Прусаў Алег Віктаравіч (1970–1996), беларускі мастак, адзін са стваральнікаў віцебскай групы «УБИКУС», ураджэнец г. Віцебска.

**14 чэрвеня** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Сербента Віталь Андрэевіч (1895–1980), беларускі гісторык і філосаф, ураджэнец в. Люкяй Марыямпальскага павета (Літва). У 1924–1925 гг. быў загадчыкам Віцебскай губсаўпартшколы.

**15 чэрвеня** – 235 гадоў таму (1790) нарадзіўся Плятэр Адам Аўгусцінавіч (Броэль-Плятэр; 1790–1862), археолаг, краязнаўца, калекцыянер, ураджэнец м. Краслава Дынабургскага павета (Латвія). Быў куратарам школ Дынабургскага павета Віцебскай губерні, падарожнічаў па Заходняй Дзвіне і абследаваў Падзвінне.

**15 чэрвеня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Жораў Абрам Ільіч (1910–1944), беларускі скульптар. У 1928–1929 гг. член Віцебскага аб'яднання моладзі Асацыяцыі мастакоў рэвалюцыі. Ураджэнец г. Магілёва.

**15 чэрвеня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Яблачкін Дзмітрый Міхайлавіч (1910–1982), удзельнік вызвалення Лёзненскага раёна ў Вялікую Айчынаю вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Верхні Ікорац Варонежскай губерні (Расія).

**17 чэрвеня** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Радута Фёдар Міхайлавіч (1890–1966), ваенны дзеяч, генрал-маёр інтэнданцкай службы, удзельнік грамадзянскай, савецка-фінляндскай 1939–1940 гг. і Вялікай Айчыннай войнаў, ураджэнец г. Дуброўна.

**18 чэрвеня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Кажарскі Леанід Аляксандравіч, беларускі спявак (тэнар), ураджэнец г. п. Багушэўск Сенненскага раёна. З 1989 г. вядучы саліст-вакаліст Віцебскай абласной філармоніі.

**20 чэрвеня** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Паўлаў Якаў Савельевіч (1940–1996), беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, ураджэнец в. Самуйлы Браслаўскага раёна.

**20 чэрвеня** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Пятроў Мікалай Якаўлевіч, беларускі навуковец у галіне фізічнай культуры, кандыдат біялагічных навук, прафесар, заслужаны трэнер Беларусі, ураджэнец в. Юкава Дубровенскага раёна.

**21 чэрвеня** – 90 гадоў таму (1935) утворана Лепельская акруга (1935–1938), адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў БССР.

**21 чэрвеня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Пшонка Аляксей Яўгенавіч, беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў, ураджэнец г. Лепеля.

**22 чэрвеня** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Ткачоў Іван Лявонцьевіч (1920–1985), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец в. Лындзіна Лёзненскага раёна.

**22 чэрвеня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Будзіч Іван Мікалаевіч, майстар разьбы па дрэве, ураджэнец в. Парэчча Докшыцкага раёна. Зараз жыве ў Лепелі.

**23 чэрвеня** – 30 гадоў таму (1995) адкрыўся для наведвальнікаў Аршанскі этнаграфічны музей «Млын», філіял Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны.

**24 чэрвеня** – 80 гадоў таму (1945) нарадзілася Віслабокава Надзея Станіславаўна (1945–2013), беларускі педагог, доктар педагагічных навук, прафесар, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Ураджэнка г. Рэчыцы. Працавала ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце.



**29 кастрычніка** – 60 гадоў таму (1965) заснаваны музей Обальскага камсамольскага падполля, як Рэспубліканскі музей камсамольскай славы ў г. п. Обаль. З 1985 г. сучасная назва. З 2002 г. філіял Шумілінскага гісторыка-краязнаўчага музея.

**30 кастрычніка** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Бембель Андрэй Ануфрыевіч (1905–1986), беларускі скульптар, ураджэнец г. Веліжа Віцебскай губерні (цяпер Смаленская вобласць, Расія). Вучыўся ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме ў 1924–1927 гг.

**30 кастрычніка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Голуб Іван Антонавіч, навуковец у галіне льнаводства, акадэмік НАН Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі, прафесар. Ураджэнец в. Пад'ясенка Магілёўскай вобласці. З 2001 г. дырэктар РУП «Інстытут ільну».

**31 кастрычніка** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Дасужаў Аляксандр Ігаравіч (1945–2014), беларускі мастак, член Беларускага Саюза мастакоў. Ураджэнец в. Пухавічы Мінскай вобласці, жыў і працаваў ў Віцебску, быў членам творчага аб'яднання «Квадрат».

## Лістапад

95 гадоў таму (1930) у г. Лепелі пачала выдавацца газета «Калгасная праўда». Пазней яна называлася «Ленінскі сцяг». Сучасная назва (з 1992 г.) – «Лепельскі край», раённая газета.

80 гадоў таму (1945) заснаваная Мёрская цэнтральная раённая бібліятэка.

**1 лістапада** – 135 гадоў таму (1890) нарадзіўся Святагор Кузьма Піліпавіч (1890–1917), ваенны лётчык, удзельнік Першай сусветнай вайны, Георгіеўскі кавалер, ураджэнец Віцебскай губерні.

**23 кастрычніка** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Чудакоў Алег Парфір`евіч (1940–2021), беларускі вучоны ў галіне сківічна-тварнай і пластычнай хірургіі, хірургічнай стаматалогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, ураджэнец г. п. Сураж Віцебскага раёна.

**24 кастрычніка** – 155 гадоў таму (1870) створана Віцебскае дабрачыннае таварыства для паляпшэння маральнага і матэрыяльнага стану бедных жыхароў.

**26 кастрычніка** – 215 гадоў таму (1810) нарадзіўся Дмахоўскі Генрых Міхайлавіч (1810–1863), беларускі скульптар, ураджэнец маёнтка Забалоцце Дзісенскага павета Віленскай губерні (цяпер в. Забалоцце ў Мёрскім раёне). У час паўстання 1863–1964 гг. паўстанцкі камісар Дзісенскага павета і начальнік атрада.

**26 кастрычніка** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Каранеўскі Мікалай Аляксандравіч (1910–1978), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, генерал-палкоўнік, адзін з кіраўнікоў савецкай ваеннай разведкі, ураджэнец г. Дрыса (Верхнядзвінск).

**27 кастрычніка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзілася Вароніна Таццяна Міхайлаўна, краязнаўца з г. Оршы, адзін са складальнікаў вучэбнага дапаможніка «Мой родны край – Аршаншчына».

**27 кастрычніка** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Вайцяхоўскі Юрый Леанідавіч, расійскі геолаг, матэматык і гісторык навукі, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар. У 2007–2017 гг. узначальваў Геалагічны інстытут Кольскага навуковага цэнтра Расійскай акадэміі навук. З 2018 г. – загадчык кафедры Санкт-Пецярбургскага горнага ўніверсітэта. Ураджэнец. г. п. Лынтупы Пастаўскага раёна.

**28 кастрычніка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Дундзін Мікалай Мікалаевіч, беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў, адзін з заснавальнікаў творчага аб'яднання «Квадрат». Ураджэнец в. Чырвоны Бор Магілёўскай вобласці, жыве ў Віцебску.



**24 чэрвеня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Бандарэвіч Васіль Віктаравіч, педагог, краязнаўца, мастак, ураджэнец в. Новая Беліца Сенненскага раёна.

**24 чэрвеня** – 60 гадоў таму (1965) заснаваны Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці. У 1995 г. пераўтвораны ў Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт.

**25 чэрвеня** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Пятрусь Броўка (Пётр Усцінавіч; 1905–1980), народны паэт Беларусі, грамадскі дзеяч, Герой Сацыялістычнай Працы. Ураджэнец в. Пуцілкавічы Барысаўскага павета Мінскай губерні (цяпер ва Ушацкім раёне).

**26 чэрвеня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Емяльянаў Анатоль Серафімавіч (1935–2018), фалькларыст, педагог, кандыдат філалагічных навук. Ураджэнец в. Боркі Панізаўскага раёна Смаленскай вобласці (Расія). З 1966 г. быў выкладчыкам Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

**26 чэрвеня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзілася Маленчанка Рыма Фёдараўна, заслужаная артыстка Беларусі, педагог, прафесар, ураджэнка г. Оршы.

## Ліпень

35 гадоў таму (1990) заснавана газета «Народнае слова» Віцебскім абласным Саветам дэпутатаў. Выдавалася да ліпеня 2013 года. Рэдакцыі абласных газет «Віцебскі рабочы» і «Народнае слова» рэарганізаваны ў рэдакцыю абласной газеты «Витебские вести».

**1 ліпеня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Юр'еў Зіновій Юравіч (сапр. Грынман Зяма Юдавіч) (1925–2020), беларускі і рускі пісьменнік-фантаст, ураджэнец г. Чашнікі.

**2 ліпеня** – 105 гадоў тагу (1920) нарадзіўся Лісіцын Міхаіл Аркадзевіч (Майсей Айзікавіч) (1920–2004), дзеяч самадзейнага мастацтва, музыкант, дырыжор, педагог, заслужаны работнік культуры Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.

**5 ліпеня** – 135 гадоў таму (1890) у Віцебску была зроблена ўрачыстая закладка будынка і пачалося ўзвядзенне новага памяшкання для мужчынскага духоўнага вучылішча. Зараз будынак з'яўляецца адным з корпусаў Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**7 ліпеня** – 125 гадоў таму (1900) нарадзілася Гарэцкая Ганна Савельеўна (1900–1980), звеннявая па вырошчванні лёну ў калгасе «Расоны», Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнка в. Верацюгі Расонскага раёна. Удзельнік партызанскага руху на Расоншчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947–1951 гадах.

**7 ліпеня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Крошкін Алег Уладзіміравіч (1950–2020), беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец пас. Сокал-Долінскі Сахалінскай вобласці (Расія). Скончыў Віцебскі педагагічны інстытут. Жыў у Віцебску.

**7 ліпеня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Касаткін Валерый Аляксеевіч, юрыст, пісьменнік. Ураджэнец в. Семянцава Смаленскай вобласці, жыве ў г. Віцебску.

**9 ліпеня** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Булкін Васіль Аляксандравіч (1945–2017), расійскі археолаг і гісторык, кандыдат гістарычных навук, ураджэнец г. Санкт-Пецярбурга. Прымаў удзел у раскопках у Полацку, Мазыры, Янкавічах (Расонскі раён).

**10 ліпеня** – 185 гадоў таму (1840) нарадзіўся Кірпічоў Леў Львовіч (1840–1890), ваенны вучоны, генерал-маёр артылерыі, прафесар, ураджэнец г. Полацка. Скончыў Полацкі кадэцкі корпус.



**15 кастрычніка** – 85 гадоў таму (1940) нарадзілася Бестава Серафіма Апанасаўна, пісьменніца, ураджэнка в. Гараны Аршанскага раёна.

**17 кастрычніка** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Якаўлеў Фама Паўлавіч (1900–1971), генерал-лейтэнант, член Ваеннага савета Далёкаўсходняга фронту, ураджэнец в. Града Віцебскага раёна.

**17 кастрычніка** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Мядзель Міхаіл Маркавіч (1910–1981), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Задзежжа Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Верхнядзвінскім раёне).

**18 кастрычніка** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Гераіменка Уладзімір Аляксандравіч, беларускі філосаф, доктар філасофскіх навук, ураджэнец в. Зарубы Дубровенскага раёна.

**19 кастрычніка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Васкоўскі Міхаіл Васілевіч (1950–2012), майстар-кераміст, народны майстар Рэспублікі Беларусь, ураджэнец в. Ільінка Талачынскага раёна.

**20 кастрычніка** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Шуманскі Міхаіл Рыгоравіч (1920–1982), спявак (тэнар), заслужаны артыст Беларусі, ураджэнец в. Пераброддзе Браслаўскага павета, Польшча (цяпер у Мёрским раёне).

**20 кастрычніка** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Каласоўскі Юрый Уладзіміравіч, беларускі археолаг, ураджэнец г. Унеча Бранскай вобласці (Расія). Даследаваў археалагічны комплекс Вежкі, гарадзішчы Германы, Ірвянца, Панізоўе, Чырына ў Дубровенскім раёне, археалагічны помнік у Віцебску.

**22 кастрычніка** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Вядэнка Віктар Антонавіч (1910–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Вісунск (цяпер Нікалаеўская вобласць, Украіна).

**11 кастрычніка** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Шакулаў Рыгор Логінавіч (1910–1987), беларускі пісьменнік, ураджэнец в. Паўлавічы Віцебскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Віцебскім раёне).

**12 кастрычніка** – 160 гадоў таму (1865) нарадзіўся Анцаў Міхаіл Васілевіч (1865–1945), беларускі кампазітар, харавы дырыжор, педагог, адзін з арганізатараў Віцебскай народнай кансерваторыі, ураджэнец г. Смаленска (Расія). З 1896 г. жыў у Віцебску, выкладаў харавыя спевы ў розных навучальных установах.

**12 кастрычніка** – 135 гадоў таму (1885) нарадзіўся Дземідзенка Іван Пятровіч (1885 –?), поўны Георгіеўскі кавалер, удзельнік Першай сусветнай вайны, ураджэнец Гарадоцкага павета Віцебскай губерні.

**13 кастрычніка** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Жалезнікаў Карп Апанасавіч (1895–1957), ваенны дзеяч, удзельнік Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, ураджэнец г. Оршы.

**13 кастрычніка** – 95 гадоў таму (1930) нарадзіўся Шнэйдар Анатоль Антонавіч (1930–2021), краязнавец, кінадакументаліст, публіцыст, культуролаг, ураджэнец в. Парэчча Талачынскага раёна.

**14 кастрычніка** – 165 гадоў таму (1860) нарадзіўся Багдановіч Ангел Іванавіч (1860–1907), удзельнік рэвалюцыйнага руху, публіцыст, крытык, рэдактар, ураджэнец г. Гарадка.

**14 кастрычніка** – 60 гадоў таму (1965) нарадзілася Унукава Алена Леанідаўна, беларуская актрыса, тэлевядучая, уражэнка г. Віцебска.

**15 кастрычніка** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Чабатароў Раман Сямёнавіч (1905–1981), беларускі вучоны ў галіне паразіталогіі, доктар ветэрынарных навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі. Ураджэнец в. Старынка Ушацкага раёна.



**10 ліпеня** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Сергіевіч Пётр Аляксандравіч (1900–1984), беларускі і літоўскі жывапісец, графік, мастак-манументаліст, заслужаны дзеяч мастацтваў Літвы, ураджэнец в. Стаўрова Дзісенскага павета Віленскай губерні (цяпер у Браслаўскім раёне).

**10 ліпеня** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Забянькоў Ігар Іванавіч, вучоны у галіне радыётэхнікі, доктар тэхнічных навук, прафесар, выдатнік адукацыі Беларусі, ураджэнец г. п. Бягомль Докшыцкага раёна.

**12 ліпеня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Ляўкоў Пётр Маркавіч (1910–1968), поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец в. Аляксандраўка Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Слаўгарадскім раёне Магілёўскай вобласці). На Віцебшчыне вызначыўся падчас вайсковых аперацый 1943–1944 гг. на тэрыторыі Аршанскага і Дубровенскага раёнаў.

**13 ліпеня** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Ключнікаў Аляксандр Сяргеевіч (1945–2014), беларускі вучоны ў галіне мікрахвалевай радыёфізікі і інфарматыкі, доктар тэхнічных навук, прафесар. У 1988–1993 гг. – рэктар, у 1993–1998 гг. заг. кафедры Віцебскага тэхналагічнага інстытута лёгкай прамысловасці. У 1999–2000 гг., 2006–2012 гг. – заг. кафедры інжынернай фізікі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

**14 ліпеня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Шнітко Святаслаў Мікалаевіч, беларускі навуковец у галіне хірургіі і арганізацыі ваеннай аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук, прафесар, палкоўнік медыцынскай службы, заслужаны ўрач Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.

**15 ліпеня** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Дубоўка Уладзімір Мікалаевіч (1900–1976), беларускі паэт, празаік, перакладчык, крытык, ураджэнец в. Агароднікі Вілейскага павета Віленскай губерні (цяпер у Пастаўскім раёне).

**15 ліпеня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Мяснікоў Анатоль Фёдаравіч (1950–2011), беларускі вучоны-гісторык, літаратар, публіцыст, кандыдат гістарычных навук, ураджэнец в. Шмідзельшчына Талачынскага раёна.

**18 ліпеня** – 295 гадоў таму (1730) нарадзіўся Катэнбрынг Юзаф (1730 – пасля 1804), польскі пісьменнік, педагог, ураджэнец Польшчы. З 1749 г. выкладаў рыторыку і паэтыку на тэрыторыі Беларусі, у т. л. і ў Полацку.

**19 ліпеня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзілася Кавалёва Ніна Уладзіміраўна, беларуская мастачка, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнка п. Завідава Калінінскай вобласці (Расія). Скончыла мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава. Жыве ў Віцебску.

**20 ліпеня** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Коган Уладзімір Львовіч (1920–1995), беларускі спартсмен і трэнер па боксе, ураджэнец г. Дуброўна.

**20 ліпеня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Тарабука Леанід Мікалаевіч, беларускі скульптар, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец г. Віцебска. У 1997–2011 гг. выкладаў у Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце.

**22 ліпеня** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Сухі Павел Восіпавіч (1895–1975), авіяканструктар, адзін са стваральнікаў рэактыўнай і звышгукавай авіяцыі, доктар тэхнічных навук, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы, удзельнік Першай сусветнай вайны, ураджэнец г. Глыбокае.

**22 ліпеня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Абраменка Дзмітрый Кузьміч (1910–1981), поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец в. Філіпкава Віцебскага павета (цяпер у Віцебскім раёне).



**4 кастрычніка** – 275 гадоў таму (1750) нарадзіўся Князьнін Францішак Дыянізы (1750–1807), паэт, драматург, перакладчык, ураджэнец г. Віцебска.

**4 кастрычніка** – 225 гадоў таму (1800) нарадзіўся Гарбачэўскі Іван Іванавіч (1800–1869), рэвалюцыянер-дзекабрыст, мемуарыст, выхаванец Віцебскай гімназіі (1808–1817), ураджэнец Магілёўшчыны.

**4 кастрычніка** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Манькоўскі Іван Васілевіч (1895–1943), Герой Сацыялістычнай Працы, з 1917 г. старшы механік сувязі на лініі Віцебск–Арол, ураджэнец г. Оршы.

**5 кастрычніка** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Максіменка Аляксей Пятровіч (1905–1959), адзін з кіраўнікоў Аршанскага і Віцебскага антыфашысцкага падполля ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец г. Орск Арэнбургскай вобл. (Расія).

**5 кастрычніка** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Саладкоў Аляксандр Пятровіч (1960–2013), беларускі вучоны ў вобласці фізіялогіі, доктар медыцынскіх навук, выдатнік аховы здароўя і выдатнік адукацыі Беларусі, працаваў у Віцебскім медыцынскім універсітэце, рэктарам Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава (2009–2013), ураджэнец г. Віцебска.

**8 кастрычніка** – 180 гадоў таму (1845) нарадзіўся Кірпічоў Віктар Львовіч (1845–1913), ваенны вучоны, інжынер, тайны саветнік, прафесар, ураджэнец г. Полацка. Скончыў Полацкі кадэцкі корпус.

**8 кастрычніка** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Азін Уладзімір Марцінавіч (1895–1920), ваенны дзеяч, удзельнік грамадзянскай вайны, ураджэнец в. Мар'янава Полацкага павета Віцебскай губерні (цяпер у Полацкім раёне).

**10 кастрычніка** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Матвяйчук Уладзімір Фёдаравіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, ураджэнец г. п. Шуміліна. У 2005–2009 гг. – міністр культуры Рэспублікі Беларусь.

# Кастрычнік

95 гадоў таму (1930) заснаваны Полацкі леспрамгас. Зараз – ААТ «Полацклес», філіял ААТ «Мастоўдрэў».

40 гадоў таму (1985) заснавана Віцебская абласная спартыўная ДЮШ алімпійскага рэзерву прафсаюзаў па зімніх відах спорту «Алімпіец».

**1 кастрычніка** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Хмялеўскі Мікалай Рыгоравіч (1900–1980), генерал-лейтэнант авіяцыі, удзельнік грамадзянскай, Вялікай Айчыннай войнаў. Ураджэнец в. Бароўка Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Верхнядзвінскім раёне).

**1 кастрычніка** – 100 гадоў таму (1925) пачала выходзіць газета «Камуністычны шлях» у г. Оршы. Зараз «Аршанская газета».

**1 кастрычніка** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Гарачаў Іван Іванавіч (1935–2023), беларускі вучоны ў галіне заатэхнікі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. З 2009 г. працаваў у Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Ураджэнец г. Горкі (цяпер г. Ніжні Ноўгарад, Расія).

**1 кастрычніка** – 80 гадоў таму (1945) заснаваны Дубровенскі дзяржаўны прафесійны ліцэй сельскагаспадарчай вытворчасці, як школа механізацыі сельскай гаспадаркі ў в. Бабінічы Аршанскага раёна. У 1963 г. школа пераведзена ў г. Дуброўна, а праз год перайменавана ў СПТВ № 35. З 1 верасня 1984 года – перайменавана ў Дубровенскае СПТВ № 171. З 14 жніўня 2002 г. – сучасная назва.



**22 ліпеня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Акулёнак Пётр Сяргеевіч (1910–1996), танцоўшчык, балетмайстар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ураджэнец в. Вялікія Міхінічы Аршанскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Талачынскім раёне).

**25 ліпеня** – 185 гадоў таму (1840) нарадзіўся Крачкоўскі Юльян Фаміч (1840–1903), беларускі фалькларыст, этнограф, гісторык, педагог, ураджэнец в. Азяты Брэсцкай вобласці. Працаваў дырэктарам Полацкай настаўніцкай семінарыі.

**25 ліпеня** – 60 гадоў таму (1965) нарадзілась Круглікава Марына Леанідаўна, беларуская мастачка, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнка г. Полацка.

**26 ліпеня** – 150 гадоў таму (1875) нарадзіўся Алонаў Яўген Піліпавіч (1875–1929), ветэрынарны ўрач, грамадскі дзеяч, Герой Працы (1924), адзін з арганізатараў ветэрынарнай справы ў Беларусі, заснавальнік і першы рэктар Віцебскага ветэрынарнага інстытута, ураджэнец г. Віцебска.

**26 ліпеня** – 95 гадоў таму (1930) ліквідавана Віцебская акруга, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў БССР.

**26 ліпеня** – 95 гадоў таму (1930) ліквідавана Аршанская акруга, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР у 1924–1930 гг.

**27 ліпеня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Казакоў Юрый Леанідавіч, гісторык, кандыдат гістарычных навук, з 1975 года працуе на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ураджэнец г. п. Шуміліна.

**27 ліпеня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Красаў Сяргей Андрэевіч, юрыст, пісьменнік. Ураджэнец г. Сафонава Смаленскай вобласці, жыве ў г. Віцебску.

**28 ліпеня** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Хесін Барыс Якаўлевіч, мастак, ураджэнец в. Сафронава Горкаўскай вобласці (Расія). Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава. У 1967–2001 г.г. жыў у Віцебску. Зараз жыве і працуе ў Хальберштад (Германія).

**29 ліпеня** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Каралёў Павел Міхайлавіч (1915–1998), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Крыцкія Полацкага павета Віцебскай губерні (цяпер у Гарадоцкім раёне).

**30 ліпеня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Няклюдаў Валянцін Леанідавіч (1910–1979), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай і Вілейскай абласцях, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Омска (Расія).

## Жнівень

105 гадоў таму (1920) быў створаны Чашніцкі раённы аддзел унутраных спраў.

**3 жніўня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Томка Ягор Андрэевіч (1935–2008), віцэ-адмірал, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец хутара Лявонаўцы Віленскага ваяводства, Польшча (цяпер у Мёрскім раёне).

**4 жніўня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Ясьвін Яўген Станіслававіч (1935–2000), беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў, ураджэнец г. п. Асвея Верхнядзвінскага раёна.



**29 верасня** – 145 гадоў таму (1880) нарадзіўся Сахараў Сяргей Пятровіч (1880–1954), беларускі фалькларыст, этнограф, педагог, ураджэнец г. Полацка.

**29 верасня** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Арлоў Аляксандр Рыгоравіч (1900–1945), інжынер-віцэ-адмірал, савецкі ваенна-марскі дзеяч. Ураджэнец г. Оршы.

**29 верасня** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Раманаў Павел Мінаевіч (1905–1944), Герой Савецкага Саюза, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец г. Чыта (Расія).

**29 верасня** – 95 гадоў таму (1930) нарадзіўся Шыбека Іван Арцем`евіч (1930–2005), партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, ураджэнец в. Стэцава Сенненскага раёна. У 1977–1984 гг. старшыня Віцебскага аблвыканкама.

**29 верасня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Давыдзька Генадзь Браніслававіч, беларускі грамадскі дзеяч, акцёр, рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі, ураджэнец г. Сянно.

**30 верасня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Бычкоўскі Міхаіл Аляксандравіч, беларускі кераміст, член Беларускага саюза мастакоў. З 1984 г. – у віцебскім аб'яднанні «Кераміка», з 1987 г. – мастак-кераміст, дызайнер ААТ «Віцебскгандальбуд», ураджэнец в. Стахава Брэсцкай вобласці.

**21 верасня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Ялугін Павел Уладзіміравіч (1910–1990), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Янова Лепельскага раёна.

**22 верасня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Броўкін Вячаслаў Уладзіміравіч (1925–2016), беларускі рэжысёр, ураджэнец г. Масквы. У 1955–1959 гг. з'яўляўся рэжысёрам Беларускага тэатра імя Я. Коласа.

**24 верасня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Харамоненка Сяргей Сільвестравіч (1910–1978), вучоны ў галіне біяхіміі і гематалогіі, выдатнік аховы здароўя, ураджэнец г. Віцебска.

**25 верасня** – 95 гадоў таму (1930) нарадзілася Ігнатава Марыя Якаўлеўна (1930–2001), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнка в. Паловікі Лёзненскага раёна.

**25 верасня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Шыбека Канстанцін Канстанцінавіч, беларускі навуковец-эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар, у 2016–2021 гг. – рэктар Палесскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ураджэнец в. Немерава Аршанскага раёна.

**25 верасня** – 50 гадоў таму (1975) заснаваны Інстытут тэхнічнай акустыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў г. Віцебску як Віцебскае аддзяленне Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, з 1994 г. – сучасная назва.

**26 верасня** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Крумінь (Крумін) Іван Андрэевіч (1915–2003), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Гарадка.

**27 верасня** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Чысцякоў Іван Міхайлавіч (1900–1979), савецкі военачальнік, генерал-палкоўнік, Герой Савецкага Саюза. 3 сакавіка 1967 г. – прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Полацка».



**4 жніўня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Слепаў Аляксандр Мікалаевіч, беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец с. Бада Чыцінскай вобласці, Расія. З 1962 г. жыве ў г. Віцебску.

**6 жніўня** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Гарфункін Рыгор Саламонавіч (1920–1943), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. п. Янавічы Віцебскага раёна.

**6 жніўня** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Хамчаноўскі Уладзімір Антонавіч (1920–1942), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Пірагі Расонскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну са жніўня 1941 г. быў камандзірам падпольнай групы Расонскага патрыятычнага падполля, з красавіка 1942 г. быў у партызанах.

**7 жніўня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Цітовіч Генадзь Іванавіч (1910–1986), беларускі этнамузыказнаўца, дзеяч харавога мастацтва, дырыжор, народны артыст Беларусі, народны артыст СССР, ураджэнец в. Новы Пагост Дзісенскага павета Віленскай губерні (цяпер у Мёрскім раёне).

**7 жніўня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Сухамлінаў Генадзь Уладзіміравіч, мастак, член Беларускага саюза мастакоў, педагог, ураджэнец г. Віцебска.

**10 жніўня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Шут Кліменцій Пятровіч (1925–1969), беларускі археолаг, ураджэнец Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. Даследаваў гарадзішчы ва Ушацкім, Лепельскім, Верхнядзвінскім, Гарадоцкім раёнах.

**10 жніўня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзіўся Гарбачоў Мікалай Мікалаевіч, пісьменнік, журналіст. Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама (2018). Ураджэнец г. Лепеля.

**10 жніўня** – 30 гадоў таму (1995) заснаваны Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры» ў Браслаўскім раёне.

**11 жніўня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Кастагрыз Алег Даніілавіч, беларускі графік і жывапісец, ураджэнец г. Кабулеці (Грузія). З 1989 г. выкладае ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава.

**12 жніўня** – 95 гадоў таму (1930) нарадзіўся Шарстнёў Мікалай Яфрэмавіч (1930–2004), Герой Сацыялістычнай Працы, механізатар-бульбавод калгаса імя Куйбышава Аршанскага раёна, ураджэнец в. Прыгузкі Аршанскага раёна.

**14 жніўня** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Цюрын Аляксандр Васілевіч (1905–1943), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Дзевушыха Іванаўскай вобласці (Расія).

**17 жніўня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Нікіцевіч Васіль Міхайлавіч (1925–1994), беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар. Ураджэнец в. Тураўшчына Бягомльскага раёна Мінскай вобласці (цяпер у Докшыцкім раёне).

**19 жніўня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Жаўрук Алесь (Сінічкін Аляксандр Дзмітрыевіч; 1910–1942), беларускі паэт, ураджэнец г. Сянно.

**20 жніўня** – 110 гадоў таму (1915) нарадзіўся Жылін Васіль Іванавіч (1915–1947), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Верхнія Белазёркі Самарскай губерні (Расія).

**24 жніўня** – 80 гадоў таму (1945) нарадзілася Ніканчык Святлана Уладзіміраўна (па мужу Баравік), беларуская актрыса, ураджэнка г. Оршы.

**25 жніўня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Корбан Уладзімір Іванавіч (1910–1971), беларускі пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, ураджэнец в. Барань Аршанскага павета Магілёўскай губерні (цяпер г. Барань Аршанскага раёна).



**12 верасня** – 295 гадоў таму (1730) нарадзіўся Сапега Аляксандр Міхал (Сапега Аляксандр Міхал; 1730–1793), абозны з найбуйнейшага магнацкага роду герба «Ліс» у ВКЛ, генерал-маёр, ваявода полацкі, гетман польны, канцлер.

**12 верасня** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Стадольнік Іван Канстанцінавіч (1940–2021), празаік, паэт, драматург, ураджэнец в. Янкі Докшыцкага раёна.

**14 верасня** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Пазняк Вадзім Нікіфаравіч (1920–1997), грамадскі і дзяржаўны дзеяч, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Слабодка Бешанковіцкага раёна.

**14 верасня** – 70 гадоў таму (1955) нарадзілася Кавальчук Людміла Мікалаеўна, беларуская мастачка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ураджэнка г. Ангарск (Расія). З 1977 г. жыве ў г. Віцебску

**14 верасня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзілася Пахомчык Алена Уладзіміраўна, майстар мастацкай апрацоўкі скуры, займаецца таксама вышыўкай, вязаннем, макрамэ, ураджэнка г. Паставы.

**16 верасня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Мяцельскі Андрэй Анатолевіч, беларускі археолаг, гісторык, доктар гістарычных навук. Ураджэнец г. Котбус (Германія). Праводзіў раскопкі на гарадзішчы каля в. Карабанавічы Дубровенскага раёна.

**21 верасня** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Рахцеенка Іван Навумавіч (1905–1988), беларускі навуковец у галіне батанікі, экалогіі і лесаводства, доктар біялагічных навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі БССР. Ураджэнец в. Шэкі Аршанскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Дубровенскім раёне).

**7 верасня** – 35 гадоў таму (1990) адкрыўся Музей беларускага кнігадрукавання ў Полацку, які з'яўляецца філіялам Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**8 верасня** – 65 гадоў таму (1960) нарадзіўся Цімохаў Сяргей Аляксандравіч (1960–2012), мастак, член Беларускага саюза мастакоў. З 1986 г. на віцебскім камбінаце «Мастацтва», з 1989 г. галоўны мастак г. Полацка, у 1991–2000 гг. дырэктар, мастак галерэі «Рыса» ў Полацку. Ураджэнец в. Кротаў Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

**9 верасня** – 140 гадоў таму (1885) нарадзіўся Салоха Акім Несцеравіч (1885–1978), педагог, дырэктар Віцебскага мастацка-графічнага педагагічнага вучылішча, заслужаны настаўнік БССР, ганаровы грамадзянін г. Віцебска. Ураджэнец в. Свіціна Лепельскага павета (цяпер у Бешанковіцкім раёне).

**10 верасня** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Дзягілеў Леанід Яўсеевіч, мастак-графік, мастацтвазнаўца, дызайнер, педагог. Член Беларускага саюза дызайнераў і Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец ст. Сасноўка Віцебскага раёна.

**11 верасня** – 170 гадоў таму (1855) нарадзіўся Раманаў Еўдакім Раманавіч (1855–1922), беларускі археолаг, фалькларыст, этнограф, краязнаўца, педагог, ураджэнец мястэчка Нова-Беліца (зараз у межах г. Гомеля). Працаваў настаўнікам у Сянно, інспектарам вучылішчаў Віцебскай губерні.

**11 верасня** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Сяменікаў Іван Фёдаравіч (1905–1985), дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Зах. Беларусі, ураджэнец г. Віцебска. З 1922 г. працаваў у паравозных майстэрнях Віцебска.

**11 верасня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Кандрацьеў Іван Дзмітрыевіч (1910–1958), удзельнік Вялікай Айчынай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Гарошкава Горацкага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Дубровенскім раёне).



**25 жніўня** – 80 гадоў таму (1945) нарадзіўся Слюнчанка Валерый Рыгоравіч (1945–1992), архітэктар, лаўрэат прэміі прафсаюзаў БССР. Удзельнічаў у распрацоўцы праектаў рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры, сярод якіх Богаяўленскі і Сафійскі саборы ў Полацку.

**26 жніўня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзілася Чуманіхіна Марыя Якаўлеўна, генеральны дырэктар ВА «Даламіт» (1978–1992), заслужаны работнік прамысловасці БССР, ганаровы грамадзянін г. Віцебска. Ураджэнка с. Пагост Калужскай вобл., Расія.

**27 жніўня** – 140 гадоў таму (1885) нарадзіўся Векслер Іван Іванавіч (1885–1954), савецкі літаратуразнаўца, літаратурны крытык, педагог, доктар філалагічных навук, прафесар. Ураджэнец г. Віцебска.

**27 жніўня** – 105 гадоў таму (1920) нарадзіўся Слабада Аляксандр Іванавіч (1920–2022), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Сацыялістычнай Працы, ганаровы грамадзянін г. Любань, ганаровы грамадзянін Мінскай вобласці. Ураджэнец в. Дубровы Дрысенскага раёна (цяпер Верхнядзвінскі раён).

**29 жніўня** – 130 гадоў таму (1895) нарадзіўся Быхоўскі Абрам Ісаевіч (1895–1972), гаспадарчы дзеяч Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец г. Дуброўна.

**29 жніўня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзілася Рыжкова Ганна Паўлаўна (1925–1993), беларуская артыстка эстрады, заслужаная артыстка Беларусі,з 1945 г. працавала ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа, з 1949 г. у абласным Доме народнай творчасці, ураджэнка в. Войлева Сенненскага раёна.

**30 жніўня** – 120 гадоў таму (1905) нарадзіўся Сабалеўскі Аляксандр Пятровіч (1905–1988), Герой Савецкага Саюза (1940), судавы ўрач ледакола «Георгий Седов», ураджэнец г. Гарадка.

**30 жніўня** – 115 гадоў таму (1910) нарадзіўся Валчкоў Іван Мікітавіч (1910–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Пічаева Тамбоўскай губерні (Расія).

**31 жніўня** – 140 гадоў таму (1885) нарадзіўся Багдановіч Генадзь Васілевіч (1885–1937), беларускі грамадскі дзеяч, педагог, ураджэнец в. Мікалаёва (мяст. Луначарскае) Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер в. Луначарскае ў Верхнядзвінскім раёне).

## Верасень

95 гадоў таму (1930) пачала выдавацца газета «За калектывізацыю» ў Чашніцкім раёне. Зараз – раённая газета «Чырвоны прамень».

**1 верасня** – 125 гадоў таму (1900) была заснавана Віцебская льнопрадзільная фабрыка «Дзвіна» ў маёнтку Езагнёва (зараз у межах г. Віцебска). У 1947 г. на базе фабрыкі створаны дывановы камбінат (ААТ «Віцебскія дываны»).

**1 верасня** – 125 гадоў таму (1900) нарадзіўся Дзмітрачэнка Аляксандр Пятровіч (1900–1981), прафесар, савецкі вучоны ў галіне жывёлагадоўлі, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны дзеяч навукі РСФСР. Ураджэнец м. Ула Лепельскага павета Віцебскай губерні (цяпер аг. Ула Бешанковіцкага раёна).

**1 верасня** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Майсеенка Анатоль Фядосавіч (1940–2009), літаратуразнавец, паэт, ураджэнец в. Халалееўка Дубровенскага раёна.



**1 верасня** – 30 гадоў таму (1995) паводле рашэння Калегіі Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут пераўтвораны ў Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт.

**2 верасня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Смірноў Юрый Васілевіч (1925–1944), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Дзедушкава Іванава-Вазнясенскай губерні (цяпер Кастрамская вобласць, Расія), удзельнік вызвалення Беларусі. Вызваляў в. Шалашына Дубровенскага раёна, пахаваны ў г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна.

**2 верасня** – 100 гадоў таму (1925) нарадзіўся Маслакоў Анатоль Васілевіч (1925–1985), партыйны і гаспадарчы дзеяч Беларусі, ураджэнец в. Дуброўскае Шумілінскага раёна.

**3 верасня** – 20 гадоў таму (2005) быў адкрыты Полацкі прыродна-экалагічны музей у г. Полацку, філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**5 верасня** – 90 гадоў таму (1935) нарадзіўся Ляшонак Тамаш (сапраўднае Ляшонак Фама Васілевіч; 1935–2004), беларускі паэт, ураджэнец в. Загор'е Глыбоцкага раёна.

**5 верасня** – 75 гадоў таму (1950) нарадзіўся Залуцкі Іосіф Віктаравіч (1950–2018), беларускі вучоны ў вобласці анкалогіі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, выдатнік аховы здароўя, ураджэнец в. Мумішкі Пастаўскага раёна.

**6 верасня** – 85 гадоў таму (1940) нарадзіўся Плакхін Аркадзь Міронавіч, беларускі спартсмен (шашкі–64), міжнародны гросмайстар, заслужаны майстар спорту Беларусі, ураджэнец г. Полацка.

**7 верасня** – 140 гадоў таму (1885) нарадзіўся Сікора Іван Паўлавіч (1885–1966), беларускі садавод і селекцыянер, заслужаны аграном БССР. ураджэнец в. Алашкі Малыя Дзісенскага павета Віленскай губерні (цяпер у Шаркаўшчынскім раёне).